№ 46 (500) 15 сьнежня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Мілінкевіч: «Калі свабоду трэба заслужыць — беларусы яе заслужылі»

Што сказаў Мілінкевіч у прамове пры атрыманьні Сахараўскай прэміі ў Страсбургу. **Старонка 4.**

### Беларусь безь Беларусі

Гістарычныя праекты БТ і АНТ «Была краіна» і «Савецкая Беларусь» глядзеў Алесь Кудрыцкі. **Старонка 8.**

### Месяц бяз сонца

Зіма ніяк ня прыйдзе, разам зь ёю зацягнулася забойчая восеньская дэпрэсія. Сродкі ад дэпрэсіву падказвае доктар Ігар Сарокін. **Старонка 22.**

### Біскуп Кашкевіч рэзка крытыкуе ўлады

Ні разу за Лукашэнкі Касьцёл не выступаў з такой рашучай крытыкай уладаў. Ліст Кашкевіча канкрэтны і па стылі нагадвае пасланьні польскага кардынала Вышынскага, які ў сацыялістычнай Польшчы адстойваў незалежнасьць Касьцёлу. **Старонка 10.**

### Сярод будучых тэлезорак — дачка Зянона Пазьняка

«ТВ Беларусь» скончае падрыхтоўку рэпартэраў. **Старонка 7.**

### Казулін не дарэмна галадаў

ЗША прапанавалі беларускае пытаньне на разгляд Рады Бясьпекі ААН. Расейскі пасол у адказ пакінуў залю. **Старонка 6.**

### Даніла Жукоўскі: Балючае пытаньне элітарнасьці

Прамова на ўручэньні прэміі часопісу «ARCHE». **Старонка 21.**

## Расея больш не налівае




**Перад паседжаньнем дзяржрады саюзнай дзяржавы Беларусі і Расеі, якое пройдзе 15 сьнежня ў Маскве, Расея абвесьціла пра ўвядзеньне мытаў на пастаўку нафты ў Беларусь. Дармовае паліва скончаецца 1 студзеня. Страты беларускага бюджэту складуць 1,7—2 мільярды даляраў. Раманчук: Беларусь чакае інфляцыя. Старонка 3.**

# у нумары




## люстра дзён

Мілінкевіч у Эўрапарлямэнце: Калі свабоду трэба заслужыць — беларусы яе заслужылі ........ 5

Казулін не дарэмна галадаў ........ 6

Сярод будучых тэлезорак — дачка Зянона Пазьняка ........ 7

Героі Плошчы сабраліся разам ........ 7

Біскуп Кашкевіч крытыкуе ўлады ........ 10

Кагэбіст лібэральны ........ 11

Аб усім патроху ........ 16

## камэнтары

Віталь Тарас. Голад і галадоўнікі ........ 12

«У кожнай краіны свой асьпірын» ........ 14

Павал Севярынец. Доўгая дарога да храму ........ 18

Даніла Жукоўскі. Балючае пытаньне элітарнасьці ........ 21

Дэпрэсіі распаўсюджаныя на поўначы ........ 22

Аляксандар Класкоўскі. Наступны мусіць памерці? ........ 24

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Мой адрас ня дом і ня вуліца... ........ 25

## наша страва

Зацірка ........ 40

## газэтка дзеткам

Джэці. Бу–бу–бу! 42


РЭДАКЦЫЙНЫ ЗВАРОТ

## 8000 на месяц

Просім да 30 сьнежня пералічыць ахвяраваньне на выхад газэты ў першым квартале 2007 году.

Гэты год багаты на круглыя лічбы. 125 гадоў заснавальніку «Нашай Нівы» Івану Луцкевічу, 100 гадоў самой газэце. Нумар, які Вы трымаеце ў руках — таксама юбілейны. Рэдакцыя зьвяртаецца да Вас, дарагія чытачы, з словамі ўдзячнасьці: дзякуючы Вам, «Наша Ніва» дайшла да паўтысячнага нумару.

Роўна год таму было прынята рашэньне: з студзеня 2006 выдавацца ў малым фармаце. Такім, як за царом. На гэтую сымбалічную зьмену фармату Рэдакцыя пайшла ў знак пратэсту супраць немагчымасьці распаўсюджвацца. І хоць дзяржаўны ідэалягічны апарат працаваў на здушэньне «НН», газэта жыве.

Аднак «Белпошта» і «Белсаюздрук» па-ранейшаму адмаўляюцца распаўсюджваць яе. Гэта значыць, мы па-ранейшаму маем патрэбу ў Вашых ахвяраваньнях. Просім кожную сям'ю нашых чытачоў да 30 сьнежня пераказаць нам ахвяраваньні на выхад газэты. Хто ахвяруе 8000 рублёў, той забясьпечыць выхад газэта на месяц. Хто дашле 24 000, той гарантуе наш друк на квартал. Хто 48 000 – той ахвяруе на паўгоду. Банкаўскія рэквізыты вы знойдзеце на **старонцы 46**. Пераказы можна рабіць праз «Беларусбанк» і паштовымі пераводамі. Толькі не забывайцеся пазначаць у блянку: ахвяраваньні. Карацей, у тэхнічным сэнсе нічога не мяняецца. Затое ў творчым – мяняецца. Праз месяц зьявяцца першыя кніжкі з пазнакай «Кнігарня «НН» — юбілейная сэрыя да 100-годзьдзя газэты. Далей будзе ўдасканальвацца інтэрнэт-сайт.

Нічога гэтага не было б бяз вашых ахвяраваньняў.

КАМЭНТАР

## Нафтавы канец. Але чаго канец?

Няможна быць Ататуркам і Вячаславам Францавічам Кебічам адначасова.

Апошнія дзесяць гадоў Беларусь атрымлівала танныя нафту й газ узамен за васальную вернасьць Маскве і, калі ўжыць мэтафару філёзафа Валера Булгакава, «продаж нацыянальнага гонару», г.зн. добраахвотную русіфікацыю. Нібыта добраахвотную. Цяпер ранейшай схеме прыходзіць канец. Масква пачынае лічыць кожную капейку. Гэта вытлумачальна: у той дэмаграфічнай і культурнай сытуацыі, у якой апынулася Расея, кожны згублены рубель можа азначаць страту шанцу ўратаваць фэдэрацыю ад развалу.

Але як адрэагуе на сытуацыю беларускае кіраўніцтва?

Канец лафы можа стаць канцом мытнага саюзу, саюзнай дзяржавы, а пасьля і вайсковага саюзу.

А можа прывесьці да новых капітуляцыяў: здачы «Белтрансгазу», стварэньня парлямэнту саюзнай дзяржавы. Карацей, да паўтору рэакцый на эканамічны крызіс 90-х, калі гаспадарчая і сілавая эліта ня бачыла іншага выйсьця, як прадацца Расеі. Паколькі культурны сувэрэнітэт ужо растрыньканы, маем яшчэ ў кішэні палітычны і эканамічны. А гэта можа быць фатальна для незалежнасьці.

Тым больш, што і ў першым, і ў другім сцэнары нас чакае канец сацыяльнай стабільнасьці. Заможная Беларусь патрэбная Крамлю гэтаксама, як заможная Мардва.

Беларусы моцна ганарыліся эканамічным ростам, заробленым цаной продажу ўласнага гонару. Плітачкай, газонамі і палацамі. Спыненьне нафтагазавых датацый праверыць беларускую эліту на сьпеласьць. Або вы будуеце нацыю, або думаеце, як утрымацца на пасадзе. Няможна быць Ататуркам і Вячаславам Францавічам Кебічам адначасова. Трэці сцэнар няможна разыгрываць вечна.

**Барыс Тумар**

# Масква ўжыла нафтавую бомбу

Дармовай нафты ня будзе з 1 студзеня. Беларусь чакае інфляцыя і іншыя заразныя хваробы эканомікі, якія краіны Ўсходняй Эўропы перанесьлі ў 90-я.


PHOTO.KOMMERSANT.RU

**Вайна паміж саюзьнікамі набывае пэрманэнтны характар.**

Расея такі ўводзіць мыта на экспарт нафты ў Беларусь. Гэта рэакцыя Масквы на нежаданьне Менску дзяліцца даходамі ад рээкспарту расейскай нафты. Ад 1 сьнежня экспартнае мыта на расейскую нафту складае 180 даляраў за тону. Ад 1 студзеня гэта пачне распаўсюджвацца на Беларусь. У сярэднім адзін барэль расейскай нафты падаражэе для Беларусі на 25 даляраў. Іншыя краіны Цэнтральнай Эўропы даўно прыстасаваліся да сусьветных цэнаў на нафту й газ, але для эканамічнай сыстэмы, выбудаванай Лукашэнкам, спыненьне расейскіх датацыяў можа мець непрадказальныя наступствы.

Рашэньне пра ўвядзеньне экспартнага мыта пры пастаўках нафты ў Беларусь падпісаў расейскі прэм’ер Міхаіл Фрадкоў.

Сваё рашэньне расейскі бок тлумачыць тым, што Беларусь разарвала міжурадавае пагадненьне, згодна зь якім 85% мыты на экспарт, у прыватнасьці, нафтапрадуктаў, зробленых у Беларусі з расейскай сыравіны, мусілі залічацца ў расейскі бюджэт, і толькі 15% — у беларускі.

На думку расейскага боку, Менск фактычна прысабечвае значную частку даходаў ад рээкспарту расейскай нафты, якая паступае ў Беларусь бяз мыта і прадаецца за мяжу па сусьветных цэнах.

Розьніца ў правілах, паводле словаў міністра прамысловасьці і энэргетыкі Расеі Віктара Хрысьценкі, ператварыла Беларусь у своеасаблівы нафтавы афшор. «Як толькі адхіленьне ад гэтага рэжыму адбылося, усе кампаніі пачалі расьпіхваць адна адную лакцямі й імкнуцца ў гэты афшор, каб унікнуць збыткоўнага падаткаабкладаньня ў Расеі», — казаў Хрысьценка на прэс-канфэрэнцыі ў аўторак.

Паводле словаў расейскага пасла ў Беларусі, Менску прапаноўвалі два варыянты ўрэгуляваньня. Альбо захаваць экспарт у Эўропу, але пры гэтым усталяваць адзіныя экспартныя мыты, якія б дзяліліся ў суадносінах 85% — Расеі і 15% — Беларусі. Альбо ўсе сьветлыя прадукты, якія выпрабляюцца ў Беларусі, за выняткам унутранага спажываньня, перадаць Расеі.

Відаць па ўсім, Менск адхіліў абодва варыянты. Рэакцыя Масквы была імклівай. Увядзеньне мытаў значыць рэзкае павышэньне цэнаў для Беларусі на 30—40%.

Беларускія ўлады, здаецца, прадбачылі такое разьвіцьцё падзеяў. За апошнія два тыдні цана на паліва ўзрастала двойчы. Бэнзын 95-й маркі дасягнуў сымбалічнай плянкі 2000 рублёў за літар. Гэта вывела беларускае паліва ў найдаражэйшае ў рэгіёне.

Магчыма, з сытуацыяй у гандлі з Расеяй зьвязаны й перанос заплянаванага візыту А.Лукашэнкі ў Віетнам: прыходзіцца напружана рыхтавацца да сустрэчы 15 сьнежня з прэзыдэнтам Пуціным. Яна адбудзецца на паседжаньні так званае вышэйшае дзяржрады саюзнай дзяржавы.

Паводле ацэнак эканамістаў з Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту, беларуская эканоміка здольная вытрымаць павышэньне цэнаў на нафту безь зьніжэньня ВУП, калі будуць неадкладна прынятыя меры па павышэньні энэргаэфэктыўнасьці эканомікі. Аднак калі рост цэнаў на нафту перакрыецца скачком цэнаў на газ, можа адбыцца нават падзеньне валавога ўнутранага прадукту.

Экспарт нафтапрадуктаў на сёньня складае 41% ад агульнага аб’ёму беларускага экспарту, у тым ліку больш за дзьве трэціны беларускага экспарту ў краіны Эўрасаюзу. Ад экспарту нафтапрадуктаў Беларусь за год мела атрымаць каля $7,5 млрд.

Яшчэ больш драматычныя прагнозы зрабіў у інтэрвію інтэрнэт-газэце naviny.by кіраўнік навукова-дасьледчага цэнтру Мізэса Яраслаў Раманчук. На ягоную думку, рашэньне Расеі адмяніць ільготныя для Беларусі схемы паставак нафты пацягне за сабой 8-адсоткавы спад беларускага ВУП. Калі ж да нафтавых мытаў падключыцца яшчэ й 200-даляравая цана на газ, Беларусь страціць 15% ВУП, што па эканамічных наступствах для беларускіх прадпрыемстваў раўназначнае распаду Савецкага Саюзу. У выніку, прагназуе лібэральны эканаміст, наймагутнейшая напружанасьць стане ў беларускай эканоміцы выяўная ўжо да канца першага паўгодзьдзя 2007 году.

Адмена расейскіх нафтавых датацый прывядзе, найхутчэй што, да зьмены парамэтраў толькі што прынятага беларускага бюджэту на 2007 год. На думку Я.Раманчука, «беларускі рубель будзе пад такім ціскам, што пройдзе праз дэвальвацыю. Мы, спажыўцы, будзем вымушаныя зацягнуць паясы. Гэта просты сыгнал беларусам пра тое, што трэба жыць за свой кошт».

# «Мы яе заслужылі»

Мілінкевіч адмовіўся ад грашовай часткі прэміі.

12 сьнежня ў Страсбургу прайшла ўрачыстая цырымонія ўручэньня прэстыжнай узнагароды Эўрапарлямэнту — прэміі імя Андрэя Сахарава «За свабоду думкі». У другі раз за гісторыю існаваньня прэміі яна накіроўваецца ў Беларусь — у 2004 г. яе атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Прадстаўляючы Аляксандра Мілінкевіча ў часе цырымоніі, яго назвалі «лідэрам дэмакратычных сілаў, які змагаецца з апошняй дыктатурай Эўропы».

У сваім выступе Аляксандар Мілінкевіч прыгадаў падзеі сакавіка бягучага году ў Менску, назваўшы дзеяньні людзей на Плошчы адчайнай спробай вывесьці Беларусь з гістарычнага тупіку, куды яе завёў рэжым. Пры гэтым ён адзначыў, што ня бачыць для дэмакратычных сілаў у Беларусі іншага шляху, як працягваць змаганьне за дэмакратыю і свабоду.

Выступаючы Мілінкевіч адзначыў, што беларускі рэжым непрадказальны ў сваім жаданьні захавацца любымі сродкамі, у тым ліку і здачай суверэнітэту. Гарантыяй незалежнасьці Беларусі, на думку Мілінкевіча, можа быць толькі дэмакратыя, але ніяк не дыктатура.

Прапановы, якія зрабіла афіцыйнаму Менску ў мінулым месяцы Эўракамісія, «гэта знак салідарнасьці зь беларусамі і адначасова сыгнал Лукашэнку». Ён лічыць, што Эўропа шмат чым можа дапамагчы Беларусі і найперш — прарваць інфармацыйную блякаду. «Першыя крокі ў гэтым кірунку зробленыя», — заўважыў Мілінкевіч, кажучы пра стварэньне на тэрыторыі Польшчы незалежнага тэлеканалу для Беларусі.

А.Мілінкевіч, як і старшыня БАЖу Жанна Літвіна, ня лічыць прэмію асабістай заслугай: «Гэта прэмія і Казуліна, і Дашкевіча, і Севярынца, ды ўсіх іншых палітзьняволеных. Калі свабоду трэба заслужыць — мы яе заслужылі. Усёй сваёй гісторыяй і ахвярамі, прынесенымі дзеля яе».

Ад грашовай часткі прэміі Мілінкевіч адмовіўся, зазначыўшы, што Эўрапарлямэнт можа перадаць яе беларускім палітзьняволеным. Між тым у аўторак Міністэрства па падатках і зборах пасьпяшалася заявіць, што з гэтай сумы Мілінкевіч павінен заплаціць у бюджэт 13 тысячаў эўра.

Ляўрэат прэміі Сахарава быў вызначаны лідэрамі палітычных фракцыяў і старшынём Эўрапарлямэнту падчас сумеснага паседжаньня ў Страсбургу. Вылучэньне кандыдатуры Мілінкевіча падтрымала найбуйнейшая фракцыя Эўрапарлямэнту «Эўрапейская народная партыя — эўрапейскія дэмакраты».

Эўрапарлямэнтары мяркуюць, што прэмія Мілінкевічу ёсьць выразным знакам Лукашэнку, а таксама мае важнае значэньне для беларускай дэмакратыі і асабістай бясьпекі Мілінкевіча.

У Страсбург разам зь Мілінкевічам на цырымонію езьдзілі ягоная жонка Іна Кулей, старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка ды палітоляг Андрэй Фёдараў. Меліся ехаць жонка Аляксандра Казуліна Ірына ды старшыня непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў Анжаліка Борыс.



Першая адмовілася ад паездкі паводле стану здароўя, у спн.Анжалікі ў часе апошняга допыту ў КДБ забралі пашпарт.

Урачыстая працэдура ўзнагароджаньня распачалася сустрэчай з прэзыдэнтам Эўрапарлямэнту Хасэпам Барэлем, а таксама з парлямэнцкай групай, адказнай за адносіны зь Беларусьсю. Пасьля атрыманьня ўзнагароды Аляксандар Мілінкевіч выступіў з 30-хвіліннай прамовай на сваёй роднай мове.

Па завяршэньні ўрачыстай часткі заплянаваная сумесная з прэзыдэнтам Эўрапарлямэнту прэс-канфэрэнцыя для сусьветных СМІ.

**Сямён Печанко**

**Прэмію імя Сахарава**

заснаваў Эўрапарлямэнт у 1988 і прысуджае штогод за «дасягненьні ў справе абароны правоў чалавека і яго асноўных свабодаў, а таксама за павагу да міжнароднага заканадаўства й разьвіцьцё дэмакратыі». Намінантаў вылучаюць дэпутацкія фракцыі Эўрапарлямэнту або група дэпутатаў, якая павінна сабраць у падтрымку свайго кандыдата ня меней за 25 подпісаў. Першым ляўрэатам прэміі (1988) быў Нэльсан Мандэла. Памер прэміі на сёньня складае 50 тысяч эўра.

**Страйк тэхпэрсаналу Эўрапарлямэнту сарваў трансьляцыю цырымоніі на «Euronews»**

Расейскамоўная служба тэлеканалу «Euronews» не паказала ў жывым этэры, як плянавалася, цырымонію ўручэньня лідэру дэмакратычных сілаў Беларусі прэміі імя Сахарава. У 13.30 дыктары тэлеканалу паведамілі, што «жывая трансьляцыя не адбылася праз забастоўку тэхнічнага пэрсаналу парлямэнту». Прычыну забастоўкі «Euronews» не паведаміў.

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Як мусіў распарадзіцца прэміяй імя Сахарава Аляксандар Мілінкевіч?**

| | |
|---|---|
| Пакінуць сабе на жыцьцё, каб свабодна займацца палітыкай і ня мець патрэбы ў спонсарах. | 27 (19.7%) |
| На дапамогу рэпрэсаваным і сем'ям палітвязьняў. | 38 (27.7%) |
| На выданьне беларускіх кніг і музыкі. | 22 (16.1%) |
| На ўсталяваньне помніка Вітаўту Вялікаму ў Горадні. | 8 (5.8%) |
| На дзейнасьць Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. | 9 (6.6%) |
| Ахвяраваць незалежным СМІ. | 11 (8.0%) |
| Аддаць на дзяцей-сіротаў. | 10 (7.3%) |
| Здаць у Камітэт па гуманітарнай дапамозе пры прэзыдэнту і пакаяцца. | 12 (8.8%) |

Усяго прагаласавала: 137

# Мілінкевіч у Эўрапарлямэнце: Калі свабоду трэба заслужыць – беларусы яе заслужылі

Што сказаў **Мілінкевіч** у сваёй прамове ў Страсбургу.

Пасьля цырымоніі ўручэньня прэміі імя Сахарава Аляксандар Мілінкевіч выступіў перад дэпутатамі Эўрапейскага парлямэнту. Аляксандр Мілінкевіч прамаўляў па-беларуску і найперш падзякаваў дэпутатам.

— Разам са мной гэтую ўзнагароду атрымліваюць усе беларусы, якія ў сакавіку стаялі на Плошчы, сядзелі ў турмах, якія выключаныя з унівэрсытэтаў і выгнаныя з працы... Мы — людзі, якія хочуць, каб Беларусь стала дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавай, і гатовыя дзеля гэтага ахвяраваць асабістым дабрабытам, свабодай, урэшце жыцьцём, — сказаў Мілінкевіч.

Ён закрануў у выступе тэмы зьніклых палітыкаў і сёньняшніх палітзьняволеных.

— Гэта прэмія і Аляксандра Казуліна, таксама як і Зьмітра Дашкевіча, і Паўла Севярынца, і Міколы Статкевіча, і Андрэя Клімава, ды ўсіх іншых палітвязьняў. Гэтая прэмія — знак неабыякавасьці Эўропы да сытуацыі ў Беларусі. Гэтая прэмія — прыклад маральнай палітыкі. Гэтая прэмія — сімвал прызнаньня эўрапейскай будучыні Беларусі.

— Калі свабоду трэба заслужыць — мы яе заслужылі. Усёй сваёй гісторыяй і ахвярамі, прынесенымі дзеля яе.

У сваім выступе Мілінкевіч вярнуўся да падзеяў сакавіка бягучага году:

— Рэжым завёў Беларусь у гістарычны тупік. І нашыя акцыі на Плошчы былі адчайнай спробай вывесці Беларусь з гэтага тупіка. Мы выйшлі не па кавалак хлеба, а па маральныя каштоўнасьці — свабоду і праўду. Калі б вы змаглі быць з намі, вы б адчулі захапленьне і натхненьне, пачуцьце свабоды і адсутнасьць страху. Таксама як боль і адчай пасьля таго, як зьмерзлых і стомленых маладых людзей тады проста закінулі ў грузавікі і адвезьлі ў турму, — сказаў Аляксандар Мілінкевіч.

Мілінкевіч адзначыў, што ня бачыць для дэмакратычных сілаў у Беларусі іншага шляху, як працягваць змаганьне за дэмакратыю і свабоду ў краіне:

— Наш народ прайшоў праз гвалтоўную дэнацыяналізацыю, ампутацыю гістарычнай памяці. У 1991 годзе мы цешыліся, стаўшы ўрэшце незалежнымі. І не адразу зразумелі, што незалежнасьць і свабода — не адно і тое ж. Сёньня мы зноў змагаемся за свабоду і адстойваем незалежнасьць. Робім гэта ня толькі дзеля сябе — у першую чаргу дзеля нашых дзяцей, якія, як і францускія, літоўскія, польскія, брытанскія дзеці, маюць права жыць у свабоднай краіне. Выбар ёсьць. Надта просты: здацца рэжыму і адмовіцца ад уласнага «я» дзеля адноснага дабрабыту, альбо — сьвядома абраць змаганне за свабоду і ахвяраваць гэтым дабрабытам. У нас няма іншага шляху, акрамя змаганьня і перамогі — мы павінны перамагчы дзеля нашых дзяцей.

Аляксандар Мілінкевіч звярнуў увагу эўрадэпутатаў на ўсё яшчэ актуальную небясьпеку правядзеньня ў Беларусі «рэфэрэндуму пра ўзьяднаньне з Расеяй» і заклікаў Эўропу «засьцерагчы Расею ад такога мерапрыемства»:

— Мы бачым чарговае пацьверджаньне невясёлай прымаўкі, што дармовы газ бывае толькі ў газавай камэры. Сярод галоўных умоваў рахунку, выстаўленага Масквой Лукашэнку за доўгую палітычную і эканамічную падтрымку — пераход на адзіную (а фактычна расейскую) валюту і прыняцьце канстытуцыйнага акту так званай «саюзнай дзяржавы» ў расейскай рэдакцыі... Такому варыянту разьвіцьця падзей пакуль што супрацьіўляюцца і беларускія палітычныя вярхі. Яны выдатна ўсьведамляюць, што з стратай незалежнасьці і прыходам да нас расейскага капіталу мала хто зь іх захавае і свае пасады, і свае матэрыяльныя здабыткі. І ўсё ж нельга выключыць, што, кіруючыся інстынктам самазахаваньня, улада пойдзе на вышэйзгаданыя ўмовы, для апраўданьня чаго будзе праведзены адпаведны рэфэрэндум. Гарантыяй незалежнасьці Беларусі можа быць толькі дэмакратыя, а ніяк не дыктатура, — сказаў Мілінкевіч.

Кажучы пра пэрспэктывы беларуска-расейскіх дачыненьняў, Мілінкевіч адзначыў:

— Мы жадаем жыць у сувэрэннай дзяржаве, але будаваць з Расеяй самыя лепшыя адносіны. Расея для нас, як і для Эўрасаюзу, заўсёды будзе стратэгічным партнёрам, а дэмакратычная Беларусь для Расеі — надзейным і прадказальным сябрам... Спадзяемся, што рэалізм у Расеі калісьці ўсё ж возьме верх.

У выступе Мілінкевіч даў ацэнку санкцыям Эўрасаюзу ў дачыненьні да чыноўнікаў, уцягнутых у рэпрэсіі супраць грамадзянаў Беларусі:

— Я лічу, што забарона на ўезд у краіны Эўразвязу асобам, што парушаюць Канстытуцыю і маюць дачыненьне да рэпрэсіяў, мера вельмі эфэктыўная. Сьпіс такіх «змагароў супраць дэмакратыі» павінен пашырацца.

Адначасова Мілінкевіч заклікаў Эўрасаюз не падвышаць для грамадзянаў Беларусі цэны на шэнгенскія візы.

— Мяркуецца, што з пачатку новага году цэны візаў дасягнуць 60 эўра. Падобныя ўмовы на карысьць толькі Лукашэнку, які ўвесь час палохае беларусаў тым, што «на Захадзе нас ніхто не чакае», — сказаў Мілінкевіч.

Гаворачы аб прапановах, якія зрабіла афіцыйнаму Менску Эўракамісія (нармалізацыя адносінаў, адмова ад варажнечы і дэмакратызацыя ў абмен на адкрыцьцё рынку ЭЗ), Мілінкевіч адзначыў, што гэта «выдатная магчымасьць выйсьці зь міжнароднай самаізаляцыі і незайздроснага эканамічнага становішча, у якім апынуўся афіцыйны Менск».

— А самае галоўнае — у гэтым пасланьні гаворыцца пра месца нашай Беларусі ў Эўропе. Безь Беларусі Эўропа ня будзе поўнай. Таму, як калісьці мае продкі, якія ўдзельнічалі ў вызвольным паўстаньні Каліноўскага, мы паўтараем заклік «За вашу і нашу свабоду», — сказаў Мілінкевіч.

Мілінкевіч заклікаў Эўрасаюз падтрымаць праекты незалежнага тэлевяшчаньня на Беларусь:

— Добры прыкладам такой вельмі канкрэтнай дапамогі ёсьць незалежнае тэлебачаньне для Беларусі, што ствараецца пры падтрымцы польскага ўраду.

# Казулін не дарэмна галадаў

ЗША прапанавалі разгледзець беларускае пытаньне на Радзе бясьпекі ААН.

У Нью-Ёрку нечакана сарваўся чарговы раўнд кансультацый па пытаньні атамнай праграмы Ірану. На закрытым паседжаньні Рады Бясьпекі ААН прадстаўнік Злучаных Штатаў Уільям Брэнік прапанаваў разгледзець на паседжаньні Рады пытаньне аб галадоўцы былога кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі Аляксандра Казуліна і сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Аднак прадстаўнік Расеі Васіль Чуркін катэгарычна запярэчыў і пакінуў залю паседжаньняў. Пасол Кітаю ў ААН Ван Гуань патлумачыў журналістам: «Расейскі калега сказаў, што павінен атрымаць інструкцыі ад свайго ўраду ў справе сытуацыі ў Беларусі». Са словаў Чуркіна, пасьля нечаканае згадкі пра Беларусь перамовы па іранскім пытаньні не маглі пайсьці канструктыўна. У выніку плянаванае абмеркаваньне іранскай ядзернай праграмы было адкладзенае.

Варта адзначыць, што ініцыятыву ЗША падтрымалі дыпляматы некаторых іншых краінаў-сяброў ААН. Тады як пасол Чуркін заявіў, што гэтая праблема ня мае дачыненьня да справаў Рады бясьпекі ААН. Паводле Чуркіна, калі выносіць яе на Раду Бясьпекі, тады й любое пытаньне можна вынесьці, «нават пытаньне аб кукурузных шматках». «ЗША выбралі ня лепшы час для вынясеньня пытаньня», — гэтак зрэагаваў прадстаўнік Вялікай Брытаніі ў Радзе бясьпекі Эмір Джоўнз Пэры.

Як вядома, галадоўкай Аляксандар Казулін дамагаўся ад усіх дэмакратычных урадаў Эўропы і сьвету, генэральнага сакратара ААН, вынясеньня на разгляд Рады Бясьпекі ААН пытаньня аб Беларусі.

Радыё «Свабода» са спасылкаю на агенцтва Reuters цытуе амэрыканскага чыноўніка, які пажадаў захаваць ананімнасьць, паводле якога галадоўка Казуліна вынесла на першы плян сытуацыю з уціскам дэмакратыі ў Беларусі.

Варта адзначыць, што ў Радзе Бясьпекі ААН беларускае пытаньне загучала ўпершыню ў гісторыі. Раней Аляксандар Мілінкевіч зьвярнуўся да кіраўнікоў Расеі, ЗША, Францыі і Нямеччыны з просьбай ўратаваць жыцьцё Аляксандру Казуліну.

**Мікола Бугай**

## Казулін трымаў галадоўку 53 дні

12 сьнежня стала вядома, што экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін спыняе галадоўку пратэсту. Пра гэта экс-кандыдат паведаміў у троххвіліннай тэлефоннай гутарцы са сваёй жонкай Ірынай, якую перад гэтым папярэдзілі, што гутарка павінна быць датычная толькі галадоўкі.

Казулін папрасіў у жонкі, каб яна перадала яму ў калёнію некаторыя прадукты, неабходныя для выхаду з галадоўкі. Яму хочацца яблыкаўантонавак і вазон з кветкай.

Сустрэча з адвакатам Ігарам Рынкевічам перанесеная на пятніцу.

Цяпер Казулін ужывае ў ежу кісялі і сокі. Казулін паранейшаму адмаўляецца ад шпіталізацыі, кажучы, што яму хапае мэдычнай дапамогі і ў калёніі. Цяпер ён мае ціск 80/65, а тэмпэратура цела — 36,2. Вага Казуліна 62 кілаграмы, за час галадоўкі ён страціў 26 кг.

Ад 20 кастрычніка Аляксандар Казулін прагаладаў за кратамі 53 дні.

Асноўнымі ягонымі патрабаваньнямі былі: разгляд пытаньня правоў чалавека ў Беларусі Радай бясьпекі ААН; зварот палітычнай рады дэмакратычных сілаў да прэм’ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага, каб той узяў у свае рукі ўладу, бо знаходжаньне Лукашэнкі ва ўладзе, на думку Казуліна, нелегітымнае.

Казулін неаднаразова заяўляў, што будзе галадаць да той пары, пакуль ягоныя патрабаваньні ня будуць цалкам выкананыя. Але выйшла так, што беларускае пытаньне на паседжаньні Рады бясьпекі ААН было ўзьнятае пасьля таго, як ён скончыў галадаць. Трэба адзначыць, што сама працэдура ўзьняцьця таго ці іншага пытаньня на паседжаньнях ААН вельмі доўгая і няпростая, а Расея мае ў Радзе бясьпекі права вэта.

**ЗП**

**Голад і галадоўнікі.** Камэнтар Віталя Тараса. Старонка 12.

## 500 чалавек галадалі разам з Казуліным

8 сьнежня каля 500 чалавек па ўсёй Беларусі прынялі ўдзел у аднадзённай галадоўцы салідарнасьці з Аляксандрам Казуліным. А ў нядзелю, 10 сьнежня, на Кастрычніцкай плошчы Менску прайшла акцыя падтрымкі палітвязьняў. Каля ста чалавек трымалі ў сваіх руках партрэты Аляксандра Казуліна і Зьмітра Дашкевіча. Праваабаронцы зьявіліся на плошчы з транспарантам «Свабоду Казуліну». Праз дзесяць хвілінаў міліцыя пачала выцясьняць людзей за Палац рэспублікі. Было затрымана 24 асобы, але пратаколы склалі толькі на пяцёх. У панядзелак судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Аляксей Бычко прысудзіў да 15 сутак арышту моладзевых актывістаў Зьмітра Хведарука і Алега Корбана.

Таксама на гэтым тыдні Аляксандар Казулін стаўся адным зь ляўрэатаў прэміі «Хартыі’97» у абароне правоў чалавека за 2006 год.

**Зьміцер Панкавец**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Сярод будучых тэлезорак — дачка Зянона Пазьняка

11 сьнежня ў Варшаве скончыўся другі тур курсаў для журналістаў будучага незалежнага тэлебачаньня «TV Беларусь».

Два тыдні здольныя маладыя людзі зь Беларусі рабілі навіны і рэпартажы, займаліся здымкамі, мантажом і агучваньнем матэрыялаў. Настаўнікамі былі польскія журналісты зь інфармацыйнага тэлеканалу «TVN 24», апэратары й мантажысты.

Будучыя тэлевізійнікі адпрацавалі два тыдні па 14 гадзінаў у суткі ў часта неспрыяльных умовах — ніхто зь беларускіх стажораў добра ня ведаў Варшавы, ніхто спэцыяльна не вучыў перад тым польскую мову, а польскі бок часьцяком спэцыяльна не дапамагаў зь перакладам.

Удзельнікаў уразіў узровень шкаленьняў — інтэрвію беларускім журналістам даваў намесьнік міністра культуры Польшчы.

Галоўны прынцып тэлевізійнага адбору — выжывае мацнейшы, ня ўсе дойдуць да фіналу. У лютым працяг курсаў. Колькасьць удзельнікаў у іх зьменшыцца. Зь цікавостак можна адзначыць тое, што сярод супрацоўнікаў будучай тэлевізіі значыцца прыёмная дачка Зянона Пазьняка — Надзея. Яна хоча стаць дыктаркай.

Каардынуе праект знаная польская тэлежурналістка Агнешка Рамашэўская-Гузі. Яна паходзіць зь сям'і актывіста «Салідарнасьці», якую жорстка мучылі польскія камуністычныя ўлады. Яе таксама ведаюць як добрую арганізатарку й мэнэджэрку. Грошы на тэлебачаньне выдзеліў польскі ўрад.

Гісторык зь Беластоку Алег Латышонак мяркуе, што стварэньне незалежнага, праўдзіва беларускага тэлебачаньня будзе вялікім дасягненьнем нацыянальнага руху.

Варта адзначыць, што дагэтуль няма яснасьці, якім чынам тэлевізія зможа атрымліваць відэаматэрыялы зь Беларусі ў выпадку, калі беларуская адміністрацыя будзе таму перашкаджаць.

**Мікола Бугай; з выкарыстаньнем матэрыялаў радыё «Рацыя»**

# Героі Плошчы сабраліся разам

Праз хвіліну «АМАПаўцы» жорстка будуць выцягваць і зьбіваць удзельнікаў. Нехта крычыць: «Захапі журналіста!». «АМАПавец» вяртаецца ў залю і цягне за сабой яшчэ аднаго хлопца.

У зацемненай канфэрэнц-залі Ўправы БНФ чуюцца галасы Плошчы. У цэнтры залі — сымбалічны намёт, дзе людзі спрабуюць сагрэцца. Нехта выгукае: «Зараз сюды прыедзе АМАП!». Праз хвіліну «АМАПаўцы» жорстка будуць выцягваць і зьбіваць удзельнікаў стылізаванай Плошчы. Нехта крычыць: «Захапі журналіста!». «АМАПавец» вяртаецца ў залю і цягне за сабой яшчэ аднаго хлопца. Такой імправізацыяй распачалася сустрэча герояў Плошчы.

На экране — моманты змаганьня моладзі на Кастрычніцкай плошчы 19—23 сакавіка. Прысутныя пазнавалі ў гэтых нарэзках сябе, знаёмых, сукамэрнікаў. Кінанарэзкі ішлі праз усю прэзэнтацыю.

Амэрыканка Джэніфэр Ід сказала, што зьбіраецца перакласьці кнігу «Верым. Можам. Пераможам» на ангельскую мову. Яна сказала, што гэтая кніга патрэбная амэрыканцам, «каб ведалі, што ў сьвеце ёсьць несправядлівасьць, але таксама ёсьць людзі, якія змагаюцца зь ёй». Джэніфэр жыве ў Беларусі тры месяцы, яна вучыцца ў магістратуры філфаку БДУ.

Маладзевы актывіст Дзяніс Садоўскі казаў, што баяўся перад тым, як ісьці на Плошчу, але ня меў ніякіх сумневаў наконт правільнасьці таго, што ён робіць.

«У тыя дні мы перамаглі нягледзячы ні на што, таму назад дарогі няма. Мы – найлепшыя», — казала Крысьціна Шацікава.

Аднак асабліва ўзрушыў публіку прадпрымальнік Алесь Т. Ён расказваў, як прадпрымальнікі перавозілі на Плошчу ежу, намёты, як дурылі міліцыянтаў, кажучы, што ідуць да дырэктара Палацу рэспублікі «Халявы». Алесь прасіў прабачэньня, што ня мог быць усе ночы і дні на Плошчы, што не сядзеў на сутках. Але абяцаў любую дапамогу людзям, што будуць працягваць змагацца.

Сустрэча доўжылася гадзіну, мікрафон быў вольны, і кожны ахвотны мог расказаць пра свае ўражаньні ад Сакавіка-2006. Але чамусьці такіх аказалася ня дужа багата.

**Зьміцер Панкавец**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Беларусь безь Беларусі

Новыя ідэалягічныя ўстаноўкі ў люстэрку тэлепраектаў БТ і АНТ: тэлефільмы «Была краіна» ды «Савецкая Беларусь» глядзеў **Алесь Кудрыцкі.**

Беларускія дзяржаўныя мэдыі маюць адну цудоўную рысу. Яны настолькі падкантрольныя ўладзе, настолькі несамастойныя і маніпуляваныя, што любыя зрухі рэжыму адбіваюцца ў іх, нібы ў люстэрку. Найперш гэта датычыцца знакавых «спэцпраектаў» накшталт тэлефільмаў «Была краіна» (Першы нацыянальны тэлеканал) ды «Савецкая Беларусь» (АНТ). У нармальных умовах такія фільмы мусілі б быць пераасэнсаваньнем гісторыі журналістамі. Насамрэч жа атрымалася тэлепраекцыя спушчаных «згары» найноўшых ідэалягічных установак. Як у той сталоўцы: атрымалі з базы паўфабрыкаты ды, як маглі, зрабілі зь іх катлеты.

Аналізаваць, наколькі тыя фільмы адпавядаюць гістарычным фактам, няўдзячная справа — перад тэлерэжысэрамі стаялі задачы, далёкія ад гістарычнага дасьледаваньня. А вось заўважыць, куды перасоўваюцца ідэалягічныя акцэнты, сапраўды цікава. Сам факт, што былі зьнятыя два фільмы — «Была краіна» ды «Савецкая Беларусь» — шмат пра што кажа. У прынцыпе, можна было б зьняць і адзін фільм, густа замяшаны на савецкай настальгіі. Аднак ідэолягі абралі прынцыпова іншы падыход: СССР ды Беларусь сэрвіраваць асобна.

## «Была краіна», ды сплыла

Мэдыйнае суправаджэньне да абодвух фільмаў дазваляе казаць пра тое, што гэта была сапраўдная інфармацыйная кампанія. Пралёгам да тэлепрадуктаў Першага нацыянальнага тэлеканалу і АНТ былі выпускі тэленавінаў, у якіх дыктары, нібы згаварыліся, прэзэнтавалі вынікі апытаньня, праведзенага ў Расеі, Украіне ды Беларусі Ўсерасейскім цэнтрам вывучэньня грамадзкай думкі. Паводле яго, беларусы найменш за іншых шкадуюць пра зьнікненьне СССР і найбольш скептычныя што да яго аднаўленьня. Фактычна, яны лічаць рэінкарнацыю Саюзу немагчымай. Улічваючы, што «няўгодных» грамадзкіх апытаньняў у тэленавінах не агучваюць, гэтыя вынікі — падмацаваньне новых ідэалягічных установак. Калі раней унушалі: «СССР развалілі, але мы зробім усё для яго адбудовы наноў», дык цяпер: «СССР развалілі, але мы адбудуем новую Беларусь, якая возьме ад яго ўсё найлепшае».

Тыя, хто чакаў адвечнага плачу з нагоды «развалу» СССР, былі расчараваныя. Трэцяя, заключная сэрыя фільму «Была краіна» пачынаецца шакуючай фразай: СССР быў хворы, і хвароба была падобная да атлушчэньня — сэрца не давала рады нагрузкам. Калі запрошаныя на здымкі госьці зболышага і настальгуюць па Савецкім Саюзе, дык у вусны нябачнаму дыктару ўкладзеныя адмыслова сухія ды нэўтральныя словы. Фільм — ня заклік да дзеяньня і нават ня гнеўнае абвінавачаньне ў бок «дэмакратаў». «Была краіна» — гэта ахутаная лёгкай настальгіяй канстатацыя факту: СССР перастаў існаваць. Маўляў, шкада, але што зробіш. Трэба жыць далей.

## Вялікая кастрычніцкая сацыялістычная каляровая рэвалюцыя

Што ляжыць у фундамэнце новай краіны, якую нам давядзецца будаваць, тлумачыць іншы фільм — «Савецкая Беларусь». Тут зусім іншая стылістыка. Калі на тэлестужку пра СССР адвялі ўсяго тры сэрыі, дык на кіно пра Беларусь — ажно дзесяць. Ды якіх! Гэта вам не банальныя тэлеінтэрвію, разбаўленыя кінахронікай. Тут і актор-вядоўца, і наўмысна падрапаныя на кампутары «пад стары кінэматограф» пастановачныя здымкі, і рэвалюцыянэры ў скуранках, і архіўныя кадры, і экспэрты, і кампутарныя эфэкты. Мікалай II у Магілёве — як жывы!

Першы сюрпрыз — жорсткія эпітэты, якімі вядоўца адорвае расейскую манархію, «пакрытую ганьбай Цусімы, крывавую, пагарджаную царквой і народам». На расейскай тэлевізіі такога не пабачыш.

Адпраўной кропкай фільму ўзятая Першая сусьветная вайна як катастрофа для беларускага народу. Зрэшты, першая ўзгадка ў фільме пра беларускі народ зьвязаная менавіта з пратэстам сялянаў супраць вайны ды памешчыкаў, якія нажываліся на народнай бядзе. Фактычна, гэта падаецца як першае абуджэньне народнай сьвядомасьці. Выходзіць, што беларуская нацыя паўстала тады, калі наважылася пратэставаць. Варта адзначыць сьмеласьць аўтараў фільму, якія стаюць на такую хісткую кладку. Даючы азначэньне «паліцэйскі» тагачаснаму рэжыму, разьвязваючы вузлы прычынаў, якія прывялі да рэвалюцыі, апісваючы ходу пратэстаў, яны няўмольна падводзяць гледача да правядзеньня паралеляў з сучаснай сытуацыяй. Чым замоўчваць відавочнае, рэжысэр выграшае абыграць гістарычную паралель. «Падзеі тых часоў у Петраградзе нагадваюць сёньняшнія каляровыя рэвалюцыі», — кажа ў кадры Пётар Петрыкаў, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Выходзіць двухсэнсовасьць: рэвалюцыя падаецца ня толькі як народнае ўзбурэньне, але і як вынік дзеяньняў лібэральных буржуазных сілаў, якія мелі магчымасьць штучна арганізаваць эканамічны крызіс.

## Дэбеларусізацыя ідэалёгіі

«Інтэрнацыянальныя па свайму духу бальшавікі канкуравалі з рознымі нацыянальнымі партыямі, у тым ліку з Грамадой», — прызнаюцца аўтары фільму. Гэта чарговы арэшак, які даводзіцца раскусваць яго ідэолягам: як прэзэнтаваць беларускі нацыянальны рух пачатку стагодзьдзя ў кантэксьце стварэньня новай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Настройка: «падаваць нэгатыўна». Калі браць за ідэал дзяржаўнасьці СССР, то лёгка ганіць тых, хто марыў пра незалежнасьць Беларусі. Але як уцямна патлумачыць гледачам, што незалежнікі пачатку XX стагодзьдзя шкодзілі таму, каб у канцы XX ст. Рэспубліка Беларусь паўстала як дзяржава ды займела свайго першага прэзыдэнта?

Аўтары фільму вынаходзяць адмысловы лягічны лацужок: «Народ зьвязваў рашэньне праблемаў не зь беларускімі, а з агульнарасейскімі палітычнымі сіламі, у тым ліку з бальшавікамі і эсэрамі». Маўляў, простыя людзі лічылі, што нацыянальнымі сіламі кіруюць багацеі накшталт Скірмунта. Дзікавата глядзіцца на экране выдраная з кантэксту цытата Цьвікевіча: «Народ крычаў «Прэч!» кожнаму інтэлігенту, які гаварыў па-беларуску». Яе ня проста зачытваюць, але і выводзяць тэкстам на экран. Адчуваецца: зьнівэляваць ролю нацыянальнага руху пачатку мінулага стагодзьдзя — толькі адна з установак. Звышзадача ідэолягаў — намацаць гістарычнае абгрунтаваньне



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Рэбрэндынг праекту «РБ»: Беларусь — гэта Савецкі Саюз у мініятуры.**

для легалізацыі нянавісьці сучаснага беларускага рэжыму да ўсяго беларускага.

## Гісторыя без асобаў ці гісторыя асобы?

Рэзкае адрозьненьне фільму ад падобных стужак, зьнятых за савецкім часам: Ільіч пачынае зьлівацца з масоўкай. Пра Леніна ўзгадваюць толькі пры патрэбе, пункцірам. Яго роля не адмаўляецца, але слова «правадыр» ужо не чуваць.

Пакрыты пылам пантэон рэвалюцыйных багоў чакае вялікая рэарганізацыя: ідзе пошук новых герояў, калі не духоўна, дык хаця б геаграфічна прывязаных да беларускай тэрыторыі. Пад акампанэмэнт ласкавага барытону дыктара на экране паблісквае круглымі акуляркамі Фрунзэ, а бальшавік Пралыгін хвацка вядзе браняпоезд у Менск. Разам з тым, вызначэньне новых герояў адбываецца асьцярожна, без залішняга імпэту ды рамантызацыі. Ствараецца падмалёвак, які, аднак, не даводзіцца да стану іконы.

Фактычна, робіцца першы крок да дэперсаналізацыі рэвалюцыі. На першы плян выходзяць не правадыры, а чалавечыя масы, якія жадаюць і дамагаюцца ўсталяваньня новага палітычнага ладу. Калі выявіцца, што наступныя сэрыі фільму таксама, як і Леніну, не нададуць першачарговай увагі Сталіну, Машэраву ды іншым пэрсаналіям, актуальныым для «савецкай» гісторыі Беларусі, калі зноў будзе зроблены акцэнт на падзеі, а не на асобы, то можна будзе казаць пра тэндэнцыю да агульнай дэпэрсаналізацыі сучаснай беларускай гісторыі. Ці ня робіцца гэта для таго, каб новастворaныя героі не зацьмілі тую асобу, якая прайшла праз восем дзесяцігодзьдзяў, каб «давесьці да сапраўднага ладу» рэвалюцыйную справу? Ці ня ёсьць дэпэрсаналізацыя пралёгам да яе монапэрсаналізацыі?

## Рэбрэндынг «праекту РБ»

Новы тон рыторыкі прэзыдэнцкіх прамоваў, выпускаў тэленавінаў, тэкстаў газэтных перадавіц ды дыктарскай агучкі іміджавых фільмаў дазваляе казаць пра тое, што зараз ідзе перагляд падыходаў да пазыцыянаваньня «праекту РБ». Выклікана гэта, хутчэй за ўсё, жаданьнем зьмяніць (а найлепш — пашырыць) мэтавую аўдыторыю гэтага ідэалягічнага праекту.

Ідзе апора ўжо не на памяць, а на міт. Пакаленьне, якое будавала СССР, адыходзіць. Актывізуецца пакаленьне, якое найлепш памятае напаўгалодныя васьмідзесятыя гады і жыве не мінулым, а сёньняшнім днём. Настальгія па СССР меншае, Масква закручвае газавы кранік — і як вынік замест нерэальнага ўзьяднаньня народаў прапануецца савецкі канцэнтрат, Савецкі Саюз у мініятуры, Рэспубліка Беларусь, якая мусіць увасобіць у сабе ўсё найлепшае, што мела савецкая сыстэма.

Важная рыса новай ідэалёгіі — адыход ад расейскіх ды агульнасавецкіх мітаў і стварэньне міту ўласнага. У кантэксьце новага беларускага міту Пуцін, які прымае вайсковы парад у стылі апошняга манарха, глядзіцца ня толькі карыкатурна, але і варожа. З расейскага міту паўстае новая імпэрская Расея, а з беларускага — новая савецкая Беларусь. Цікава, што «славянская» ідэя ўжо, выглядае, ня лічыцца ідэолягамі актуальнай — яе адкінулі на карысьць «савецкай» ідэі.

## Ахілесавы пяткі

У беларускай ідэалёгіі больш не праглядаецца ўстаноўкі на самазьнішчэньне краіны ў выніку зьліцьця з Расеяй. Відзецца пошук адметнасьці «новай савецкай Беларусі». Вось толькі куды ён завядзе?

Ідэолягі стаюць на небясьпечны для сябе шлях. Новая ідэалёгія — спроба збудаваць нешта новае на ўласна беларускім гістарычным матэрыяле. Але надта ўжо няўдзячны матэрыял абраны. Ці ўдасца зрабіць новую ідэалёгію масава прывабнай? Няўжо рэжым сапраўды зьбіраецца пашыраць сваю базу коштам пакаленьня 30—40-гадовых, для якога сталінскія расстрэлы — факт, а камуністычныя лёзунгі — найчасьцей пажоўклыя штампы? А што да моладзі, дык для яе Фрунзэ — гэта проста назва менскай вуліцы.

Новая ідэалёгія закладаецца для пабудовы краіны, якая мае назву Беларусь, аднак актыўна адмаўляе ўсё беларускае. Гэта самая складаная задача, якая паўстае перад ідэолягамі. Адна справа – нішчыць беларускую мову, рыхтуючыся да ўзьяднаньня з Расеяй, але як патлумачыць такія паводзіны, калі ты будуеш незалежную Рэспубліку Беларусь? Таму ў будучым варта чакаць новых спробаў ідэалягічнага абгрунтаваньня непатрэбнасьці, няважнасьці, шкоднасьці беларускага для Беларусі. І гэта самае слабае месца новай ідэалёгіі.

І апошняе — у новай дзяржаўнай ідэі зьяўленьне беларускай нацыі зьвязваецца з народным пратэстам супраць несправядлівага рэжыму, які выліўся ў рэвалюцыю. Гэта закладае ў падмурак ідэалёгіі пратэстны пачатак. Варта прызнаць — гэта ня самыя прыдатныя ідэйныя падваліны для краіны, якая найперш цэніць «стабільнасьць».

### Хто шкадуе пра распад СССР

Вынікі агучанага па беларускіх тэлеканалах апытаньня, праведзенага Усерасейскім цэнтрам вывучэньня грамадзкай думкі: беларусы найменш настальгуюць па СССР, амаль ня вераць у яго аднаўленьне ды правалілі б новы саюзны рэфэрэндум. На пытаньне «ці шкадуеце вы пра распад СССР?» станоўча адказваюць 68% жыхароў Расеі, 59% украінцаў і 52% беларусаў. Магчымым аднаўленьне СССР лічаць 23% расейцаў, 18% украінцаў і толькі 13% беларусаў. Калі б праводзіўся рэфэрэндум пра стварэньне новага Савецкага Саюзу, то вынікі былі б такімі: Расея — «за» 51%, «супраць» — 22%. Украіна — «за» 45%, «супраць» — 25%. Беларусь: «за» 36%, «супраць» — 32%.

Варта адзначыць, што ВЦІОМ – гэта дзяржаўны сацыялягічны цэнтар, і ягоныя зьвесткі ў мінулым часта адрозьніваліся ад зьвестак іншых сацыёлягаў у бок, выгадны ўладам Расеі.

# Біскуп Кашкевіч рэзка крытыкуе ўлады

Ні разу за прэзыдэнцтва Лукашэнкі касьцёл не выступаў з такой рашучай крытыкай уладаў. Ліст Кашкевіча канкрэтны і па стылі нагадвае пасланьні польскага кардынала Вышынскага, які ў сацыялістычнай Польшчы адстойваў незалежнасьць Касьцёлу ад дзяржавы.

У нядзелю ва ўсіх касьцёлах Гарадзеншчыны быў зачытаны афіцыйны ліст да духавенства і вернікаў старшыні Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі Аляксандра Кашкевіча.

Пасланьне было напісанае з нагоды высылкі зь Беларусі сямі ксяндзоў і пяці манашак, грамадзянаў Польшчы. Улады не зьмянілі свайго рашэньня аб гэтым, нягледзячы на хадайніцтвы Касьцёлу, падмацаваныя тысячамі подпісаў вернікаў. Гэтае рашэньне б’е па Гарадзенскай дыяцэзіі, дзе з 168 сьвятароў кожны трэці — грамадзянін Польшчы.

Ліст А.Кашкевіча даволі канкрэтны і, як на беларускія рэаліі, сьмелы. Па сваім стылі ён трохі нагадвае пасланьні польскага кардынала Вышынскага, які ў сацыялістычнай Польшчы адстойваў незалежнасьць Касьцёлу ад дзяржавы. Ні разу за Лукашэнкі касьцёл не выступаў з такой рашучай крытыкай уладаў.

Бп.Кашкевіч як кіраўнік Канфэрэнцыі біскупаў зьвяртаў да ўладаў просьбу перамяніць рашэньне аб высылцы, аднак не атрымаў адказу з Адміністрацыі прэзыдэнта, гаворыцца ў лісьце.

Кашкевіч заявіў: «Улада ў касьцёле ... належыць біскупу. Заканадаўства краіны таксама пакідае дыяцэзіяльнаму біскупу свабоду выбару пры запрашэньні на працу грамадзянаў іншых краінаў. Таму зьнешняе ўмяшаньне ў правамоцную дзейнасьць дыяцэзіяльнага біскупа ёсьць парушэньнем закону і парушэньнем свабоды касьцёлу».

Старшыня канфэрэнцыі біскупаў выказаў свой пратэст і заклікаў духавенства і каталікоў маліцца за высыланых ксяндзоў.

Нагадаем, што на мінулыя выходныя біскуп Кашкевіч падтрымаў каталікоў-галадоўнікаў у Горадні, якія дзесяць гадоў не маглі дамагчыся дазволу на будаўніцтва касьцёлу. Бп.Кашкевіч паходзіць зь Віленшчыны і лічыцца лідэрам польскамоўнае плыні ў беларускім Касьцёле.

З крытыкай уладаў выступіў і орган гарадзенскай курыі — газэта «Слова жыцьця».

**ПР; МБ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Біскуп Кашкевіч бласлявіў вернікаў на пратэст.**

# «Існуючая сытуацыя прадыктавала»

Пастырскі ліст біскупа **Аляксандра Кашкевіча.**

Існуючая сытуацыя прадыктавала мне зьвярнуцца да вас з просьбай маліцца ў інтэнцыі сьвятароў і сясьцёр–законьніц, якія працуюць у нашай Дыяцэзіі. Гэта было выклікана адмовай з боку прадстаўнікоў дзяржаўнай улады даць дазвол на працу для сямі сьвятароў і пяці законных сясьцёр з Польшчы у 2007 годзе.

Дзякую вам за сьведчаньне малітоўнага адзінства і дзейснага клопату пра вашых пастыраў. Аднак надалей патрэбная падтрымка з вашага боку, асабліва ў бягучы момант, памятаючы пра тое, што мы складаем адно ў Хрысьце. Я зьвяртаюся да вас у сувязі зь лістом, атрыманым 2 сьнежня з Савету Міністраў. Ліст гэты падпісаны Леанідам Паўлавічам Гулякам, упаўнаважаным у справах рэлігій і нацыянальнасьцяў, і зьяўляецца адказам на просьбу тысяч вернікаў, якія зьвярнуліся да ўладаў з просьбай перагледзець рашэньне адносна рэгістрацыі сьвятароў і законных сясьцёр з Польшчы, якія працуюць у нашай Дыяцэзіі. Як Біскуп Гарадзенскай Дыяцэзіі і Старшыня Канфэрэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі, я некалькі разоў асабіста зьвяртаўся да ўладаў з просьбай адклікаць рашэньне. Двойчы езьдзіў у Менск, і разам зь біскупам Антоніем Дзям’янкам і біскупам Уладзіславам Блінам размаўляў на гэтую тэму з упаўнаважаным у справах рэлігій і нацыянальнасьцяў.

Да сёньняшняга дня — 5 сьнежня — чакаю адказу на ліст, скіраваны мною ў Адміністрацыю прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Нягледзячы на ўсе нашыя намаганьні атрымаць станоўчы адказ на просьбу, Камітэт у справах рэлігій і

# Кагэбіст лібэральны

Зьявіўся новы імаверны кандыдат у пераемнікі Пуціна — кіраўнік «Росабаронэкспарту».

У барацьбу за расейскае прэзыдэнцкае крэсла ўключыўся Сяргей Чэмезаў, дырэктар фірмы «Рособоронэкспорт», манапаліста ў гандлі расейскай зброяй. З Пуціным ён знаёмы з савецкай разьведкі.

Прэзыдэнцкія выбары ў Расеі маюць адбыцца ў 2008 г., аднак ужо цяпер некалькі кандыдатаў на чарговага гаспадара Крамля прэтэндуюць на голас галоўнага выбарца — прэзыдэнта Пуціна. Менавіта яго пратэкцыя дасьць кандыдату тэлевізійную падтрымку, неабмежаваныя фінансавыя магчымасьці і адміністрацыйны рэсурс.

Памкненьні Чэмезава, якога ў суботу абралі ў кіраўніцтва кіруючай партыі «Единая Россия», былі на гэтым тыдні пацьверджаныя вялікім інтэрвію ўрадавай «Российской газете». Чэмезаў — блізкі знаёмы Пуціна, якога ведае з часоў працы ў савецкай разьведцы ў ГДР.

— Мы жылі па суседztве. Вельмі часта размаўлялі як на службовыя,



PHOTO.KOMMERSANT.RU

так і на асабістыя тэмы, — прызнаўся нядаўна Чэмезаў. У 90-я абодва былыя разьведчыкі знайшлі працу ў тым самым аддзеле канцылярыі Крамля.

Калі Пуцін стаў прэзыдэнтам, ён пачаў фаварызаваць Чэмезава і ўрэшце паставіў яго на чале заможнага манапаліста ў гандлі расейскай зброяй. Чэмезаў на гэтай пасадзе апраўдаў аказаны яму давер і даволі спраўна вывеў «Рособоронэкспорт» з заняпаду.

Сувязі палітычных элітаў зь бясьпекай і разьведкай прымушаюць шмат якіх расейцаў падазраваць, што спэцслужбы кіруюць дзяржавай замест таго, каб служыць ёй. Аднак абаронцы Пуціна пераконваюць, што былыя супрацоўнікі разьведкі проста параўнальна менш схільныя да карупцыі і алькагалізму.

Масмэдыя ўжо год як пішуць пра двух асноўных кандыдатаў на пераемніка Пуціна — віцэ-прэм’ераў Дзьмітрыя Мядзьведзева і Сяргея Іванова. Сёлета ўвесну некаторыя публіцысты ўключылі ў гэтую групу і кіраўніка расейскай чыгункі Ўладзімера Якуніна.

Чэмезаў успрымаецца як чалавек, здольны аб’яднаць інтарэсы вайсковых групаў уплыву з г.зв. крамлёўскімі лібэраламі. Першыя чуткі пра прызначэньне Чэмезава прэм’ерам зьявіліся ўжо сёлета ўвесну. Шлях Пуціна да пасады прэзыдэнта таксама вёў праз пасаду кіраўніка ўраду.

**Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**

# Энэргасыстэмы Балтыі далучаныя да эўрапейскай

Польшча і Літва падпісалі ў мінулую пятніцу ў Вільні дамову наконт будаўніцтва так званага энэргетычнага мосту — транзытнага злучэньня электраэнэргетычных сыстэмаў дзьвюх краінаў. Увод у строй энэргетычнага злучэньня зь Літвой павінен узмацніць энэргетычную бясьпеку.

Праект прадугледжвае пабудову трансгранічнай лініі Элк–Алітус і ліній унутры польскай сыстэмы.

Кошт праекту складзе каля 550 млн даляраў. Гэтыя інвэстыцыі будуць прафінансаваны за кошт уласных сродкаў прадпрыемства, а само будаўніцтва будзе доўжыцца да 2011 году. Чакаецца, што будаўніцтва прафінансуе Эўрасаюз.

Дзякуючы злучэньню з Польшчай Літва, а таксама Латвія і Эстонія будуць уключаны ў эўрапейскую энэргетычную сыстэму.

**СП**

нацыянальнасьцяў пры Савеце Міністраў пакінуў сваё рашэньне ў сіле: да канца сьнежня сьвятары і законныя сёстры, якія не атрымалі дазволу на рэгістрацыю, павінны будуць пакінуць мейсца сваёй працы і выехаць зь Беларусі. У тым жа лісьце Савет Міністраў, цытуючы закон Рэспублікі Беларусь, прапануе мне як біскупу, адказнаму за Гарадзенскую Дыяцэзію, магчымасьць запрашаць іншых сьвятароў з Польшчы. У сувязі з такім рашэньнем і прапановай я выказваю свой смутак і пратэст. Улада ў Касьцёле, згодна з правам Усеагульнага Касьцёлу, належыць біскупу. Заканадаўства нашай краіны таксама пакідае дыяцэзіяльнаму біскупу свабоду выбару пры запрашэньні на працу грамадзянаў іншых краін.

Таму зьнешняе ўмяшаньне ў правамоцную дзейнасьць дыяцэзіяльнага біскупа зьяўляецца парушэньнем права і парушэньнем свабоды Касьцёлу. Яшчэ ў чэрвені я падаў уладам сьпіс сьвятароў і законных сясьцёр, якія застануцца працаваць у нашай Дыяцэзіі ў 2007 годзе, і гэтым выказаў усім ім свой пастырскі давер. Ня бачу прычыны, па якой належала б гэты давер адклікаць. Сьвятарам і сёстрам, якім адмовілі ў праве на працу, улады таксама не паведамілі прычынаў адмовы, якія б супярэчылі заканадаўству нашай краіны. Я прашу ўсіх Вас, Шаноўныя Сьвятары, законныя Сёстры і Ўзьлюбленыя Дыяцэзіяне, працягваць маліцца. Таксама прашу вас, каб сваю малітоўную салідарнасьць з вашым біскупам, сьвятарамі і законнымі сёстрамі вы пашырылі для станоўчага вырашэньня справы будоўлі касьцёлаў у новых мікраранах нашых гарадоў. Свабода Касьцёлу мае свае карані ў збаўчай місіі Езуса Хрыста, а ў заканадаўстве замацавана з погляду на непазбыўнае права людзкой асобы. Мы ня можам занядбаць місію, дарчаную Касьцёлу. Мы жывём таксама ў краіне, якая гарантуе свабоду асобы, і ня трацім надзеі, што яна будзе шанавацца.

З малітвай і пастырскім бласлаўленнем,

**Аляксандар Кашкевіч, Гарадзенскі Біскуп**

# Голад і галадоўнікі

Галадоўкі — гэта дакор кожнаму з нас. Піша **Віталь Тарас**.

Голад, галадаваньне, Галадамор. Гэтыя аднакарэнныя словы маюць рознае эмацыйнае напаўненьне, бо належаць да розных сфэраў і пластоў жыцьця. Але ўнутрана яны паміж сабой зьвязаныя, хоць і не абавязкова наўпрост.

### Эфэкт замяшчэньня

Пасьляваеннае пакаленьне савецкіх людзей ужо ня ведала голаду. Хоць яшчэ на пачатку 1960-х кавалак белага хлеба з маслам, пасыпаны цукрам, быў для звычайнага менскага школьніка сапраўдным ласункам. Тады, пасьля хрушчоўскай «кукурузнай» рэформы, белы хлеб літаральна вымела з прылаўкаў крамаў. І гэта была не апошняя «рэформа», з дапамогай якіх кіраўніцтва СССР дзесяцігодзьдзямі беспасьпяхова спрабавала вырашыць «харчовую праграму». Паколькі цэны на хлеб штучна ўтрымліваліся, у вёсцы ім кармілі сьвіньняў, а ў горадзе школьнікі часам гулялі засохлымі батонамі ў футбол.

Затое ўсе астатнія тавары, і ня толькі прадукты, заставаліся дэфіцытам. Кіраўнік дзяржавы ў сваім інтэрвію ў сувязі з пятнаццатай гадавінай распаду СССР казаў, што ў Беларусі да самага апошняга моманту не было нэгатыўных зьяваў, якія назіраліся ў Расеі ды іншых саюзных рэспубліках. Г.зн., у прыватнасьці, што ў БССР у 1970-80-я гады не было заўсёдных чэргаў у крамах, а ў 80-х не зьявіліся талёны на масла, крупу, цукар, цыгарэты, мыла, шкарпэткі.

Цікава, што большасьць людзей, асабліва пэнсійных гадоў, сапраўды вераць, што ніякага дэфіцыту, ніякіх чэргаў за савецкім часам не было. Гэтая зьява ў псыхалёгіі называецца «выцясьненьнем», альбо «замяшчэньнем». Мозг чалавека падсьвядома выціскае з памяці самыя непрыемныя для яго ўспаміны. Асабліва калі яны зьвязаныя з прыніжэньнем годнасьці чалавека, стратай ім чалавечага твару. Так, удзельнікі вайны куды часьцей успамінаюць моманты перамогі ці подзьвігаў, чым сьмерць, пакуты, раскурочаныя выбухамі акрываўленыя целы, сьмярдзючыя трупы, страх і жаданьне выжыць любой цаной.

Але ёсьць яшчэ гістарычная памяць, і вось яе ўлада заўсёды старалася вынішчаць з асаблівай бязьлітаснасьцю. У ваеннага ды ў першага пасьляваеннага пакаленьня голад выклікаў асацыяцыі менавіта з вайной (адтуль славутае «абы не было вайны!»). З экранаў кіно — галоўнага на той час сродку масавай інфармацыі — можна было даведацца пра жахлівы голад у блякадным Ленінградзе. Але й тут далёка не адразу: праўда пра блякаду прабівалася да чытача па крупінках. Гранічна праўдзівая і жорсткая «Блякадная кніга» Адамовіча і Граніна — нават з купюрамі — выклікала актыўнае непрыманьне ня толькі партыйнага начальства, але й часткі саміх блякаднікаў.

### Табу на праўду

Але была тэма, на якую было накладзенае абсалютнае табу. Галадамор. Ва Ўкраіне, якую афіцыйная прапаганда заўсёды называла «жытніцай» СССР, у 1932—1934-м гадах у выніку сталінскай палітыкі экспрапрыяцыі (хлебанарыхтовак) памерлі ад голаду мільёны людзей. І гэта ў так званы мірны час!

Спатрэбілася амаль шэсьцьдзесят гадоў, каб пра Галадамор можна было пачаць адкрыта гаварыць і пісаць. Пасьля гэтага прайшло яшчэ пятнаццаць гадоў у незалежнай Украіне, пакуль Вярхоўная Рада прыняла закон аб Галадаморы, і прэзыдэнт Ючанка зацьвердзіў яго. У законе гэтая трагедыя кваліфікуецца як генацыд, публічнае адмаўленьне якога цягне за сабой юрыдычную адказнасьць. Амаль так, толькі больш жорстка, адмаўленьне факту Галакосту трактуецца ў сучаснай Нямеччыне.

Масква адмаўляецца прызнаць за генацыд адно з найбольш страшных злачынстваў сталінскага рэжыму. Там кажуць, што расейскі народ пацярпеў пры ім ня менш за іншыя народы. У якасьці доказу нярэдка прыводзяць голад у Паволжы, які таксама каштаваў мільёнаў жыцьцяў. Але пры гэтым забываюцца на адну «дробязь». Той голад быў выкліканы, па-першае, натуральнымі прычынамі — неўраджаем. А па-другое, галадоўнікам дапамагаў тады ўвесь сьвет. Голаду ва Ўкраіне афіцыйна не было, размовы пра яго трактаваліся як паклёп на савецкую дзяржаву, а за гэта таксама можна было заплаціць жыцьцём.

У Беларусі маўчаць пра Галадамор і сёньня. Хоць голад 30-х закрануў Беларусь. Дакладных лічбаў — колькі голад каштаваў беларускаму народу, які здаўна цудоўна ўмеў пракарміць сябе ды яшчэ забясьпечваў збожжам Эўропу, дагэтуль няма. Яны дагэтуль схаваныя ў «спэцсховах». А як жа йнакш, калі помнік натхняльніку ды арганізатару Галадамору стаіць зараз пад Менскам?

Адтуль, ад тых перамог над сялянствам і сельскай гаспадаркай, ад нізкіх закупачных цэнаў на збожжа (якое СССР экспартаваў за валюту нават ва ўмовах павальнага голаду) вядуць радавод нерэнтабэльныя савецкія калгасы і саўгасы, дэфіцыт прадуктаў у гарадах, гуляньне булкамі ў футбол.

### Жыць стала лепей, жыць стала весялей

У галадоўках, якія ахапілі апошнім часам беларускае грамадзтва, трэба бачыць і пазытыўны момант. Ён у тым, што пра голад у Беларусі ня толькі забыліся – ён не пагражае бліжэйшым пакаленьням беларусаў. Толькі ў сытым грамадзтве магчымыя галадаваньні.

Панятак «палітычная галадоўка» зьявіўся на прасторах Расейскай


PHOTO.BYMEDIA.NET

імпэрыі пад канец XIX стагодзьдзя, калі пераважнай большасьці яе падданых голад ужо не пагражаў. Тая ж Украіна, расейскае Чарназем'е, Прыбалтыка і часткова Беларусь больш-менш надзейна забясьпечвалі харчам мільёны людзей. Пры Іване Жахлівым ці Пятры Першым галадовак не абвяшчалі.

А вось для расейскіх сацыял-дэмакратаў і эсэраў масавыя галадоўкі ў турмах і на этапах сталі зброяй барацьбы за свае правы. Амаль ва ўсіх фільмах і кніжках пра дарэвалюцыйную Расею мы абавязкова ўбачым вобраз нязломных бальшавікоў, якія калектыўнай галадоўкай дамагаюцца права на прагулкі, права атрымліваць у камэрах газэты, наведваць турэмную бібліятэку і шмат чаго яшчэ.

Пройдзе зусім няшмат часу, і тыя самыя бальшавікі ня толькі зачыняць усе няўгодныя ім газэты, але кінуць у канцлягеры мільёны людзей. Яны пабудуюць ГУЛАГ, дзе зьняволеным, а фактычна — рабам пайкі будзе ледзь хапаць для таго, каб працаваць і не памерці. Хаця б некаторы час. А потым на зьмену памерлым прыйдуць іншыя, мільёны іншых. Гэты мэтад, даказаўшы сваю эфэктыўнасьць у сталінскім ГУЛАГу, будзе з посьпехам выкарыстаны й гітлераўцамі. Пра якую галадоўку можна гаварыць, калі жыцьцё чалавека нічога не каштуе?

У нашы дні, калі жыцьцё стала сытым і ў цэлым заможным, пра голад 30-х і 40-х ніхто ўспамінаць ня хоча. На першы плян выходзіць клопат пра здароўе і рацыяльнае харчаваньне. Калі гавораць пра голад, дык толькі ў сувязі зь лекавым галаданьнем альбо неабходнасьцю падтрымліваць форму. Ці ў скрайнім выпадку — у сувязі з анарэксіяй, псыхічным захворваньнем дзяўчын, якія даводзяць сябе да вынурэньня галаданьнем, каб зрабіцца падобнымі да топ-мадэляў.

## «Людзі робяць рамонт, купляюць машыны...»

Калі пару гадоў таму дэпутаты групы «Рэспубліка» абвясьцілі галадоўку, кіраўнік дзяржавы выказаўся наконт карыснасьці галаданьня для тых, каму варта скінуць некалькі лішніх кілаграмаў. Гэтая іранічная рэпліка выклікала радасныя ўсьмешкі і разуменьне з боку многіх людзей, для якіх сапраўды няма ў жыцьці іншых праблемаў, акрамя лішняй вагі, выкліканай празьмернай любоўю да сала з бульбай, ды гіпадынаміяй.

Голад, ад якога па-ранейшаму пакутуюць на плянэце мільёны людзей, Беларусі даўно ня тычыцца. Як паказвае апошняе дасьледаваньне ААН, на тэрыторыі СНД пагроза голаду захоўваецца толькі ў Таджыкістане. А вось недахоп харчаваньня ёсьць і ў Беларусі. Далёка ня ўсе сем'і маюць сродкі на нармальнае, паўнавартаснае, збалянсаванае харчаваньне. Але гэта праблема, вядома, ня толькі беларуская. Сацыяльная няроўнасьць ёсьць амаль паўсюль.

Бездань паміж разьвітымі краінамі й «трэцім сьветам» сапраўды расьце. Лёс дзяцей, што паміраюць ад голаду дзе-небудзь у Дарфуры, чые вочы з адчаем глядзяць на нас з тэлеэкранаў, мала каго кранае. Гэта ж адбываецца ня ў нас, а недзе далёка…

Сытасьць абывацеля тычыцца ня толькі яго страўніка. У яго прытупляюцца зрок і слых. Ён ня бачыць і ня чуе таго, што адбываецца ў некалькіх кроках ад яго — з суседам ці нават з сваяком. Сьвятлана Алексіевіч у адной з перадач радыё «Свабода» з нагоды галадоўкі Казуліна кажа, што ў той час, калі ён гіне, людзі «робяць рамонт, будуюць дамы, купляюць новую машыну». (Гэта крыху нагадвае словы Воланда з «Майстра і Маргарыты» Булгакава пра

Працяг на старонцы 15.

# У кожнай краіны свой Пінaчэт

«У кожнай краіны свой асьпірын» — гэта была ягоная улюбёная прымаўка. Памёр Пінaчэт, які ішоў да ўлады з добрым намерам ўратаваць краіну ад хаосу, а застаўся ў гісторыі крывавым дыктатарам. Гутарка з дасьледчыкам Лацінскай Амэрыкі **Сяргеем Шабельцавым.**

**«Наша Ніва»: Якімі былі перадумовы прыходу да ўлады Пінaчэта?**

**Сяргей Шабельцаў:** Пінaчэт – гэта малавядомы чалавек без асаблівых здольнасьцяў. Ён стаў вядомым і прыйшоў да ўлады толькі дзякуючы палітыцы, якую праводзіў яго папярэднік – Аўгуста Альендэ, палітыцы масавай нацыяналізацыі. Улада не магла кантраляваць сытуацыю на месцах, рабочыя хунты захоплівалі прадпрыемствы. Эканоміка пачала развальвацца, краіна пагружалася ў хаос. Адзін дзень ідзе мільённая акцыя падтрымкі Альендэ, назаўтра такая ж акцыя супраць палітыкі ўраду. У 1973 годзе інфляцыя ў Чылі склала 600%. Ультраправыя і ультралевыя тэрактамі загналі краіну ў стан фактычнай грамадзянскай вайны.

**«НН»: Як зьявіўся варыянт зь Пінaчэтам?**

**СШ:** Чылі была найбольш законапаслухмянай, эўрапеізаванай і індустрыяльнай краінай Лацінскай Амэрыкі. З XIX ст. яна мела самае моцнае войска ў рэгіёне. Пры гэтым войска па сваёй структуры не кланавае, дысцыплінаванае. Прычым чылійскія вайскоўцы былі пазбаўленыя той пыхі, якая характэрная для Аргентыны. Павага да вайскоўцаў заўсёды была высокай. У такой сытуацыі частка генэралаў прыходзіць да Пінaчэта з просьбай узначаліць іх, кажучы: калі ты ня згодзісься, згодзяцца іншыя.

**«НН»: Ці быў Пінaчэт відавочным лідэрам паўстанцаў?**

**СШ:** Не, Пінaчэт ня быў нейкім там рухавіком перавароту, але ён узяў на сябе адказнасьць. Ужо сам факт, што да перавароту генэрал знаходзіўся нумарам 3 у сьпісах на зьнішчэньне, складзеных ультраправымі, сьведчыць пра тое, што тут сваю ролю хутчэй адыграў пан Выпадак. Дый у грамадзтве ён асабліва вядомасьці ня меў. Аднак няважна, хто вам падказаў правільнае рашэньне, важна, хто ўзяў на сябе адказнасьць. Супраціву войску практычна не было аказана, пераварот быў зьдзейсьнены за адзін дзень. «Я не адчуваю сябе пераможцам, я лічу сябе проста чалавекам, які выканаў свой абавязак перад Радзімай», — казаў Пінaчэт.



**Сяргей Шабельцаў**

нарадзіўся ў 1972 у Менску. Кандыдат гістарычных навук. Дасьледчык краінаў Ляцінскай Амэрыкі.

**«НН»: Які лёс мог напаткаць Чылі ў выпадку няўдалага перавароту?**

**СШ:** Чылі магло паўтарыць лёс Кубы ці іншай краіны з сацыялістычнага раю.

**«НН»: Як мы можам ахарактарызаваць часы знаходжаньня ва ўладзе Пінaчэта?**

**СШ:** Яны былі рознымі. Першыя гады былі жорсткімі, ішлі бязьлітасныя расправы з камуністамі. На стадыёне ў Сант'яга дзейнічаў канцлягер. Камісія «Праўды і прымірэньня» ў 1991 годзе прыйшла да высновы, што ў гэты час зьнішчылі 2279 чалавек, 164 сталі ахвярамі разгону маніфэстацыяў. Пінaчэт відавочна мог бы перашкодзіць стварэньню ў краіне канцлягераў, дзе катавалі людзей, але не зрабіў гэтага. Можа быць, яму не далі, бо за гэтым стаялі стаўпы Пінaчэтавай улады, а разрываць зь імі дачыненьні Пінaчэт ня мог. Варта адзначыць, што людзі, якіх забіваў Пінaчэт, рабілі тое самае са сваімі праціўнікамі, калі былі ва ўладзе.

**«НН»: Дыктатура Пінaчэта была клясычнай у разуменьні гэтага слова?**

**СШ:** Так, ён забараніў партыі, распраўляўся зь іншадумцамі, распусьціў кангрэс, умешваўся ва ўнутраныя справы ўнівэрсытэтаў. Пінaчэт палічыў, што ў надзвы-



AP

чайнай сытуацыі, якая склалася ў краіне, можна часова забыцца на законнасьць, а пасьля краіна будзе разьвівацца па нармальным шляху. Ён усталяваў дыктатуру, але заахвочваў прыватную ўласнасьць і рыначныя пераўтварэньні.

**«НН»: За часамі кіраўніцтва Пінач эта Чылі дасягнула выдатных посьпехаў у эканоміцы?**

**СШ:** Таксама ўсё ня так адназначна. Пінач эт прыйшоў да ўлады, калі ў Чылі было жахлівая эканамічная сытуацыя. Былі крызісы і пры Пінач эту: у 1976 і 1982 гадах. У сярэдзіне 70-х Пінач эт спрабаваў стварацца карпаратыўную дзяржаву, якая будавалася на супрацоўніцтве розных клясаў грамадзтва, аднак адсутнасьць эканамічнага росту вымусіла ад гэтай ідэі адмовіцца. Пасьля быў лібэралізм узораў чыкагскай школы, і пасьля гэтага Чылі дасягнула сапраўды выдатных эканамічных посьпехаў.

**«НН»: На Ваш погляд, ці мусіў адбыцца суд над Пінач этам?**

**СШ:** Калі чалавек зьдзяйсьняў злачынствы, ён павінен несьці пакараньне. Ніводнае злачынства ня мусіць быць непакаранае. Сваякі ахвяраў абсалютна законна патрабавалі пакараньня Пінач эта, але гэта мусіць тычыцца толькі тых забойстваў, якія былі падчас ягонага кіраўніцтва. Караць за падзеі перавароту няма падставаў, бо Пінач эт фактычна выратаваў краіну ад грамадзянскай вайны.

**«НН»: Што сёньня чылійцы думаюць пра былога дыктатара?**

**СШ:** Цяперашняе пакаленьне чылійцаў выхаванае на прынцыпах, што адстойваў Пінач эт. Прынцыпах панаваньня закону і справядлівасьці. Пінач эт сышоў, а ягоныя прынцыпы засталіся. Таму я не дзіўлюся, што столькі людзей цяпер у Чылі выходзіць на вуліцы з плякатамі кшталту «Я вітаю цябе, мой генэрал!», ці «Дзякуй, мой генэрал». Пінач эт не памёр на сваёй пасадзе, ён не пакінуў сына на кіраўніцтве. Любімымі словамі дыктатара былі: «У кожнай краіны свой асьпірын». У Чылі ён быў менавіта такім.

**«НН»:Ці існуюць пэўныя паралелі між Чылі часоў Пінач эта і сёньняшняй Беларусьсю?**

**СШ:** Мне здаецца, што яны не да месца. Мы жывём у розных сусьветах. У Беларусі правы на ўласнасьць, на свабоднае волевыяўленьне ніколі не абмяжоўваюцца ў грамадзтве: нібыта яны ёсьць, але ніхто пра іх не гаворыць. У Чылі нашмат было болей пагрозаў правам чалавека, але пра іх заўсёды гаварылі, іх спрабавалі адстаяць і абараніць, нават такім шляхам, як гэта рабіў Пінач эт.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Голад і галадоўнікі

Працяг са старонкі 13.

звычайных людзей, якіх «сапсавала кватэрнае пытаньне». Дзеяньне раману, нагадайма, адбываецца ў Маскве ў 1930-я гады.)

На думку Алексіевіч, час такіх формаў і мэтадаў барацьбы, як галадоўка, застаўся ў мінулым. Бо пры адсутнасьці увагі СМІ да акцыі пратэсту яе проста не заўважаць.

І з гэтым можна было б часткова пагадзіцца, калі б ня пара акалічнасьцяў. Па-першае, галадоўка — гэта ня проста нейкая форма пратэсту; за кожнай зь іх хаваецца асабістая драма ці нават трагедыя канкрэтнага чалавека, які на яе наважыўся. У гэтым сэнсе сыты ня толькі не разумее галоднага, ён ня мае маральнага права асуджаць галадоўніка, даваць яму парады з гледзішча, так бы мовіць, вышэйшага арбітра.

## Галадоўка як сродак камунікацыі

Гэты прыклад згадваўся ўжо не аднойчы, але варта, мабыць, нагадаць яшчэ раз. Калі купка дысыдэнтаў выйшла на Красную плошчу ў 1968-м, пратэстуючы супраць уварваньня СССР у Чэхаславаччыну, гэта выглядала абсалютна безнадзейнаю справай. У пляне эфэктыўнасьці мэтаду.

У 2006-м стаяньне нашых дзяцей на Плошчы таксама ня мела бачнага ўзьдзеяньня на ўладу. Вынікам гэтага акту стала зьбіцьцё, турмы. Але хіба лепей было б, каб яны кіраваліся не маральным імпэратывам, які штурхнуў іх на Плошчу, але выключна довадамі розуму, меркаваньнямі свайго дабрабыту, як гэта робіць больш прагматычнае старэйшае пакаленьне?

Лепей для каго? Для ўлады? Для пэнсіянэраў? Дзеля супакаеньня сумленьня ўсіх тых, хто быў заклапочаны рамонтам, купляньнем машыны, пакінуўшы дзяцей самнасам з амонам? Хіба размова тут увогуле пра палітыку?

Але ёсьць і яшчэ больш важнае пытаньне: чым выкліканыя масавыя галадоўкі ў сёньняшняй Беларусі? Чаму менавіта гэтая форма пратэсту атрымала такі распаўсюд? Даць на яго адназначны адказ сёньня цяжка, нават немагчыма. Мабыць, павінен прайсьці пэўны час, каб зразумець, у якім кірунку рухаецца грамадзкая сьвядомасьць.

Але на некаторыя думкі гэтая зьява наводзіць. Галадоўка — мабыць, самая пасыўная форма пратэсту з усіх вядомых. Гэта ўзьдзеяньне на ўладу бязьдзеяньнем, выключна сілай уласнага духу, самаахвярнасьцю альбо сілай адчаю. Часам гэта спрацоўвае, бо галадоўка трывожыць чыноўнікаў самім фактам, тым, што адбываецца нешта непадкантрольнае, непрадугледжанае, што на галадоўку трэба неяк рэагаваць, бо калі нічога не рабіць, можа быць горш.

Але ў яшчэ большай ступені галадоўка выкліканая адсутнасьцю камунікацыі паміж людзьмі, усеагульным недаверам адзін да аднаго і нявер’ем у магчымасць пазытыўных зьменаў. Кожны факт галадоўкі, нават калі яна сканчваецца без вялікае шкоды для здароўя галадоўнікаў, — гэта папрок уладам, якая ня бачыць пад сабой людзей. Гэта папрок апазыцыйным партыям і іх лідэрам, якія ня могуць прапанаваць рэальную альтэрнатыву такім дзеяньням, зарадзіць людзей аптымізмам, бо самі рэдка падаюць прыклад пазытыўнага вырашэньня праблем.

Гэта папрок усяму недасканаламу сьвету. І кожнаму з нас — таксама.

## Над Нямігай пабудуюць пешаходны мост

Будаўніцтва пешаходнага мосту ў Менску над вуліцай Няміга завершыцца ўжо ўвесну. Гэта будзе ўнікальнае збудаваньне сем мэтраў ушыркі і трыццаць чатыры ўдоўжкі.

**Паводле tvr.by**

## Беларусы за год купілі тону золата

За 11 месяцаў Нацбанк прадаў грамадзянам залатых зьліткаў на 952,9 кг. Проці 2005 году аб’ём продажу зьліткаў узрос у чатыры разы. Найбольшай папулярнасьцю ў людзей карысталіся 10-грамовыя зьліткі. Брусоў на кіля вагою набылі 150 штук. Срэбра за той жа час напродалі на 699,4 кг, пляціны — 15,3 кг.

**Паводле «Звязды»**

## Што вы пішаце пра нас мы чытаць ня хочам

Журналістаў «Газеты Слонімскай» выклікалі ў пракуратуру. Вольга Шынкевіч й Мікола Кананові даваlі тлумачэньні па сваіх публікацыях, у якіх вялася гаворка пра цяжкае жыцьцё састарэлых людзей. Загадчыца аддзелу працы й сацыяльнай абароны райвыканкаму Кацярына Руткоўская абвінавaціла журналістаў у скажэньні фактаў. Героі матэрыялаў падтрымалі чыноўніцу.

83-гадовы вэтэран вайны некалькі месяцаў чакаў, каб мясцовыя ўлады дапамаглі адрамантаваць дах ягонай хаты. Кананові выяжджаў да пэнсіянэра пасьля яго звароту ў рэдакцыю. А ў пракуратуры ён даведаўся зусім іншае: «Ён нават напісаў такі ліст у райвыканкам, што да ўладаў ня мае ніякіх прэтэнзій. А датычна газэты — маўляў, не зразумеў, зь якой менавіта газэты да яго прыехалі». Дарэчы, дах на хаце, кажа Кананові, яшчэ не адрамантаваны.

Журналістка Шынкевіч распавяла чытачам пра 80-гадовую Надзею Пясецкую, якая жыве ў халупе без сьвятла. Пасьля публікацыі да Пясецкай наведаліся супрацоўнікі сацыяльнага аддзелу й сказалі, што забяруць яе ў дом састарэлых. Дык яна, напалоханая, адраклася таго, што распавядала журналістцы.

**Паводле радыё «Свабода»**

## Дзе ў Беларусі жывуць паганцы?

Пад Лепелем да гэтае пары жывуць у вёсках сапраўдныя паганцы. Кіраўнічка мясцовага аматарскага тэатру Вольга Маханенка распавядае, што ейныя суседзі пакланяюцца валунам і ладзяць пацешныя Цярэшкавы вясельлі. Ва ўторах Зьмеевага каменя людзі пакідаюць амулеты, прысмакі, каралі. Да Рабінавага каменя ля Перуновай гары перад Вялікаднем і Калядамі вяскоўцы ходзяць пакланяцца паганскім багам. Камень падобны да зубра з апушчанай галавой. «Нос» зубра проста адпаліраваны вуснамі. У вёсцы Таранковічы нядаўна трактарыст, аручы зямлю, зачапіў камень, на якім выяўлены чалавек, які ляжыць у чоўне і вяслуе.



Вольга стварыла «зялёны маршрут» для турыстаў — «Край жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў». Пабыць паганцам у лепельскай вёсцы каштуе 25 даляраў з чалавека.

**Паводле «Нямецкай хвалі»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Найлепшы ў сьвеце сеціўны сьледапыт жыве ў Беларусі.

## Мянчук знайшоў усё

Беларус Ігар Маханёк другі год запар стаў пераможцам адкрытага Кубку Яндэксу па пошуку ў Інтэрнэце. Мянчук атрымаў званьне «чалавека, які знайшоў усё».

На ўдзел у спаборніцтвах было зарэгістравана 13 826 чалавек з 50 краінаў. У фінал, які праходзіў 7 сьнежня ў Маскве, выбралі сямёра ўдзельнікаў. Сярод іх чатыры беларусы: бізнэс-аналітык Яўген Міроцін, праграмісты Ігар Маханёк і Аляксандар Ваяводзін, а таксама інжынер-акустык Цім Скарэнка.

Пераможцу 22 гады, ён нарадзіўся ў Менску. Скончыў факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Працуе праграмістам у фірме «Авест».

**Зьміцер Панкавец**

## На «Магіле льва» паставяць праваслаўную царкву

Магілёўскі аблвыканкам дазволіў праваслаўнаму прыходу Сьвятых царскіх пакутнікаў і праведнікаў XX ст. пабудаваць на тэрыторыі магілёўскага замчышча храм-помнік. Будоўлю пачнуць налета. У XII ст. на замчышчы была драўляная царква.

**АГ**

## У гарадзкіх аўтобусах–тралейбусах маюць увесьці турнікеты

Мінтранс не губляе надзеі вынішчыць транспартных

«зайцоў» як від. Разглядаецца новая сыстэма аплаты праезду. Яна падобная да той, што выкарыстоўваецца ў Маскве: у пярэдніх дзьвярах аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў усталёўваюцца турнікеты, прайсьці праз якія пасажыры змогуць толькі з плястыкавай карткай. На ўвядзеньне такой навіны ў менскім гарадзкім транспарце спатрэбіцца 66 млрд рублёў. Ёсьць у яе і мінусы: зьніжаецца хуткасьць транспарту.

**АК**

## Мастакі ратуюць жыцьцё хлопчыку

У памяшканьні Плянэтарыя ў менскім парку імя Горкага прайшло адкрыцьцё дабрачыннай выставы. Менскія мастакі, ініцыятыўная група «Праект+», пры падтрымцы Беларускага саюзу мастакоў, Беларускага саюзу дызайнэраў і Менгарвыканкаму вырашылі падтрымаць 11-гадовага хлопчыка Лёшу Маісеева **(на фота ўнізе)**, які мае тэрміновую патрэбу ў апэрацыі па трансплянтацыі нырак, як вынік хваробы спадчыннага нэфрыту.

Усяго ў Беларусі каля 20 дзяцей, якія чакаюць падобнай апэрацыі. Прычым кожная апэрацыя абыходзіцца прыкладна ў 100 тысячаў даляраў.

Выстава ў Плянэтарыі будзе праходзіць з 8 да 16 сьнежня. Завяршыцца выстава аўкцыёнам, атрыманыя грошы зь якога пойдуць на апэрацыю хлопчыку.

На адкрыцьці Лёша Маісееў шмат усьміхаўся.

**Зьміцер Панкавец**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## СССР перастане існаваць і ў Інтэрнэце

Неўзабаве можа зьнікнуць дамэн .su, які належаў Савецкаму Саюзу. Пра гэта заявіла амэрыканская арганізацыя, якая рэгулюе выкарыстаньне дамэнных зонаў. Лёс дамэна будзе вырашаны ў студзені. Пасьля распаду Чэхаславаччыны выдалілі дамэн .cs, пасьля аб'яднаньня Нямеччыны – усходнямецкі .dd, а зона .zr зьнікла, калі афрыканская рэспубліка Заір была пераназваная ў Конга. Акрамя зоны .su ICANN хоча ліквідаваць брытанскі .gb (на карысьць .uk), югаслаўскі .yu, усходнетыморскі .tp.

Расейская прапуцінская арганізацыя «Нашы», зарэгістраваная ў зоне .su, пагражае ICANN судом.

На сёньня ў зоне .su зарэгістравана 8 тыс. імёнаў, рэальна працуе 6500 сайтаў. У дамэне .ru налічваецца 650 тысяч адрасоў.

Дарэчы, у беларускай зоне .by зарэгістравана 7 тысячаў імёнаў.

**АК**

## Украіна: падазроныя сьмерці дзяцей

Бі-бі-сі мае матэрыялы, якія дазваляюць меркаваць, што ва Ўкраіне здаровых немаўлятаў маглі забіваць у інтарэсах міжнароднага гандлю ствалавымі клеткамі.

Ёсьць відэазапіс пасьмяротнага анатамаваньня расчлененых целаў немаўлятаў, пасьля прагляду якога ўзьнікаюць пытаньні наконт таго, што стала з гэтымі дзеткамі.

У краіне квітнее гандаль ствалавымі клеткамі, узятымі з чалавечых эмбрыёнаў пасьля аборту, — пры тым, што іх эфэктыўнасьць для лячэньня захворваньняў не даказаная.

У 2003 г. улады пагадзіліся на эксгумацыю 30 зародкаў і цельцаў немаўлятаў на могілках, дзе праводзіць пахаваньні раддом №6. Адной з жанчын было дазволена здымаць усё на відэа. Стужку яна передала ў Раду Эўропы і Бі-бі-сі.

На відэа бачна, што ў некаторых немаўлят агаленыя мазгі ці другія органы, адсутнічаюць часткі цела. Гэта не зьяўляецца стандартнай практыкай правядзеньня анатамаваньня пасьля сьмерці і, адпаведна, можа быць зьвязана з вырошчваньнем ствалавых клетак з шпіку.

Прадстаўнікі раддому№6 адкідаюць абвінавачваньні.

**bbcrussian.com**



## Археолягі: Магіла сьвятога Паўла сапраўдная

Ватыканскія археолягі сьцьвярджаюць, што маюць канчатковыя доказы таго, што ў рымскай базыліцы Сьвятога Паўла за Мурамі знаходзіцца сапраўдная магіла Апостала Народаў.

— Мы пэўныя, што ў грабніцы, прызнанай ужо ў IV ст., пахаваны сьвяты Апостал Павал, — паведаміў археоляг Джорджа Філіпі.

Археолягі знайшлі ў месцы ніжэй за галоўны алтар рымскі саркафаг з надпісам «Павал Апостал і Мучанік».

Зьмест саркафагу пакуль не дасьледавалі.

**ВД**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 г. лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Доўгая дарога да храму

Каб жыхар Малога Сітна мог наведаць набажэнства, патрэбны цэлы дзень — да Полацку паўсотні кілямэтраў, а транспарт ходзіць рэдка. Трапіць на пачатак служэньня ў некаторых храмах можна толькі калі заначаваць у горадзе. Пытаюся ў старшыні сельсавету, чаму б не пабудаваць царкву, касьцёл або малітоўны дом у Сітне. «У нас туды ніхто ня пойдзе, — заяўляе мясцовая ўлада, — там жа трэба непітушчыя, сямейныя гаспадары».

Лёгіка жалезабэтонная. Грэшнікі — нашто ім царква? Быціе апрэдзяляет сазнаніе. Памірай, роднае Сітна, у сваім бязбожжы. А храм пабудаваць... Гэта ж грошы ды клопат, а ў выніку — штонядзелю на споведзь.

Галіна Дзьмітрыеўна, якая адмаўляе сіценцам у праве жыць па-хрысьціянску, тлумачыць сваю пазыцыю прынцыпамі рынкавага сацыялізму: маўляў, няма на веру попыту. Менгарвыканкам у справе з царквой «Новае жыцьцё» ідзе далей. Попыт там відавочна ёсьць, дый малітоўны дом вернікі збудавалі самі. Але рашэньне — выселіць! — ужо нават не тлумачыцца якімі-небудзь праўдападобнымі аргумэнтамі. Цяпер вось Горадня. Тысячы парафіянаў ужо які год чакаюць дазволу на будаўніцтва касьцёлу, а абласное начальства ні з пушчы ні з поля ксяндзу ў лоб: ваша паства вас абкрадае... Тутсама 5 гадоў таму зацята цкавалі беларускага праваслаўнага бацюшку Яна Спасюка, а царкву, ім зладжаную, зносілі бульдозэрамі.

Бачыш гэтыя чыноўніцкія, заплылыя тлушчам вочкі, гэтыя трэція-чацьвертыя падбародзьдзі — і літаральна чуеш буркатаньне вялізнага страўніка. Калі вернікі будуюць са свайго цела, паводле Бібліі, храм Духа Сьвятога — дык што за спаруды груваськяць са сваіх тулаваў гэтыя дойліды? Не жывуць, а *спажываюць*. Нашто ім храм? Нашто ім Бог?.. Глядзіш на зубадрабільныя выразы твараў адкормленае бюракратыі — і разумееш, чаму адказам на гэтае застойнае атупеньне ёсьць масавае адмаўленьне ад ежы.

Шматлюдныя галадоўкі пасьля вясны-2006, пачатыя маладафронтаўцамі, падхопленыя незалежнымі прафсаюзамі, разгорнутыя пратэстантамі, каталікамі й партыйцамі, — гэта яшчэ й пратэст супраць сытай абыякавасьці ўсяго грамадзтва, што гатовае трываць рэжым дзеля «стабільнасьці» й адноснага дабрабыту. Галадоўнікі рыхтуюць усе 10 мільёнаў беларусаў да голаду без эўрапейскіх прэфэрэнцыяў і холаду без расейскага газу. Гэта — своеасаблівы

## ХРОНІКА

### 6 сьнежня

#### Ціск на палітвязьня Фінькевіча

Увечары супрацоўнікі магілёўскае папраўчае ўстановы адкрытага тыпу зрабіліператрус асабістых рэчаў у палітвязьня **Артура Фінькевіча**. Артур мяркуе, што мэтайператрусу быў мабільны тэлефон.

#### БРСМ вядзе датэрміновую агітацыю?

Практычна ва ўсе паштовыя скрыні выбарчай акругі, на якой балятуецца патэнцыйны кандыдат у дэпутаты ў Слуцкі гарсавет, **старшыня Менскага абласнога камітэту БРСМ Руслан Трухан**, закінутыя ўлёткі, якія ўтрымліваюць падрабязныя біяграфічныя зьвесткі «камсамольца»-актывіста, а таксама некалькі яго фатаздымкаў.

### 7 сьнежня

#### Справа Воўчака спыненая

Адміністрацыйная справа супраць праваабаронцы **Алега Воўчака** спыненая ў сувязі з заканчэньнем тэрміну даўнасьці. Такое рашэньне прыняў 7 сьнежня судзьдзя Кастрычніцкага раёну Менску **Сяргей Герасімовіч**. Справа ў дачыненьні А.Воўчака была заведзеная па арт. 193-5 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях (невыкананьне парадку ўжываньня мераў эканамічнай палітыкі і іншых абмежаваньняў падчас перавозу тавараў праз мяжу). Праваабаронцу пагражаў штраф ад 50 да 300 базавых велічынь.

#### Дашкевіча накіравалі ў Шклоў

Лідэра незарэгістраванага «Маладога Фронту» **Зьмітра Дашкевіча** накіравалі адбываць пакараньне ў калёнію ўзмоцненага рэжыму №17 у г. Шклоў Магілёўскай вобласьці. Зроблена гэта было да разгляду касацыйнай скаргі.

#### Не пусьцілі польскіх і ўкраінскіх актораў

Міжнародную тэатральную трупу не пусцілі ў Беларусь з спэктаклем паводле твору Сьвятланы Алексіевіч «Чарнобыльская малітва». Візыт тэатру ў Гомельскую вобласьць быў заплянаваны на 6—7 сьнежня. Беларускія мытнікі двойчы адмовілі акторам **польскага «Teatr Biuro Podrozy»** і тэатра **«Арабескі» з Украіны** ў перасячэньні мяжы. Прычынай гэтаму — нібыта няправільна аформленыя дакумэнты на правоз дэкарацыяў.

#### «Витебский курьер» выгналі

Рэдакцыя незалежнай грамадзка-палітычнай газэты **«Витебский курьер»** атрымала пісьмовы загад ад свайго арэндадаўцы ААТ «Элсан» — пакінуць памяшканьне, займанае рэдакцыяй, на працягу двух сутак.

### 8 сьнежня

**Царква «Новае Жыцьцё»** атрымала ліст з Упраўленьня ўнутраных справаў Адміністрацыі Цэнтральнага раёну Менску за подпісам **начальніка ўпраўленьня В. Сінякова**. У лісьце паведамляецца, што царкве адмоўлена ў завядзеньні крымінальнай справы ў дачыненьні да **журналісткі Л.Джураевай**, а таксама ўдзельнікаў яе сюжэту **А.Рабіцавай і І.Янушкевіча**. Нагода — адсутнасьць у дзеяньнях апошніх прыкметаў злачынства.

Днём раней у прэзыдыюме **Вышэйшага гаспадарчага суду** (ВГС) прайшлі папярэднія слуханьні па справе царквы «Новае жыцьцё», на якім бакі выказалі патрабаваньні і ўдакладнілі свае пазыцыі. **Менгарвыканкам** пазыцыі не зьмяніў. Гэта пацьвердзіў прадстаўнік Менгарвыканкаму **юрысконсульт Камітэту па землеўпарадкаваньні Ігар Касьпяровіч**. Ён дадаткова адзначыў, што «царква як уласьнік памяшканьня ня мела права выкарыстоўваць яго (памяшканьне) ні ў які спосаб». Варта нагадаць, што ВГС распачаў разгляд гэтай справы ў першай інстанцыі пасьля таго, як 4 лістапада прэзыдыюм ВГС адмяніў папярэднія рашэньні Менскага гаспадарчага суду адносна царквы.

#### Памежнікі адмаўляюцца аддаваць пашпарт сыну Мілінкевіча

Сын лідэра аб'яднаных дэмакратычных сіл **Аляксандра Мілінкевіча** (таксама Аляксандар) зьявіўся ва Упраўленьне кантрольна-прапускных пунктаў, дзе, паводле абяцаньняў Дзяржаўнага камітэту памежных войск, яму павінны былі вярнуць адабраны 29 лістапада пашпарт. Аднак замест пашпарту сын палітыка атрымаў дзьвюхгадзінны допыт. Памежнікаў цікавіла, якім чынам ягоны пашпарт апынуўся ў бацькі.

*нацыянальны пост*, які новы беларускі рух трымае перад пакаяньнем усяго народу.

Так, усе падзеі найноўшай беларускай гісторыі маюць свой духоўны зьмест. Як і знакаміты біблійны выхад з эгіпецкага рабства быў толькі пачаткам шляху да зямлі абяцанай, так і беларускі *рух за свабоду* мусіць прайсьці праз устрыманьні, пакуты й выпрабаваньні.

Доўгая беларуская дарога да храму — гэта ўсё тое ж блуканьне ў пустыні. Галадаваньне. Смага. Трываньне. Пакланеньне чужым багам і бясконцае выяўленьне, хто тут галоўны. Сутычкі з супраціўнікамі. Страх. Пакаяньне. І ўсё-такі ўрэшце — новая краіна.

Доўга, доўга атрымліваецца. Але іншага шляху ў нас, як і ў габрэяў часоў Майсея, няма. У Беларусі, паводле сьведчаньня Васіля Быкава, доўгая дарога дадому.

Мы ўсё чакаем, пакуль Расея падвысіць кошт на газ, і люд нешта зразумее. Мы спадзяемся, што эўрапейскія санкцыі прымусяць прыхільнікаў Лукашэнкі думаць інакш. Мы марым, каб Захад або Усход чароўна наблізілі нас да храму Новае Беларусі: раз — і мы пры дзьвярох... Але сваю дарогу да храму кожны чалавек і кожны народ мусіць прайсьці самастойна. Гэта справа нашага сумленьня й нашае веры — адолець адлегласьць і целам, і душою, і духам.

О, як далёка нам яшчэ да Беларусі?

Можна пачакаць.

А можна рушыць.

Парадаксальна — але тыя, хто не выходзіў з былога кароўніка ў Сухараве, і тыя, хто галадаваў разам з ксяндзом Аляксандрам Шэметам ў гарадзенскай капліцы, дабраліся далей, чым зборшчыкі подпісаў на мясцовых выбарах, што абыходзілі сотні кватэраў. Хрысьціяне перамаглі — бо ішлі духовым шляхам. Наўпрост. Малітва, вера, пост у сёньняшняй Беларусі даюць эфэкт куды большы, чым грошы, рэйтынг альбо піяр.

Пакуль апазыцыя без асаблівага энтузіязму выходжвае чарговую кампанію ды замірае ў прадчуваньні чарговага кангрэсу — беларускія хрысьціяне ствараюць сапраўдны фронт змаганьня, быццам фартэцыі, адстойваючы й будуючы храмы.

Так у цэнтар грамадзкага жыцьця ў Беларусі зноў вяртаецца храм. Ня газавая труба, ня гіпэрмаркет і не партыйны офіс — хрысьціянская сьвятыня, якая тысячу гадоў была сэрцам гэтае краіны.

Асноваю новай альтэрнатывы — ідэйнай, грамадзкай, палітычнай — у Беларусі робяцца, як і належыць, хрысьціяне. Тыя, хто ідзе да храму, вядуць усю краіну да нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

Сваю дарогу да храму кожны чалавек і кожны народ мусіць прайсьці самастойна.

## ХРОНІКА

### Страйк на абутковым прадпрыемстве «Чырвоны кастрычнік»

Атрымаўшы разьліковыя квіткі **супрацоўніцы «Чырвонага кастрычніка»** ўбачылі, што іхныя заробкі за мінулы месяц зьменшыліся прыкладна на 100 тысяч рублёў. Гэта і сталася асноўнай прычынай страйку. Работніцы скардзіліся таксама на дрэнныя ўмовы працы: у іх не прадугледжаны перапынак на абед, працаваць даводзіцца і ў выходныя. Свае патрабаваньні шаўчыхі выклалі ў лісьце дырэктару «Чырвонага кастрычніка» й паведамілі пра страйк адміністрацыі. Аднак ніхто з начальства да іх у цэх не прыйшоў.

### Вэрбавалі ў КДБ

Бабруйскага дзеяча **Ігара Хоцьку** выклікалі на размову ў мясцовае КДБ. Выклікалі яго туды яшчэ зь лета, але сп.Хоцька адмаўляўся па прычыне занятасьці. На гутарку пайшоў пасьля таго, як падаў дакумэнты на рэгістрацыю яго кандыдатам у дэпутаты мясцовага савету і атрымаў чарговае тэлефоннае запрашэньне. **Намесьнік начальніка Бабруйскага КДБ** прычыны выкліку актывісту так і не патлумачыў, але, са словаў, прапанаваў супрацоўніцтва ў абмен на дэпутацтва.

### 10 сьнежня

### Апэрацыя «перахоп»

10 сьнежня напярэдадні заплянаванай акцыі салідарнасьці з Аляксандрам Казуліным і іншымі палітзьняволенымі на Кастрычніцкай плошчы ля сядзібы БНФ міліцыянтамі ў цывільным быў затрыманы намесьнік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) **Аляксей Кароль**. У пастарунку Савецкага раёну палітыку патлумачылі, што адбываецца апэрацыя «Перахоп», а сам ён «нібыта падобны да таго, хто скраў аўтамабіль», заявілі палітыку ў міліцэйскім пастарунку Савецкага раёну. Пасьля таго, як акцыя салідарнасьці была жорстка разагнаная сілавікамі, Аляксей Кароль быў адпушчаны. Ля сядзібы БНФ таксама былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Франак Вячорка**, **Максім Велімовіч** і **Сяргей Карповіч**, на якіх склалі адміністратыўны пратакол па арт. 172.3 КаАП — распаўсюд друкаванай прадукцыі, зьмест якой наносіць шкоду дзяржаўнаму ладу, правам і законным інтарэсам грамадзянаў. Хлопцы раздавалі паведамленьне спэцдакладчыка ААН па Беларусі Адрыяна Севярына. Адміністрацыйныя пратаколы будзе разглядаць адміністрацыйная камісія, санкцыі па дадзеным артыкуле прадугледжваюць штраф да 5 базавых адзінак.

У часе разгону акцыі салідарнасьці з палітзьняволенымі ў раёне Кастрычніцкай плошчы былі затрыманыя: **Бяляцкі Алесь, Стэфановіч Валянцін, Лябедзька Анатоль, Каліта Алесь, Палевікова Валянціна, Сербантова Арына, Міклашэвіч Сяргей, Касянік Ліна (1931 году нараджэньня), Лаўрыновіч Аляксандар, Жураўлёва Вольга, Багдановіч Раман, Мельнік Аляксей, Ясюк Алеся, Верацінскі Генадзь, Латушкін Дзьмітры, Іўлеў Аляксандар, Каршукоў Мікалай, Рыжкоў Юрась, Ліпень Антон, Макаеў Аляксандар, Чайкоўскі Павал, Корбан Алег, Сяргееў Уладзімер, Федарук Зьміцер.**

Расьцяжкі «Свабоду Казуліну!» зьявіліся 10 сьнежня, у Дзень правоў чалавека, у Менску і Барысаве.

### 11 сьнежня

### Трох юнакоў пакаралі арыштам

**Судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Аляксей Бычко** вынес вырак: **Алег Корбан** і **Зьміцер Хведарук** павінны адбыць 15 сутак адміністрацыйнага арышту, **Уладзімер Сяргееў** – 3 сутак за ўдзел у пікеце 10 сьнежня.

### 12 сьнежня

### Высяленьне «Бацькаўшчыны»

У Гаспадарчым судзе Менску адбылося чарговае пасяджэньне па справе **МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»**. **Судзьдзя Мельнікава** пастанавіла адмяніць асноўны пазоў **КУП «Менская спадчына»** да МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» аб скасаваньні арэнды, а таксама сустрэчны пазоў «Бацькаўшчыны» да арэндадаўцы. Прычына ануляваньня зыскаў у судзе не была прадстаўленая. Матывацыйную частку судовага рашэньня ўдзельнікі спрэчкі атрымаюць у найбліжэйшы час поштай.




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Здымак на памяць з нашаніўцамі. У цэнтры — Андрэй Дынько і Даніла Жукоўскі. З газэтай — Андрэй Хадановіч.**

# «НН» на Магілёўшчыне

## Прэмія «ARCHE» — Данілу Жукоўскаму

Месяц скончыўся для рэдакцыі «НН» на колах — 30 лістапада чарговыя сустрэчы з чытачамі прайшлі ў Бялынічах ды Магілёве. Гэта была ня толькі імпрэза, прысьвечаная стагодзьдзю газэты, — у Магілёве ўручылі штогадовую прэмію часопісу «ARCHE» — «За сумленнае слова». Яе сёлетні ляўрэат, гарадзенскі крытык Даніла Жукоўскі, дабіраўся да Магілёва праз усю Беларусь.

Сустрэча ў Бялынічах была камэрнай, праходзіла ў прыватным доме. Сьціслая гутарка (час падціскаў — трэба было сьпяшацца ў Магілёў), няяркае сьвятло, гарбата, печыва. Наведнікаў цікавіла, чаго вартая ідэя ўдзельнічаць у мясцовых выбарах, а таксама чаго чакаць ад новага Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Людзі запытваліся, чакаючы ясната адказу на гэтыя заблытаныя пытаньні. У іх вачах быў спадзеў на газэту як на апошняга дарадцу, які дапаможа разабрацца ў заблытанай апазыцыйнай палітыцы.

Грамада ў Магілёве цярпліва дачакалася прыезду гасьцей, хоць тыя ладна спазьніліся праз паломку аўтамабіля. Заля была паўнюткая — на сустрэчу прыйшло больш за восемдзесят чалавек. Найбольш — моладзь.

Пасьля афіцыйнай часткі ды сьпяваньня нашаніўскага гімну «Не загаснуць зоркі ў небе» ў келіхі палілося шампанскае. Андрэя Дынька абкружылі хлопцы, пытаючыся пра гарачыя пытаньні палітыкі, Андрэй Хадановіч узяў на сябе націск дзяўчатаў, якія раіліся з паэтам пра слушнасьць выкарыстаньня трасянкі ў лірыцы.

Хоць насамрэч толькі два чалавекі з сталага рэдакцыйнага калектыву (Андрэй Дынько ды Алесь Кудрыцкі) выбраліся ў вандроўку, віртуальна на сустрэчы з чытачамі прысутнічала амаль уся рэдакцыя: у Бялынічах ды Магілёве прайшла прэм'ера дакумэнтальнага фільму «Наша Ніва» і нашаніўцы».

Гэтыя дзьве сустрэчы з чытачамі былі дужа розныя па форме, але падобныя па атмасфэры. Не пашанцавала хіба журналістам, якія пачалі актыўна тэлефанаваць, спрабуючы атрымаць камэнтар у новага ляўрэата прэміі «ARCHE». Той усяляк унікаў разгорнутых камэнтароў ды выказваньня сваіх эмоцыяў. Такі ён, Даніла Жукоўскі.

**Алесь Кудрыцкі**

# Балючае пытаньне элітарнасьці

«Ствараючы паводку інфармацыі задарма, капіталізм зусім ня дбае задарма вучыць працаваць з гэтай стыхіяй». Прамова **Данілы Жукоўскага** на ўручэньні прэміі часопісу «ARCHE» «За сумленнае слова».

Шаноўнае спадарства!

Ад першага дня знаёмства з часопісам я ведаў, што хачу сказаць прыхільнікам «ARCHE», але, калі нагода зьявілася, паўстала пытаньне, як гэта зрабіць. З чаго пачынаць. Задачу спрасьціў спадар Булгакаў, калі ў часе нядаўняй інтэрнэт-канфэрэнцыі ва ўласьцівай яму правакацыйнай манеры абрынуўся на вялікую расейскую культуру ды абвясьціў, што інтэлектуалістыка робіцца для эліты. Дзякуючы яму я магу скарыстаць з улюбёнага прыёму — крытыкі.

Што такое эліта? Людзі, якія маюць вагу ў вачах грамадзтва — настолькі вялікую, што ўжо не патрабуюць даводзіць публічна, што маюць вагу. Людзі, якія нясуць (і адчуваюць!) адказнасьць за тое, што адбываецца, але робяць справаздачу толькі перад роўнымі сабе.

Сумняюся, што інтэлектуалістыка прызначаная для іх. Яна патрабуе часу і ўвагі, але які, я пытаюся, вынік? Ці дапамагае гэткае чытаньне, ці спрашчае прыняцьце важкіх рашэньняў? Хутчэй не: ускладняе малюнак, дадае сумненьняў, пашырае межы праблемаў. Ня столькі дапамагае ў канкрэтных пытаньнях, колькі ўзбагачае сьветагляд.

Натуральны адрасат гэткіх твораў — людзі з пэўным узроўнем культуры і спэцыфічным сьветаўспрыманьнем, калі вялікая каштоўнасьць надаецца дакладнаму веданьню. А гэтая жарсьць часьцей ахоплівае тых, хто мае абмежаваны доступ да інфармацыі й не бярэ удзелу ў прыняцьці важкіх рашэньняў. Тых, каму даводзіцца толькі **здагадвацца**.

Інтэлектуальны тэкст паўстае з агульнадаступных ведаў, але дорыць адчуваньне эксклюзіўнасьці. Эліта не патрабуе гэткага падарунку.



Даніла Жукоўскі
інжынэр і літаратурны крытык з Горадні

Юлія Дарашкевіч

Кола патэнцыйных чытачоў «ARCHE» і падобных да яго выданьняў большае за эліту, хаця й не настолькі «арыстакратычнае». Прычына — ствараючы паводку інфармацыі ледзь не задарма, капіталізм зусім ня дбае задарма вучыць працаваць з гэтай стыхіяй. Тое, што колькасьць — яшчэ ня якасьць, даводзіцца спасьцігаць. А гэткія цяжкасьці спрыяюць цікаўнасьці да тых выпадкаў, калі нехта больш-менш сумленна спрабуе нешта **растлумачыць**.

Сама інтэнцыя — старанна тлумачыць, падрабязна абмяркоўваць, усебакова разглядаць — уяўляе вялікую самастойную каштоўнасьць. У адрозьненьне ад савецкіх часоў з жорсткімі межамі дазволенага, каштоўнасьць гэтая ссоўваецца з ідэалёгіі на мэтадалёгію. У той час інтэлектуальныя тэксты вучылі найперш сьмеласьці і незалежнасьці меркаваньняў, сёньня яны найперш фармуюць крытэры аб'ектыўнасьці й добрасумленнасьці.

Беларускі дыскурс перасычаны спасылкамі на элітарнасьць. З пазыцыяў добрасумленнасьці й аб'ектыўнасьці я прапанаваў бы зьвярнуць увагу на патрэбу дэгераізацыі.

На мой погляд, неабходна больш казаць пра нацыянальны характар беларуса. Гэта, напэўна, узбурыць як прыхільнікаў рамантычнага стэрэатыпу ад Караткевіча — талерартнага эўрапейскага беларуса, гэтак і тых, хто залічвае сябе да шэрагаў гэтага народу, ня тлумачы галавы летуценьнямі пра Вялікае Княства Літоўскае і Берасьцейскую унію. Але усё вастрэй адчуваецца неабходнасьць даць характарыстыку сучасьніку, які штодня ўчынкамі пацьвярджае вернасьць шляху, якім рухаецца наша грамадзтва апошнія 15 год. Беларусу, пра якога напісаў Пётра Рудкоўскі ОП у артыкуле «Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці» («ARCHE». 2005. №1—2): «Маем справу з маўклівасьцю, за якой хаваецца фундамэнтальная неталерантнасьць і агрэсія ў стасунку да «іншых». Беларусу, абыякава-варожаму да лібэральных уяўленьняў пра культуру і дэмакратыю, але рашучаму ў паляпшэньні свайго дабрабыту.

Акрамя захапленьня маляўнічай гісторыяй, трэба шукаць адказы на пытаньне, якое гэтак хораша сфармуляваў герой «Лябірынтаў» В.Ластоўскага: «Чаму ж усё гэта заняпала, чаму забыта?» Спадчына ВКЛ і Рэчы Паспалітае мае свой цёмны бок, нібы тая сіла ў сэрыяле «Зоркавыя войны». Пара, на мой погляд, больш зьвяртаць увагі на тое, як імкненьне да ідэалаў залатой вольнасьці ператваралася ў непавагу да пісанага закону ды гатоўнасьць прыніжацца перад кожнай намацвальнай уладай, недавер да дзяржаўных інстытуцыяў прывучаў да шэрай эканомікі ды кліентальных адносінаў, а непрызнаньнем аўтарытэтаў выхоўвалася схільнасьць да самаразграшэньня й бязьмежны маральны рэлятывізм.

Нарэшце, неабходна гаварыць пра прыдатнасьць інтэлектуалаў да абранай ролі — праз ацэнку іхняга творчага даробку. Хаця праблема гэта больш камэрная, але адлегласьці паміж аб'ектамі больш сьціплыя, адпаведна ўзровень жарсьцяў нашмат большы. Пакуль мы будзем бачыць праблему ў вялікай расейскай культуры і сарамліва — і вельмі па-беларуску — не заўважаць, што народны паэт Беларусі ледзьве не гадзіну, нібы так і трэба, выслухоўвае камплімэнты, ад якіх пачырванеў бы халіф багдадзкі, выступы, перад якімі блякне прамова незабыўнага Леаніда Ільліча Брэжнева перад уласным помнікам, цяжка спадзявацца, што мы выйдзем зь лябірынту.

Усё гэта ня менш, а больш важна, чым выкрутасы бягучай палітыкі, бо на гэтым грунтуюцца ўсе сацыяльныя зьявы. Тут змаўчаць і застацца на пазыцыях інтэлектуалаў — немагчыма. Бо калі інтэлектуальныя тэксты вабяць перш за усё мэтадалягічна, цікавасьць і давер да іх ці ня цалкам залежаць ад пасьлядоўнасьці аўтара.

Дзякую за ўвагу.

# Дэпрэсіі распаўсюджаныя

Месяц бяз сонца. Зіма ніяк ня прыйдзе, разам зь ёю зацягнулася забойчая восеньская дэпрэсія. Сродак ад дэпрэсіву — не маўчыце і шукайце добрае паўсюль, раіць доктар аддзяленьня памежных станаў менскага гарадзкога псыханэўралягічнага дыспансэру Ігар Сарокін.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Ці ўплывае такое надвор’е — больш за месяц бяз сонца, у тумане — на людзей?**

**Ігар Сарокін:** Клімат і надвор’е, безумоўна, уплываюць на людзей. І дакладна вызначаным чынам. Тым больш гэтая зьява характэрная ня толькі для Беларусі. Як па мне, то сёньняшняе надвор’е цалкам беларускае і натуральнае. Увогуле ў паўночных шыротах паводле тэмпэрамэнту і пэўных схільнасьцяў да псыхалягічных паталёгіяў людзі маюць свае адметнасьці: яны больш уразьлівыя да дэпрэсіўных парушэньняў. На поўдні людзі больш актыўныя і тэмпэрамэнтныя, маюць экспрэсіўны характар. Дэпрэсіі здараюцца і тут, але найбольш яны распаўсюджаныя на поўначы. Такія асаблівасьці характару паўночнага чалавека абумоўліваюць і павышаную схільнасьць да самагубства.

**«НН»: Ці мае Беларусь тут свае адметнасьці?**

**ІС:** Так, паводле дасьледаваньняў псыхалягічнай службы, штогод у Беларусі праз самагубства гіне каля 3000 чалавек. У 2004 г. сярэдні паказчык па Беларусі дасягнуў 33,5 выпадкаў на 100 тыс. жыхароў. Гэта амаль удвая перавышае сярэдні сусьветны паказчык. Рост колькасьці суіцыдаў назіраецца ў Гомельскай і Магілёўскай вабласьцях. У іншых рэгіёнах, на шчасьце, адбываецца паніжэньне. У Менску гэтая лічба 2 гады таму складала — 16,7. Калі браць сусьветны досьвед, то самагубства робіцца другой прычынай сьмерцяў пасьля аўтакатастрофаў. Паводле зьвестак Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя, да 2020 г. дэпрэсія выйдзе на 2-е месца па інвалідызацыі насельніцтва пасьля сэрцавых захворваньняў.

> Паказчык самагубстваў у Беларусі ўдвая перавышае сярэдні сусьветны. Рост колькасьці суіцыдаў назіраецца на Гомельшчыне і Магілёўшчыне. У іншых рэгіёнах яна зьніжаецца.

**«НН»: Традыцыйна ў гэтай справе наперадзе скандынаўскія краіны з суворым кліматам.**

**ІС:** Ёсьць адпаведная шкала — высокім лічыцца ўзровень самагубстваў у той краіне, дзе сярэдняя лічба складае 20 выпадкаў на 100 тыс. чалавек. Да такіх краінаў належаць і Данія, і Літва, і Эстонія, і Расея з паўднёвай Украінай. Да сераднякоў належаць ЗША і скандынаўская Швэцыя.

**«НН»: Што здараецца з чалавекам у такія змрочныя дні, як цяпер?**

**ІС:** Зьяўленьню дэпрэсіі спрыяе ў тым ліку і малая колькасьць сонечных дзён. Ёсьць розныя віды дэпрэсій, напрыклад, тая, што абвастраецца менавіта ў зімовы час ці позьняй восеньню. Змагацца з гэтым можна пры дапамозе салярыю ці штучнага падаўжэньня дня — выкарыстаньня лямпаў дзённага сьвятла.

Любая перамена надвор’я спрыяе таму, што ў часткі людзей пачынае праяўляцца г.зв. вэгетацыйная няўстойлівасьць. Яе сымптомы самыя розныя: сухасьць у роце ці павялічанае сьлінавыдзяленьне, паскоранае ці запаволенае сэрцабіцьцё, цяжкае ці лёгкае дыханьне, пачуцьце трывогі і г.д.

Існуе від дэпрэсіўнага разладжваньня настрою, які ў першую чаргу праяўляецца ў зімовы час. У адсутнасьць сонца ў арганізь-

# на поўначы

ме бракуе каталізатараў біягеннага абмену — мэлятаніну, норадрэналіну, сэратаніну, якія таксама моцна ўплываюць на наш настрой.

**«НН»: Ці аднолькава такое надвор’е ўплывае на гараджанаў і вяскоўцаў?**

**ІС:** Розьніца ёсьць. Тут мы таксама мала падобныя да іншых. Калі сусьветная практыка сьведчыць пра большую схільнасьць да дэпрэсіяў ды самагубстваў у гарадзкіх жыхароў, то ў Беларусі ў гэтай сфэры наперадзе вяскоўцы. Не ратуе і блізкасьць да прыроды. Галоўная прычына — адсутнасьць сталага занятку зімой і татальнае п’янства. Неяк чуў на «Свабодзе» эсэ пра тое, што беларус звычайна працуе, калі не працуе, то п’е, калі ня п’е і не працуе, то пачынае нудзіцца. Вельмі трапная характарыстыка. Сярод сельскіх падлеткаў вельмі шмат парасуіцыдаў, то бок спробаў зрабіць сабе сьмерць, сярод сталых вяскоўцаў пераважаюць сапраўдныя самагубствы. Гэта, як правіла, людзі, што ўжо выгадавалі дзяцей і засталіся самотныя. Цяперашняя вясковая моладзь, трапіўшы ў горад, хутка забываецца на бацькоў.

**«НН»: А як жа сумныя гарадзкія пэйзажы, шэрыя «спальнікі»? У Маскве ўжо задумаліся, разьмяшчаюць шмат каляровай рэклямы, фарбуюць у весялейшыя колеры фасады будынкаў.**

> У адсутнасьць сонца ў арганізьме бракуе каталізатараў біягеннага абмену — мэлятаніну, норадрэналіну, сэратаніну, якія ўплываюць на наш настрой.

**ІС:** Так, слушная практыка, якую трэба разьвіваць. На поўначы Эўропы гэта шырока выкарыстоўваецца. Там і ў малых гарадох фарбуюць свае дамкі ў яркія колеры, наколькі магчыма, каб пазьбегнуць шэрасьці.

**«НН»: Хто больш схільны да дэпрэсіяў — мужчыны ці жанчыны?**

**ІС:** Увогуле парушэньні настрою часьцей сустракаюцца ў жанчынаў. Калі браць агульна, то суадносіны прыкладна такія: на аднаго мужчыну прыходзіцца 2—3 жанчыны. Але гэта агульна, бо ёсьць розныя формы парушэньняў, і таму суадносіны гэтыя могуць зьмяняцца.

**«НН»: Ці ёсьць у нас своеасаблівыя групы рызыкі — дэпрэсіўна небясьпечныя прафэсіі?**

**ІС:** Дакладных зьвестак ня маю, але такія групы рызыкі існуюць. І ў прафэсійным пляне паводле ліку парушэньняў і самагубстваў пераважаюць мэдыкі, псыхіятры ў першую чаргу.

**«НН»: А як людзі культуры — паэты, мастакі, музыкі?**

**ІС:** Багема — вельмі своеасаблівая субкультура. Для яе прадстаўнікоў таксама характэрныя самыя розныя парушэньні, у тым ліку і схільнасьць да суіцыду. Болей за тое, тут можна вылучыць асобны від самагубства — эгаістычны. Гэта калі творчая асоба максымальна індывідуалізуецца. Яна мае пэўныя амбіцыі, але ня можа інтэгравацца ў свой асяродак, замацавацца, давесьці сваю выключнасьць і асаблівасьць. Такое самагубства робіцца ў імя самасьцьвярджэньня. Гэта найбольш характэрна для заходняй гарадзкой культуры, дзе людзі часта дэзынтэграваныя, ня маюць моцных сацыяльных повязяў. На Ўсходзе трохі інакш. Там людзі аб’яднаныя сямейнымі, рэлігійнымі ды іншымі сувязямі, і прычынай самагубства можа быць выгнаньне зь сям’і за нейкую правіну.

**«НН»: Ці застаецца крыніцай стрэсу ў Беларусі моўнае пытаньне?**

**ІС:** Напэўна. Я і сам часта з гэтым сутыкаюся. Калі я на працы, то яшчэ магу давесьці пацыенту, што гэта яго праблема, калі ён не разумее беларускай мовы. І, дарэчы, за сваю 10-гадовую беларускамоўную практыку ў мяне былі адзінкавыя выпадкі, калі пацыенты адмаўляліся ад маіх паслугаў праз непрыняцьце беларускай мовы. Іншая рэч, калі я, як адзін са шматлікіх, напрыклад, пакупнікоў у краме, запытаю воцат. Тут можна шмат і рознага пачуць у свой адрас і, натуральна, атрымаць стрэс. Гэтая праблема ўсё яшчэ актуальная.

**Гутарыў Сямён Печанко**

**Як супрацьстаяць зімовай дэпрэсіі?**

Ва ўсім шукайце пазытыў, каб адолець самоту. Ён прысутнічае ў любой сытуацыі.

Па-другое, нам падвышае настрой, калі мы на вышыні: добра выглядаем, карыстаемся новай і прыгожай касмэтыкай, модна апранаемся і г.д. Гэта вонкавая стымуляцыя настрою. З другога боку, уздымае тонус прафэсійны посьпех: напрыклад, настаўніка, які добра падрыхтаваўся да занятку, дзеці ня толькі ўважліва слухаюць, але й засыпаюць пытаньнямі — па цяперашнім часе нечуваная рэч.

Натуральнае асяродзьдзе добра ўплывае на настрой. Трэба часьцей бываць у лесе, на вольным паветры. Не ля тэлевізара сядзець, які, дарэчы, вельмі моцна разьядноўвае людзей і робіцца дадатковай крыніцай стрэсу.

Любыя кантакты з высокім мастацтвам увачавідкі паляпшаюць настрой чалавека, робяць яго больш ураўнаважаным. Карысна проста добрую кніжку пачытаць. Калі не мастацтва, то спорт.

На жаль, часьцяком у нашым грамадзтве ўласную значнасьць падмацоўваюць прыніжэньнем іншых — сваіх сямейнікаў, калегаў, падначаленых. Гэта ня выйсьце.

Самае ж галоўнае — не заставацца сам-насам з праблемаю. Трэба выгаварыцца. І неістотна каму, хоць выпадковаму мінаку. У чалавечай прыродзе закладзена: калі выгаварысься — стане лягчэй, праблема страціць першапачатковы цяжар. Калі не, то ўнутраны стрэс акумулюецца, нарастае, як сьнежны ком, і можа прывесьці да трагічнай разьвязкі.

І ні ў якім разе не шукайце выйсьця ў алькаголі. Гэта вельмі кароткатэрміновы паратунак.

У складаных выпадках, калі чалавек ня можа сам сабе даць рады, неабходная дапамога адмыслоўцаў. У Беларусі створаныя і дзейнічаюць цэнтры памежных станаў. У кожнай паліклініцы працуе псыхатэрапэўт, які акажа вам кваліфікаваную дапамогу.



# Наступны мусіць памерці?

Галадоўка Казуліна, пры ўсёй павазе да мужнасьці, пакінула дваістае ўражаньне. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Аналітык Уладзімер Роўда лічыць, што такі самаахвярны крок ёсьць маральным узорам для апазыцыі. Маўляў, былы рэктар мае шанец стаць бясспрэчным лідэрам і нарэшце яе згуртаваць.

А вось палітоляг Юры Чавусаў кажа: «Хацеў бы паглядзець у вочы таму, хто параіў вылучыць менавіта гэтыя патрабаваньні!»

Сапраўды, калі пакінуць убаку высокую тэму гераізму, то застаецца прагматычнае пытаньне аб мэтах, сродках і выніках.

«Элемэнтарнае правіла любой галадоўкі палягае ў тым, што патрабаваньні мусяць быць выканальнымі», — нагадвае Чавусаў.

Так, калі вернікі змагаюцца за храм ці права яго пабудаваць, то дамагчыся свайго цалкам рэальна. І мы нядаўна гэта бачылі.

А што тут?

Ці верыў хто хоць на грам, што высокае начальства пацярушыць галаву попелам: каемся, нелегітымныя мы! Сыходзім, вось вам ключы ад кабінэтаў!

Астатнія ж патрабаваньні — і ўвогуле не да кіроўных вярхоў.

Што, Лукашэнка мусіць яднаць апазыцыю? Ці ставіць пытаньне пра свой рэжым у Радзе бясьпекі ААН?

Так, палітрада АДС праштампавала нейкія паперы, прадыктаваныя найперш, мусіць, меркаваньнямі гуманізму (чалавек за кратамі між жыцьцём і сьмерцю).

Камэнтатары адзначалі, што з апазыцыйнага кіраўніцтва жонка Казуліна выцягвала заявы ледзь не абцугамі.

Ці паспрыяла гэта хоць на каліва рэальнаму згуртаваньню?

Нарэшце, экспэрты адразу падкрэсьлілі, што «беларускае пытаньне» ня ёсьць кампэтэнцыяй Рады бясьпекі ААН. Нефармат!

Натуральна, пагроза канкрэтнаму чалавечаму жыцьцю падштурхнула міжнародную супольнасьць прыняць колькі там рэзалюцыяў.

Аднак ці адбудзецца прарыў у беларускім пытаньні?

Праблема, бадай, ня столькі ў недахопе ўвагі да яго, колькі ў браку рэальных вагароў узьдзеяньня.

І вырашаецца гэтая праблема не галадоўкамі. Яна ёсьць прадметам карпатлівай і, калі хочаце, пераважна лятэнтнай дзейнасьці палітычных гульцоў ды паліттэхнолягаў.

Увогуле ў палітыцы мусіць быць моцны прагматычны, тэхналягічны чыньнік. А вось ім найспрытней карыстаецца менавіта ўлада. Дзейнасьць жа, назавем умоўна, дэмакратычных сілаў грашыла дый па сёньня грашыць рамантызмам.

У нашым выпадку аналітыкі адзначаюць і такі момант, як дэвальвацыя самой зьявы галадовак. Сапраўды, папершае, грамадзтва слаба інфармаванае. Па-другое, яно збольшага занадта інэртнае, апалітычнае, каб можна было запаліць масу адным палымяным сэрцам Данка. Па-трэцяе, як ні цынічна, народ прызвычайваецца да вестак пра тое, што зноў нехта скарыстоўвае такі вось пратэставы экстрым.

Юры Чавусаў зазначае: наступнаму палітычнаму галадоўніку застаецца хіба пайсьці на сьмерць!

Варта шукаць іншы грунт, іншыя мэтады.

Дзеля перамогі над сыстэмай патрэбны ня толькі гераізм марскога пяхотніка, але й інтэлект прафэсара Казуліна, дай яму бог здароўя!



Лявон Вольскі і Міхал Анемпадыстаў.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Фэльетон Лёліка Ушкіна.

# Мой адрас ня дом і ня вуліца...



Пабачыўшы на НТВ інтэрвію аднаго вядомага палітычнага мужа наконт таго, якім вялікім сымпатыкам СССР ён быў і ёсьць, падумаў: калі б той палітык меў дзёньнік, старонка за 8 сьнежня 1991-га выглядала б наступным чынам:

**3.00.** Пракінуўся ад жудаснага сну. Быццам я прэзыдэнт нейкай рэспублікі, якая ўзьнікла на развалінах Савецкага Саюзу. І быццам я на нажах з Масквой, бо расейцы ўзьнялі нам мыта на пастаўкі шклоачышчальніка, зь якога мы гонім алькагольны сурагат на экспарт у Эўропу. Дурны сон. Што б гэта магло значыць — няўжо ў мяне праблемы з псыхікай? Усё, баста! Трэба заняцца спортам — фэхтаваньнем або хакеем.

**5.55.** Пракінуўся таму, што ня мог дачакацца гімну СССР.

**6.00—6.10.** Уважліва слухаў мэлёдыю на словы Міхалкова — Эль Рэгістана і музыку Аляксандрава. Якая моц!

**7.30—8.30.** Напісаў заяву аб адстаўцы з посту дэпутата ВС. Як савецкі чалавек, не магу быць пешкаю ў гульнях буржуазных нацыяналістаў.

**9.00.** Паслухаў навіны. Сёньня ў Пушчы сустрэча Ельцына, Краўчука і Шушкевіча. Дыктар кажа, што тройка разрулівае нейкія энэргетычныя праблемы. Што і казаць — палітычныя ліліпуты! У той час, калі 300 мільёнаў зьбіраюцца сьвяткаваць 31 сьнежня чарговую гадавіну нараджэньня вялікай дзяржавы!

**12.10.** Толькі што па радыё перадалі, што ў Віскулях пастаўлена пытаньне пра роспуск Саюзу. Гэта катастрофа! Трэба нешта рабіць! Аднак што?

**13.45.** Мяркую, што Масква павінна даць загад беларускім структурам КДБ арыштаваць белавескіх зуброў. Спрабаваў датэлефанавацца на Лубянку. Нарэшце пачуў голас нейкага афіцэра. На маю прапанову той адпавёў: «Ведаеце, я толькі што вярнуўся з Дрэздэна. Там усё на рынкавых прынцыпах. Час і нам перайсьці на гэтую формулу. Такім чынам, мы звонім вашаму КДБ, а вы нам... Што ў вас, дарэчы, ёсьць?» Узгадаў, што ў мяне ёсьць карова Мілка. Аднак гэта было яму нецікава. Паклаў трубку.

**14.00.** Тэлефанаваў ад імя Гарбачова беларускаму КДБ і загадаў тэрмінова арыштаваць тройку. На тым канцы лініі пачалі зьдзекавацца з маёй трасянкі. Кажуць, ня думалі, Міхал Сяргеевіч, што вы так часта затарваецеся на Чэрвеньскім рынку.

**15.08.** Сеў у цягнік на Берасьце. Па дарозе на вакзал, каля кулінарыі на праспэкце, нечакана сустрэў Якубовіча — мацёрага антысаветчыка, які падчас путчу наяжджаў на ГКЧП. Прапанаваў яму стаць рэдактарам «Советской Белоруссии». Павал Ізотавіч назваў мяне абломкам гісторыі. Зачапіла. Гы-гы-гы.

**21.30.** Ля вакзальных кавярняў у Берасьці мною выпрацаваны геніяльны плян — разам з масамі працоўных пранікнуць у Пушчу і зьнішчыць антысавецкую хунту. Пайду падымаць народ.

**22.45.** Ледзь вырваўся з пастарунку МУС. Хацелі прышыць артыкул за тое, што хадзіў па вакзале і нецэнзурна лаяўся (гэтак яны называюць патрыятычныя заклікі). Адмазаўся, спаслаўшыся на Пазьняка, які неяк у рэстаране Вярхоўнага Савету вывеў тэорыю аб тым, што ў беларускай мове няма нецэнзурных слоў. Паверылі.

**23.00.** Дарагі дзёньнік, магчыма, гэта мой апошні запіс. Я сяджу ў засадзе каля доміку, дзе сабраліся антысавецкія юды. Зараз са словамі песьні «Саюз нерушымы» ўстану і пайду ў апошні бой. Калі загіну, прашу лічыць мяне сябрам фракцыі «Камуністы за дэмакратыю».

**23.30.** Усё прапала. Пакуль дабег да залі, высьветлілася, што дамова пра роспуск СССР ўжо падпісаная. Гэта капец. Сур’ёзна думаю пра суіцыд.

**23.45.** Вырашыў адпомсьціць за Саюз. Думаю абрацца прэзыдэнтам гэтай краіны і аднавіць СССР. Дарэчы — каб не западозрылі, спачатку прыкінуся ёлупнем: абавязкова прагаласую ў парлямэнце за ратыфікацыю белавескіх дамоваў. А зараз спаць.

**3.00.** Зноў жудкі сон. Быццам мяне судзяць за нейкія правы чалавека...



Аўторкавым вечарам 12 сьнежня ў менскім клюбе «Юла» сьвяткавалася трохгодзьдзе музычнага парталу «Тузін Гітоў». Галоўнай дзеючай асобай быў паэт, мастак і проста генэтар файных ідэяў Міхал Анемпадыстаў. Яму прысьвячалася гэтая імпрэза з правакацыйным назовам «Бэніфэст» — бэніфіс і фэстываль у адным фляконе.

Ня часта бывае магчымасьць пабачыць на адной сцэне Лявона Вольскага, Касю Камоцкую, «Рэха», Зьмітра Вайцюшкевіча, IQ-48, Ігара Варашкевіча, «Apple Tea», Русю, Алега Хаменку. Усе без выключэньня музыкі, якія зьяўляліся на сцэне побач зь Міхалам, — яго блізкія сябры. Таму ніхто сябе асабіва ня стрымліваў, шчыра і адкрыта прызнаваліся ў пачуцьцях да гаспадара. Гэта дадало імпрэзе цеплыні й нязмушанасьці.

Гваздом канцэрту стала выкананьне Вольскім і Варашкевічам «Аўтабіяграфіі» — песьні часоў польскай «Салідарнасьці», якую на беларускую мову пераклаў Міхал Анемпадыстаў. Гэтая песьня, што стала лідэрам гіт-параду «Тузіну Гітоў», — своеасаблівы гімн новага пакаленьня і сымбаль цяперашняга часу.

**Дар’я Слабчанка і Кася Сарокіна**

## Дзякую Тарасу

**Хачу выказацца наконт Фядуты.** Шкадую, што ня трапіла на прэзэнтацыю ягонай кнігі. Не, я ня буду памінаць 1994 год. Хопіць! Але як зразумець ягоныя заклікі да супрацоўніцтва з Лукашэнкам? Нейк Фядута сказаў, што ён не такі моцны, каб змагацца з АМОНаўцамі, і не такі хуткі, каб ад іх бегаць. Вось мне і здаецца, што ўсе ягоныя заклікі — гэта прапановы ня вельмі моцнага і ня вельмі хуткага чалавека. А ён пытаў у тых хлопцаў, якім раздае парады, ці жадаюць яны мець справы з Лукашэнкам і ягонымі «камандас»? Ці ў матуль, у якіх дзеці сядзяць за кратамі ні за што? А можа, Фядута зноў спадзяецца быць лялькаводам, торгаць за ніткі? Здаецца, ён шкадаваў, што ня быў у Сакавіку на плошчы, тут я зь ім салідарна — трэба бліжэй пазнаёміцца зь беларускім АМОНам і асабліва з тымі пачварамі, якіх спусьцілі на моладзь у апошнюю ноч.

Заадно хачу выказаць вялікую падзяку Віталю Тарасу. Гэты чалавек дапамагае мне ў жыцьці болей, чым уласны муж. Як толькі мне нешта балюча коле і чапляе, то ўжо ў наступным нумары «НН» зьяўляецца ягоны артыкул з пытаньнямі, якія мяне хвалявалі. Самае цікавае, што на 90—98% я зь ім згодная. І становіцца лягчэй дыхаць сярод «балотнага дурману». Дай Бог гэтаму чалавеку здароўя! І каб ня страціў ён аналітычных здольнасьцяў.

Шмат аб чым яшчэ хацелася б выказацца. Але раяць адыходзіць ад стала не наеўшыся.

**Сьвятлана Леанідаўна, Менск**

## Афэрта – гэта прапанова

**Ветліва вітаю Вас з Англіі і з нагоды 100 гадоў існаваньня газэты пажадаю далейшых 100 гадоў прадаўжэньня дарагой газэты «Наша Ніва».** Я заўсёды прагна чакаю на прыход газэты і зь вялікай цікавасьцяй чытаю ад першай і да апошняй старонкі. Аднак мне не падабаецца, што некаторыя аўтары ўжываюць замежныя словы, калі ёсьць добрыя і адпаведныя беларускія словы. Тут хачу прывесьці прыклад, што ў №43 газэты на першай старонцы ўжываецца слова «афэрта», запазычанае з француcкай ці ангельскай мовы (гэта таксама ў польскай мове), калі ў беларускай мове ёсьць слова — «прапанова».

**Міхась Баяроўскі, Блэкўэл (Брытанія)**

## Гісторыя з ідэалёгіяй

**У суботу, 2 сьнежня, прайшоў раённы этап рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па гісторыі.** Сярод 94 заданьняў, якія былі прапанаваныя ўдзельнікам, было з паўдзясятка пытаньняў, ня зьвязаных з гісторыяй, але цесна зьвязаных зь дзяржаўнай ідэалёгіяй. Пытаньне №86, напісанае па-расейску, гучала наступным чынам: «Якія дзяржаўныя праграмы сьведчаць аб тым, што «Беларусь — сацыяльна арыентаваная, прававая, адкрытая ўсяму сьвету дзяржава» (А.Лукашэнка). Назавіце ня менш за тры». Пытаньне №90: «БРСМ быў створаны...» Далей незразумела, што трэба было дапісаць. Ці то дату стварэньня лукамолу, ці то шлях яго стварэньня, ці то ўсё гэта разам.

Гэта яшчэ адно пацьвярджэньне таго, што дзяржаўная ідэалёгія пранікае ва ўсе сфэры жыцьця грамадзтва.

**Янка Зуброўскі, Лапуты Докшыцкага раёну**

## Дзе мяжа маральнай прыстойнасьці?

**І так можна было б назваць артыкул сп.Садоўскага ў «НН» №38.** Для грамадзян нашай краіны пытаньне актуальнае. Менавіта таму аўтар закрануў грамадзянскую паставу некаторых творцаў як прыклад, ня варты пераймакньня. Сапраўды, непрыстойна абвяшчаць новай кнігай выданьне з дадаваньнем аднаго апавяданьня і зьмененай назвай. Падман лёгка выкрываецца, калі чытач разгортвае нібыта новую (!) кнігу.

Спадар А.Фядута ўводзіць у зман неабазнанага чытача іншым спосабам. Ён паказвае памылкі апазыцыі, піша, як яна павінна сябе паводзіць, з пазыцыі нібыта свайго чалавека, апазыцыянэра. Яскравы прыклад ідэйнай неадпаведнасьці аўтара абранай тэме! Ня дзіва, што сп.Садоўскі проста гаворыць, што часам няёмка чытаць пра «апазыцыйнасьць» сп.Фядуты, тым больш пра ягонае «маральнае права павучаць апазыцыю». Няма ў сп.Фядуты гэтага права, прынамсі маральнага.

Але мяне найбольш абурае ў гэтай палеміцы на бачынах «НН» спроба сп.Фядуты падмяніць размову аб маральнасьці дыскусіяй на тэмы літаратурнай абазнанасьці. Пры гэтым накідваецца ўражаньне, што няведаньне сп.Садоўскім расейскіх літаратурных падзеяў часоў Пушкіна і Някрасава і ёсьць галоўным прадметам дыскусіі. Во як! І як ні імкнецца сп.Фядута паказаць сваю ветлівасьць ў дачыненьні да апанэнта, заўважаецца ягоная раздражнёнасьць і нават непавага. Таму думаецца, што менавіта на падмене напрамку можна працягваць далей — зачэпка ёсьць.

**Аляксандра Марчанка, Горадня**

## Такое ў нас дзеецца

**Цёмначы, каля 7 гадзін увечары, двое — мужчына і жанчына — вярталіся з працы.** Бы мяоцны туман. Праходзячы праз шашу, мужчына спыніўся запаліць цыгарэту, а жанчына пайшла. Яна амаль дайшла да свайго двара, як пачула моцны глухі ўдар, але не надала гэтаму значэньня.

А гэта мянчук ехаў на легкавушцы мо сто пяцьдзясят кілямэтраў у гадзіну і забіў таго чалавека.

Засталося трое сіротаў і ўдава. І сям'і гора, і менчуку бяда.

* * *

375 тысячаў рублёў мусіць зарабіць і аддаць раённай управе адукацыі Кабульская сярэдняя школа. РАА ня дбае, дзе і скуль узяць гэныя грошы. Кажуць, школе пашэнціла, бо гарадзкія мусяць аддаць па два мільёны.

От і ломяць галовы дырэктары, як разжыцца грашамі. У Кабульшчыне рашылі, што будуць вучыць самі сябе кампутарнай грамаце, а грошы за гэта аддадуць беднаму РАА. Нават пры КПСС такога не было.

**Мікола Бусел, Дуброва**

## Кожную пятніцу зь нецярпеньнем чакаю капэрту з маёй любімай газэтай.

**Вы несяце беларусам праўду, таму вас і прыцікаюць, робяць усё, каб «Наша Ніва» перастала існаваць, і «Наша Ніва» вымушана абараняцца, таму яна і «апранула» шэры салдацкі шынэль (я маю на ўвазе колер капэрты, у якой мы атрымліваем цяпер «Нашу Ніву»).**

Я чую на «Свабодзе» апытаньні чытачоў. Аднаму падаецца мала палітыкі, другому — літаратурных старонак, трэці наагул чытае яе 5 хвілін і выкідвае. Я лічу, што «Наша Ніва» павінна заставацца такою, якая ёсьць і якую любяць чытачы. Нават пераходзіць на каляровы друк (як цяпер робяць большасьць газэт) ня варта. За 100 год у «Нашай Ніве» склаліся свае традыцыі, свой стыль, а гэта каштуе многага. «НН», як люстэрка, адбівае нашае жыцьцё такім, якім яно ёсьць: з радасьцю, надзеяй, расчараваньнем і г.д. Па старонках «НН» будучыя гісторыкі будуць вывучаць наш час і ў сваіх працах зробяць спасылку на нашу газэту.

Трымайся, мая любімая «НН». Як кажуць у народзе, «цяжка жыць на белым сьвеце толькі першыя сто год...» Будзем спадзявацца, што наступнае стагодзьдзе будзе лягчэйшым — Беларусь стала незалежнай дзяржавай і, дасьць Бог, хутка будзе і дэмакратычнай.

Віншую ўсіх супрацоўнікаў «НН», яе чытачоў і прыхільнікаў з 100-годзьдзем «НН»! Посьпехаў усім Вам! Зьдзяйсьненьня ўсіх вашых пажаданьняў і ўсяго самага найлепшага!

**Уладзіслаў Хархардзін, Вернядзьвінск**

## На месцы былой магілы Івана Луцкевіча ў Закапаным пахаваны іншы чалавек

У часе онлайн-канфэрэнцыі на радыё «Свабода» Андрэю Дыньку задалі пытаньне: ці ня варта адшукаць у Закапаным магілу Івана Луцкевіча, аднаго з заснавальнікаў газэты?

Іван Луцкевіч памёр у 1919 г. у польскім курортным горадзе Закапанэ, куды яго, цяжка хворага на сухоты, прывезьлі сябры. Перапахаваньне парэшткаў аднаго з бацькоў-заснавальнікаў беларускага руху адбылося ў 1991 годзе на віленскіх могілках Роса. Там, на Літарацкай горцы, побач з братамі Луцкевічамі пахаваныя Францішак Аляхновіч, Казімер Сваяк, Лявон Вітан-Дубейкаўскі ды іншыя.

Непасрэдны ўдзельнік перапахаваньня гісторык Алег Латышонак кажа, што гэта была сымбалічная акцыя. Ён узяў крыху зямлі з магілы ў Закапаным (хрысьціянская традыцыя лічыць гэта дастатковым) і адвёз яе ў Вільню. Луцкевіч нарэшце знайшоў спачын у горадзе, у якім працаваў і які любіў. На сёньня ў Закапаным на месцы былой Луцкевічавай магілы пахаваная іншая асоба і пастаўлены помнік.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Хто Вы па палітычных поглядах, чытач?**

| | |
|---|---|
| Чалавек левых поглядаў | 19 (6.6%) |
| Сацыял-дэмакрат | 12 (4.2%) |
| Камуніст | 4 (1.4%) |
| Анархіст | 23 (8.0%) |
| Чалавек правых поглядаў | 37 (12.9%) |
| Кансэрватар | 18 (6.3%) |
| Хрысьціянскі дэмакрат | 38 (13.3%) |
| Лібэрал | 33 (11.5%) |
| Нацыяналіст | 84 (29.4%) |
| Староньнік дзействуюшчэй власьці | 3 (1.0%) |
| Акцябронак | 15 (5.2%) |

Усяго прагаласавала: 286

# На сайце «Нашай Нівы» зьмешчаны пяцітысячны камэнтар

Здарылася гэта 7 сьнежня а 18.00.

Пяцітысячны пасьля зьмены дызайну nn.by чытацкі камэнтар зьмешчаны пад нікам «Вольны» да артыкулу «Суцэльныя непрыемнасьці, альбо Антыапалёгія Інтэрнэту». Аўтар зьмешчанага камэнтару атрымае прыз ад Рэдакцыі — падпіску на ПДФ-вэрсію газэты.

І — пішэце!

# «Гадаваньне на чужых мовах»

**«Тата, а ў той дзяўчынкі таксама тата, а ня папа...» Артыкул Руслана Равякі ў №43 выклікаў шквал водгукаў на сайце nn.by.**

**Xviedar напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 у 9:55**

Калі мы, беларускамоўныя, ня будзем гадаваць дзяцей па-беларуску, хто гэта будзе рабіць? Сёньня мала проста ў хатніх умовах выхоўваць дзіця. Трэба ствараць для яго беларускамоўныя асяродкі, якімі могуць стаць сябры па беларускамоўным садку, школе, гуртку, курсах і г.д. Трэба ціснуць на мясцовую ўладу, каб яна стварала ўмовы для нашых дзетак. Адчынялі такія садкі й школы.

**Idejny напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 у 11:29**

...Так вы можаце да другога прышэсьця «ціснуць». Арганізоўвацца і браць уладу трэба, і кіраваць сабою самім.

**Xviedar напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 у 15:14**

Калі мы будзем мець сваё асяродзьдзе, мы зможам арганізоўвацца. Мы будзем мець аснову для пабудовы дзяржавы.

**televital напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 у 19:11**

Бабы — гэта такая загадкавая зьвя :), вельмі цяжка перавыхаваць. Я сваю і паліць кінуць прымушаў, і на беларускай мове ў хаце размаўляць, але, пэўна, зь мяне дрэнны настаўнік :).

**Надзея напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 у 13:57**

не хвалюйся, televital, зразумее яна калі-ніць... «Не пакідайце мовы сваёй, каб ня ўмёрлі...» — гэтыя словы я паўтараю зноў і зноў. Беларуская мова будзе жыць.

**Крысціна напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 у 14:14**

Шаноўныя ідэйныя! Пакуль вы змагаецеся за ўладу, захапляючыся болей працэсам, чым мэтай, дзеці растуць. І вашыя таксама. І зусім ня вашымі паплечнікамі вырастаюць. Бо каб вызваліць сабе час на змаганьне, вы даручаеце гадаваньне жонцы, бабулі — каму заўгодна, абы вас не чапалі. І ходзяць дзеткі ў расейскамоўны садок, бо ён каля хаты, а да беларускасьці вам шкада 20 хвілін ехаць і тысячу на паліва марнаваць. І гэта ў Менску, дзе ўжо ёсьць створаныя іншымі беларускія садкі і школкі. Што казаць пра «актывістаў» з гарадоў са статысячным насельніцтвам, няздатных назьбіраць пяць-дзесяць паплечнікаў для адкрыцьця садка. Значыць так яно вам трэба. І калі нехта бярэцца апісаць праблему і давесьці вам яе актуальнасьць, вы пачынаеце фанабэрыю разводзіць пра вялікую палітыку. Як у показцы: грошай на дах у хляве няма, таму пераходзім да пытаньня аб пабудове камунізму. Мне страшна, калі мы прыйдзем да ўлады, вы таксама захочаце сабе пасаду. І будзеце дбаць на ёй пра пытаньні дзяцей, жанчын і адукацыі так жа «эфэктыўна», як і цяпер. P.S. Руслане, дзякуй за клясны артыкул!

Грошай на дах у хляве няма, таму пераходзім да пытаньня аб пабудове камунізму.

**televital напісаў(ла) Лістапад 25, 2006 у 21:38**

Крысьціна, не хвалюйся, на гэтую пасаду мы цябе пасадзім :). У астатнім згодны — пачынаць трэба зь сябе (сваіх дзетак).

**Ігар напісаў(ла) Лістапад 26, 2006 у 12:59**

І сваіх жонак!

**w напісаў(ла) Лістапад 26, 2006 у 18:02**

2 Ідэйны. Ды прычым тут Лукашэнка-не Лукашэнка?.. Трэба ўкладаць у будучыню зараз, а ня толькі тады, калі будуць «адпаведныя» варункі.

**Ліда напісаў(ла) Лістапад 27, 2006 у 20:01**

Вашы расейскамоўныя жонкі ў выпадку іншага павароту лёсу і з мужам-французам ці туркам таксама б па-расейску гаманілі? Ці дазволіў бы габрэй, жывучы ў родным Ізраілі, гадаваць сваё дзіця на мове і культуры суседняе краіны? Ці паўстае ў габрэяў, кітайцаў ды інш. пытаньне: «Я люблю чалавека ці яго палітычныя погляды?» — калі ён патрабуе ад сваёй паловы быць ня проста каханкай, кухаркай, парадзіхай ды нянькай, а прадаўжальніцай роду, захавальніцай традыцыяў народу, да якога належаць муж і бацька? Калі жанчына не шануе свой народ нават у асобе мужа, то ці ёсьць у яе ўвогуле маральнае права выхоўваць дзіця? Мо рэгрэс ператварыў гэтую істоту ў самку, здатную толькі карміць, апранаць і вадзіць у школу, дзе ўласна выхаваньнем займаюцца адмыслова нанятыя дзяржавай людзі?

**Halina von Leipzig напісаў(ла) Лістапад 27, 2006 у 22:36**

«...калі ён патрабуе ад сваёй другой паловы быць ня проста каханкай, кухаркай, парадзіхай ды нянькай...». А таксама насіць паранджу... :-) Калі б ад мяне хтосьці «патрабаваў», на якой мове гаварыць, я прынцыпова зрабіла б «мая твая не разумей». Мова – гэта ня сродак палітычнай барацьбы. На ёй трэба проста гаварыць, чытаць, пісаць. Проста жыць.

**pan Brudas напісаў(ла) Лістапад 27, 2006 у 23:35**

Шаноўны аўтар і суразмоўнікі! На жаль ці не на жаль, справа тут ня толькі ў хаценьні-нехаценьні размаўляць на роднай мове. Гэта яшчэ справа вялізарнага ўдзелу падсьвядомасьці, якую самі мы — а тым больш нашы дзеці — кантраляваць ня можам. Быць не падобным да іншых і пастаянна кідаць гэтым выклік асяродзьдзю — на гэта здольныя нямногія. Але без нарошчваньня беларускага асяродзьдзя мы ня зможам разарваць гэтае кола.

# Ірына Раманава: «Сталін проста павысіў квоту»

Інтэлектуалы прагнулі быць падманутымі. Таму яны не заўважалі голаду.

Вярхоўная Рада Ўкраіны прызнала сталінскі голад 30-х гадоў мінулага стагодзьдзя генацыдам украінскага народу — наўмысна задуманым забойствам з мэтаю вынішчэньня ўкраінскага насельніцтва і зьмены дэмаграфічнага балянсу ў СССР. Гэтая акалічнасьць прымусіла задумацца, ці было нешта падобнае ў Беларусі, і ці гатовая нашая краіна прызнаць злачынствам цяжкую спадчыну СССР. Пра гэта гутарка з гісторыкам **Ірынай Раманавай**, адным зь нешматлікіх дасьледчыкаў, якія наважваліся займацца праблемай голаду на беларускіх тэрыторыях у савецкія часы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Спн.Ірына, як Вы ўвогуле заняліся вывучэньнем праблемы беларускага голаду 1932—1934 г.?**

**Ірына Раманава:** Падчас працы ў архіве з дакумэнтамі, якія маюць грыф «Зусім сакрэтна», мне траплялiся асобныя зьвесткі аб голадзе 30-х гадоў у Беларусі. Але цікавасьць да гэтай праблемы ўзьнікла ў часе палявых дасьледаваньняў. Большасьць вусных гістарычных зьвестак удалося сабраць у навуковай экспэдыцыі па Палесьсю ў траўні 2003 г. Мэтай экспэдыцыі было вывучэньне беларуска-ўкраінскага памежжа, а асноўнай базай быў Мазыр. Калі паехалі па вёсках, я нечакана сама для сябе выйшла на тэму голаду. Трэба адзначыць, што дакумэнтаў аб голадзе на Мазыршчыне я ня мела. Пасьля гэтага я адышла ад усіх іншых анкет і пачала зьбіраць інфармацыю толькі пра голад. Усё пачалося зь вёскі Малыя Аўцюкі, акурат там і пачула пра голад трыццатых. Найбольш успамінаў я маю па Мазырскім, Хойніцкім і Крычаўскім раёнах, іншыя зьвесткі былі ўзятыя з архіваў.

**«НН»: Ці голад ахапіў усе вёскі беларускага Палесься?**

**ІР:** Не, ня ўсе. Паралельна група дасьледчыкаў працавала над вывучэньнем беларускіх палякаў. Дык вось, у іх вёсках (былых г.зв. шляхецкіх засьценках) голаду не было. Адзінае, што ў такіх вёсках згадваюць, гэта тое, што было цяжка, ішлі ўкраінцы, але голаду не было.

**«НН»: Ці існуюць якія-небудзь дакумэнты наконт голаду ў іншых рэгіёнах Беларусі?**

**ІР:** Такія дакумэнты сапраўды ёсьць, але яны надзвычай фрагмэнтарныя, каб скласьці агульную карціну па ўсёй краіне. Мапа тых мясьцінаў, дзе людзі галадалі ў 30-я, сапраўды патрэбная, але для гэтага патрэбна рабіць спэцыяльнае дасьледаваньне. Тыя дакумэнты, што сустракаюцца ў архівах асобага сэктару ЦК КПБ, збольшага датычаць акурат Палесься. Аднак лякальныя выпадкі голаду фіксаваліся і ў больш паўночных рэгіёнах Беларусі, як, напрыклад, у Барысаўшчыне.

**«НН»: Чаму Вас закранула гэтая тэма?**

**ІР:** Я неаднаразова езьдзіла ў навукова-дасьледчыя экспэдыцыі. Звычайна калі мы заходзім у вясковую хату, называемся, што мы гісторыкі зь Менску і просім расказаць, як жылося раней. Першае, што звычайна чуем у адказ: «Была вайна, было страшна...» А ў Мазырскім, Хойніцкім раёнах найперш мы чулі: «Быў страшны голад». Гэты голад для мясцовых жыхароў нават пераўзышоў па ўражаньнях вайну! Нягледзячы на тое, што гэта людзі 1920-х гадоў нараджэньня, і многія зь іх былі яшчэ дзецьмі, але ўражаньні былі настолькі моцныя, што засталіся да сёньня. Як адзначыў адзін інфармант: «Гэты голад запомніў бы і трохлетні рабёнак».

**«НН»: Якія былі галоўныя прычыны гэтага страшэннага голаду?**

**ІР:** Несумненна, савецкая ўлада спрычынілася да гэтага голаду. Хоць ураджай 1932 г. быў трохі меншы, чым звычайна, голад быў выкліканы ня гэтым. Прычынай, хутчэй, стала супраціўленьне сялян палітыцы рэжыму, якое не спынялася, і меры, прынятыя рэжымам у адказ, закліканыя раз і назаўсёды падавіць у сялян усялякую волю да супраціву. Сталін быў упэўнены, што сяляне проста хаваюць прадукты, а мясцовым партыйным упраўленцам не хапае рашучасьці іх забраць. Партыя рэзка ўзмацніла свой ціск, каб добра правучыць сялян: дзяржава проста павысіла квоту дзяржнарыхтовак без уліку рэальных патрэбаў сялян, хаця ўлады добра разумелі, што гэта можа пагражаць голадам. Таму голад 1932—

1933 г. у заходняй гістарыяграфіі (сьледам за Р.Конкуэстам «Жніво смутку») атрымаў назву «тэрору голадам». Гэтае найвялікшае злачынства стагодзьдзя ў той час пастараліся ўтаіць ад навакольнага сьвету і нават ад тых катэгорый насельніцтва СССР, якія ад яго не пацярпелі. І голад падзейнічаў. Ён урэшце прынёс партыі перамогу над вёскай. Сяляне назаўсёды страцілі волю да непадпарадкаваньня савецкай уладзе.

Нават калі сьледам за некаторымі гісторыкамі зыходзіць з таго, што голад ня быў штучна створаны, то сам факт, што галадаючым тэрыторыям не аказвалася ніякай гуманітарнай дапамогі, гаворыць, прынамсі, аб многім. Ратаваць людзей відавочна ніхто не зьбіраўся. Ствараліся ж нават адмысловыя кардоны, каб людзі не змаглі нікуды ўцячы.

**«НН»: Ці праточвалася інфармацыя пра голад на старонкі сусьветнай прэсы?**

**ІР:** Практычна нічога не было. Асобныя паведамленьні рэзанансу ня мелі. Украінскі гісторык Яраслаў Грыцак адзначае, што ангельскі драматург Б.Шоў, ягоныя суайчыньнікі Сыднэй і Бэатрыс Ўэб, былы прэм'ер-міністар Францыі Эдуард Эрыё і іншыя, хто пабываў ва Ўкраіне ў час голаду, па вяртаньні на Захад распавядалі гісторыі пра заможных украінскіх сялян. Відавочна, яны не разумелі таго, што ва Ўкраіне ім паказвалі не сапраўдныя сялянскія сядзібы, а «пацёмкінскія» сёлы. Але справа ня ў тым, што заходніх інтэлектуалаў падманулі: шмат хто зь іх прагнулі быць падманутымі. У час вялікай дэпрэсіі 1929—1933 г., а асабліва пасьля прыходу Гітлера да ўлады ў Нямеччыне, яны выказвалі моцныя прасавецкія сымпатыі і адкідвалі ўсялякую крытыку СССР як нацысцкую прапаганду. Былі і такія, хто на замоўчваньні голаду рабіў сабе кар'еру. Прадстаўнік New York Times у СССР Вальтэр Дурантэ ведаў, што рабіцца ва Ўкраіне. Але ў сваіх артыкулах ён нават не ўзгадаў гэтай трагедыі, не жадаючы трапіць у няласку да савецкай улады.

**«НН»: Чым канкрэтна адрозьніваўся голад 30-х у Беларусі і ва Ўкраіне?**

**ІР:** Найперш, натуральна, маштабамі. Калі ў Беларусі мы можам гаварыць пра тысячы ахвяраў голаду, то ва Ўкраіне лік пайшоў на мільёны памерлых.

Маглі быць і лякальныя асаблівасьці. Так, інфармантка з Крычаўскага раёну ўпэўненая, што іх выратавала тое, што побач была рэчка, па берагах якой расло шмат мясістай травы, гэта і ўжывалі ў ежу. Іншая справа, калі навокал стэп.

**«НН»: Ва Ўкраіне нярэдкімі былі выпадкі канібалізму. Ці было нешта падобнае ў Беларусі?**

**ІР:** Не, я не сустракала. Адзінае, што калега казаў пра выпадкі пасьляваеннага канібалізму, але я з гэтым не сутыкалася, хоць адмыслова цікавілася пра гэта ў сьведак голаду.

**«НН»: Людзі, што не падпарадкоўваліся калгаснаму кіраўніцтву, рызыкавалі трапіць на высылку ў Сібір. Ці не было ў людзей адмысловага жаданьня быць высланым, каб уратавацца ад голаду?**

**ІР:** Людзі ехалі багата куды. Спрабавалі прарвацца нават у Польшчу. Ехалі і ў тую Сібір, самавольна і самастойна. Але адмысловага жаданьня, каб выслалі ў Сібір, не было. Высылка — гэта заўжды шок і страх.

Людзі ня ведалі, што галадаюць нават недалёкія адна ад адной вёскі, бо ні па радыё, ні ў газэтах ніякай інфармацыі не было. Адзіным сродкам даведацца пра голад у іншых рэгіёнах былі ўкраінскія хадакі. Людзі найперш згадваюць, што «прыходзілі ўкраінцы, прасілі вось хоць столечкі хлеба, а пасьля падалі і проста пад плотам паміралі». Вельмі багата ўкраінцаў прайшло празь Беларусь.

**«НН»: Вы ня лічыце галадамор 30-х гадоў генацыдам украінскага народу?**

**ІР:** Я не магу з гэтым пагадзіцца. Папершае, тэрмін «генацыд» мае дакладныя міжнародна-праўныя дэфініцыі. Так, Генэральная Асамблея ААН 9 сьнежня 1948 г. адзначыла, што пад генацыдам разумеюцца дзеяньні, якія чыняцца з намерам зьнішчыць, цалкам ці часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую ці рэлігійную групу як такую. Як я ўжо адзначала, галадамор 1930-х — гэта найперш вынік вайны зь сялянствам, а не з украінцамі.



Той факт, што ў рэшце рэшт вызначэньне «генацыд украінскай нацыі» было заменена на «генацыд украінскага народу», сутнасьці не мяняе. Прызнаць гэта генацыдам украінскага народу — значыць прызнаць, што вынішчэньня іншых, у тым ліку беларусаў, не было.

Гэта трагедыя. Страшэннае Злачынства, якому няма і ня можа быць апраўданьня ніякімі «посьпехамі сацыялізму» і перамогамі на франтах Айчыннай вайны.

Памятаць пра голад, безумоўна, патрэбна. Дзень памяці ахвяраў павінен быць абавязкова. Гэта трэба ня толькі ўкраінцам, але і беларусам. Калі зьявіўся мой артыкул на www.tut.by, то вельмі паказальным было абмеркаваньне на форуме, многія людзі нават ня ведаюць, што ў Беларусі таксама быў голад. Трэба гаварыць і пра голад, і пра ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Пра гэта варта гаварыць у кантэксьце прызнаньня злачыннай спадчыны савецкай улады.

**«НН»: Ці магчыма ў Беларусі падлічыць колькасьць ахвяраў галадамору 1932—1934 гадоў?**

**ІР:** Вызначыць прыкладны маштаб, канечне, можна. Але ў гэтым гісторыкам павінны дапамагчы дэмографы, якія маюць свой інструмэнтар. Да таго ж, цяпер нам даступны матэрыялы раней засакрэчанага перапісу 1937 г. Так, расейскія гісторыкі і дэмографы, супаставіўшы матэрыялы перапісаў 1926 г. і 1937 г., напрыклад, падлічылі, што прамыя страты насельніцтва па СССР у гэты прамежак часу склалі 11 мільёнаў. На падставе тых дадзеных, якія маюцца на сёньняшні дзень, думаю, што лічба памерлых ад голаду ў Беларусі склала некалькі тысяч чалавек.

**«НН»: Вы праслухалі шмат гісторый, зьвязаных з голадам у Беларусі, якая зь іх найболей запала ў душу?**

**ІР:** Мне цяжэй за ўсё было слухаць, а пазьней пісаць гісторыю, якую я пачула ў вёсцы Загальле Хойніцкага раёну. Бабуля расказвала:

— Есьці не было чаго. Маці дастала недзе кавалачак хлеба ды думае: «Я сама яго зьем, бо калі памру з голаду, то і дзеці памруць». Стала ля печкі і жуе той хлеб, каб дзеці ня бачылі. Падышло да яе малое: «Мама, я есьці хачу. Што ты робіш? Ясі?» А яна і кажа: «Не, сынок, ня ем». «А чаго ж, — гаворыць дзіця, — у цябе галава тады трасецца?»

**«НН»: Ці магчымае ў Беларусі прыняцьце заканадаўчага акту, які асудзіў бы сталінскія злачынствы?**

**ІР:** Цяпер не, але ў пэрспэктыве гэта непазьбежна.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Сьвет Караткевіча

Мы скажаем Караткевіча, калі лепім зь яго правадыра-празорцу. Піша **Сяргей Харэўскі**.




Землякі Караткевічавы не забываюцца на свайго генія. Гэтае выданьне было адмыслова падрыхтаванае да 76-й гадавіны пісьменьніка. Укладалі кнігу супрацоўнікі гарадзкога музэю Ўладзімера Караткевіча, а выдадзеная яна была дзякуючы дапамозе аршанскіх спонсараў-прадпрымальнікаў. З фондавых збораў Беларускага дзяржаўнага архіву-музэю літаратуры і мастацтва, музэйнага комплексу гісторыі культуры Аршаншчыны, з прыватных збораў і сямейных архіваў былі сабраныя малюнкі, аўтапартрэты, карыкатуры і шаржы, нашкіцаваныя рукою пісьменьніка. Яны былі знойдзеныя ў рукапісах і лістах Караткевіча і ў ягоных сяброў — Адама Мальдзіса, Янкі Брыля, Вячаслава Рагойшы, Сяргея Панізьніка.

Набыць кнігу можна ў Музэі Ўладзімера Караткевіча, што, між іншым, месьціцца ў тым самым будынку, дзе ў 1930 г. быў Арашанскі радзільны дом і дзе прыйшоў на сьвет будучы пісьменьнік.

Я запомніў яго блазнаватым візіянэрам, чалавекам вельмі эмацыйным і харызматычным, нягледзячы на фізычную слабасьць. Пэўна, для бальшыні сваіх сяброў і знаёмых ён таксама быў чалавекам-аркестрам, вялікім эрудытам і фантазёрам, жартаўніком і геданістам.

Караткевіч жвава рэагаваў на пошукі мастакоў, якія ілюстравалі ягоныя творы. Праз тое ён з многімі й пасябраваў, напрыклад, з Арленам Кашкурэвічам, Пятром Драчовым, Яўгенам Кулікам, Аляксеем Марачкіным, Міколам Купавам. Ён быў сябрам многіх мастакоў і шукаў іх кампаніі. Таму ня дзіва, што й сам усё жыцьцё адчуваў патрэбу да маляваньня.

Аднак тыя, хто яго шанаваў, напрыклад, у 1970-я, і самі засталіся там, у той эпосе. І той вобраз Караткевіча, што яны стварылі, па-першае, недакладны, бо сябры й прыхільнікі імкнуліся зьляпіць зь яго прарока, ледзь не правадыра-празорцу; а па-другое, ён вымагае сёньня асэнсаванае адаптацыі для новае генэрацыі. Хоць бы наноў выдаць ягоныя творы ў клясычным правапісе й праілюстраваць найноўшай графікай. Гэткіх, напрыклад, маладых мастакоў, як Павал Татарнікаў ці Аляксандар Дзямідаў. Бо самае лепшае ў сваёй творчасьці Караткевіч задумляў маладым! І гэткім яго варта вяртаць у наш сучасны кантэкст.

> Я запомніў яго блазнаватым візіянэрам, чалавекам вельмі эмацыйным і харызматычным, нягледзячы на фізычную слабасьць.

Яго пара пераацэньваць. Бо, напрыклад, антыфэадальны й антыклерыкальны запал, зь якім Караткевіч пісаў у свае савецкія часы, выклікае сёньня неўразуменьне. Дый стыль ягоных дэтэктываў сёньня выглядае месцамі каструбаватым на тле тае шырэйшае панарамы сусьветнае літаратуры, у якой абазнаная цяпер моладзь. А вось ягоная лірыка й празаічныя мініятуры набрынялі куды большым сэнсам. Гэтым ён нагадвае Гюго, якога носьбіты францускай мовы найбольш шануюць як паэта, а замежнікі — як раманіста.

Зусім забытым апынуўся Караткевічаў даробак у дакумэнтальным кіно. Дзе й як можна паглядзець тыя дакумэнтальныя фільмы «Сьведкі вечнасьці», «Чорны агат», «Памяць»...

Падзабытай аказалася ягоная грамадзянская публіцыстыка, у якой ён бараніў помнікі культуры й нашую прыроду. У нашу эпоху, пасьля Чарнобылю, многія ягоныя думкі гучаць яшчэ вастрэй і глыбей...

У сваёй мастацкай творчасьці Ўладзімер Сямёнавіч быў такім, як і ў жыцьці, — летуценьнікам-жартаўніком з буйнай фантазіяй.

Шмат малюнкаў зрабіў Караткевіч да п'есы «Млын на Сініх Вірах» (1957). Тэатральны даробак Караткевіча, дарэчы, вялізны. Афармленьнем ягоных спэктакляў займаліся найлепшыя на свой час майстры. У Коласаўскім тэатры ў Віцебску Аляксандар Салаўёў аформіў «Званы Віцебску» і «Кастуся Каліноўскага». Яўген Ждан афармляў «Калыску чатырох чараўніц», пазьней — балет «Дзікае паляваньне караля Стаха». Мастак Тур у Опэры аформіў пастаноўку «Сівой легенды» кампазытара Смольскагаа. Натуральна, што й сам Уладзімер Сямёнавіч нешта шкіцаваў сабе, вымысьляючы нейкі паралельны сьвет сцэны. А бадай, і шукаў натхненьня для сябе ў гэтым маляваньні, глыбей пранікаў у вобразы.




«Сьвет вачыма Караткевіча» (малюнкі, аўтапартрэты, карыкатуры, шаржы)

**Навукова-папулярнае выданьне / Уклад. В.Сіднякова, У.Кузубаў, І.Воранава, В.Пашковіч.** — Ворша, 2006. — 116 с. 1000 ас.

Рыгор Барадулін, адзін з самых адданых ягоных сяброў, піша: «А мастак Караткевіч мог бы, відаць, спаборнічаць зь пісьменьнікам Караткевічам. Бездакорна валодаў лініяй, кампазыцыяй. Некалькімі штрыхамі мог перадаць характар, улюбёна-рамантычна ці зьдзекліва-гратэскава». Гэта слушна ў дачыненьні найперш да няўрымсьлівага Караткевіча 1950—1960-х гадоў.

Вось, напрыклад, як у ягоным малюнку ў лісьце да Максіма Танка 1956 году. Тамака ёсьць і бліскучы аўташарж, і літаратурная аўтапародыя. Абрыс малюнку вельмі дакладны, складаны паводле кампазыцыйнай дыяганальнай пабудовы. Ён разьбіты на чатыры пляны, з элемэнтамі пэрспэктывы.

Але пазьнейшыя ягоныя шкіцы становяцца больш агульнымі, не такімі ахайнымі, як у маладыя гады. У 1970-я ён ужо не надае ім такога значэньня, як колісь. У іх шмат выпадковага. Але гумар, адметны Караткевіцкі гумар, застаецца. Вось, напрыклад, малюнак зь ліста Адаму Мальдзісу «Тыповы беларус», у якім ёсьць і цытата з «Нашае Нівы» 1909 г. пра тое, што ў мястэчку Еўе беларусы жлукцяць піва болей за літоўцаў. А на малюнку — то пэўна малады Адам Мальдзіс у акулярах з куфлем піва! Маладому Караткевічу ж належыць і адзін зь першых беларускіх коміксаў — «Аксамітны альбом», у якім зьмешчаныя размаітыя пацяшальныя сцэнкі зь ягонага прыватнага жыцьця.

Наагул жа элемэнты коміксу, альбомы зь сюжэтнымі малюнкамі, — вельмі беларускі жанр, што сягае ажно ў сярэдзіну XIX ст. І ў Заходняй Беларусі гэты жанр быў вельмі распаўсюджаны ў беларускім левым друку. Гэта былі такія разгорнутыя коміксы на палітычную тэму Горыда, Васілеўскага, Драздовіча, Тыбера...

Калі тыя Караткевічавы малюнкі з «Аксамітнага альбому» былі мо й ня першымі беларускімі коміксамі, то дакладна, што найбольш тыражным зь іх стала кніжка «Дзікае паляваньне караля Стаха», намаляваная Адамам Глёбусам і Ўладзімерам Сьцяпанам. Пэўна, адным гэтым праектам Глёбус са Сьцяпанам зрабілі для вяртаньня Караткевіча ў наш культурны ўжытак болей, чым усялякія выставы ягоных савецкіх яшчэ кніжак.

Так вось і гэтая кніжка, што знаёміць нас з малазнанымі старонкамі ягонае біяграфіі й творчасьці, — яшчэ адзін важкі ўнёсак у справу адраджэньня спадчыны Караткевіча й вяртаньня ягонага імя.

**Сяргей Харэўскі**

# Дзьмітры Касмовіч. За вольную і сувэрэнную Беларусь

У Літве выдадзеныя ўспаміны грамадзкага дзеяча, кіраўніка Беларускага вызвольнага фронту на эміграцыі, зацятага антыкамуніста Дзьмітрыя Касмовіча (1909—1991). Апісаны ў кнізе час ахоплівае 1920—1945 гг. Аўтар расказвае пра дзяцінства, праведзенае ў Нясьвіжы, вучобу ў Радашкоўскай гімназіі ды ад'езд за мяжу ў канцы 1920-х. Касмовіч паехаў у Бэльгію, дзе вучыўся ў Льескім унівэрсытэце і паралельна працаваў у капальнях. Затым перабраўся ў Бялград, дзе скончыў багаслоўскі факультэт, а з пачаткам Другой сусьветнай вайны вярнуўся ў Нясьвіж.

Саветы, якія прыйшлі ў Заходнюю Беларусь, прызначылі Касмовіча «бурмістрам» гораду — так называе сваю пасаду аўтар успамінаў. Потым быў удзел у Народным сходзе ў Беластоку, у сэсіі Вярхоўнага савету СССР у Маскве, што аформіла ўваходжаньне Заходняй Беларусі ў СССР, — і сустрэча са Сталіным, чалавекам, якога Касмовіч ненавідзеў больш за астатніх. Савецкія ўлады рэпрэсавалі ягоную матку за тое, што яна была шчыра адданая праваслаўнай веры. «Сталін выглядаў несамавіта, мізэрна. Давялося і мне паціснуць яму руку. Гэтую хвіліну я ніколі не забуду. Сэрца аблівалася крывёй...»

Жыцьцё Касмовіча чарговы раз кардынальна зьмянілася з прыходам новых акупантаў, немцаў. Ён арганізаваў менскую паліцыю, а ў лістападзе 1941 г. выехаў на Браншчыну і Смаленшчыну, дзе праводзіў беларусізацыю акруг ды арганізаваў атрады самаабароны (Службу парадку).




У пачатку 1970-х Касмовіча абвінавацілі ў кіраваньні апэрацыяй па зьнішчэньні 184-х камуністаў у Касплянскім раёне. Але апраўдалі.

Ён быў жанаты з пляменьніцай Якуба Коласа, дзяячкай Саюзу беларускай моладзі Надзеяй Міцкевіч. Між іншым, з народным паэтам Беларусі аўтар успамінаў пазнаёміўся ў 1940 г. Касмовіч зазначае, што дзядзька Колас моцна ненавідзеў бальшавікоў і ў выпадку вайны не зьбіраўся зьяжджаць зь Менску. 26 чэрвеня 1941 г. яго сілком вывезла на ўсход НКВД.

Пасьля вайны Касмовіч пасяліўся ў Штутгарце, дзе ўзначальваў Беларускі вызвольны фронт, Беларускую незалежніцкую партыю, браў удзел у безьлічы антыкамуністычных форумаў па ўсім сьвеце.

Рэдактар кнігі ў прадмове зазначае, што да ўспамінаў трэба падыходзіць крытычна. Так, выклікаюць пытаньні лічбы пра колькасьць жаўнераў Беларускага краёвага войска на ўсходзе Беларусі. Касмовіч сьцьвярджае, што іх было 100 тысяч. Але, відаць, гэтую лічбу трэба дзяліць як мінімум на дзесяць.

Зьвярнула ўвагу на сябе апошняя старонка кнігі, дзе пазначана, што кампутарны набор ажыцьцяўляў сам Дзьмітры Касмовіч. Альбо гэта рэдактарска-карэктарскі недагляд, альбо аўтар успамінаў у 1986 г. ішоў у авангардзе тэхнічнай думкі.

Тым ня менш, кніга чытаецца вельмі лёгка, як дэтэктыў. Цяжка жыў, лёгка пісалася.

Зьвяртайцеся да незалежных распаўсюднікаў.

**АГ**

**Дзьмітры Касмовіч. За вольную і сувэрэнную Беларусь**. Вільня: Gudas, 2006. — 224 с.

# Аўгустоўскі павет, пошта Сапоцкін, Тэалін

Яшчэ адзін нашаніўскі адрас пачатку стагодзьдзя. Піша гісторык **Андрэй Вашкевіч**.

«Прачынайцеся, хутка Менск», — пачуў я стандартную фразу правадніцы і, каб выпадкам не заснуць ізноў, усхапіўся, як звычайна, ледзь не зваліўшыся зь верхняй паліцы пляцкарту. За акном павольна праплывалі прыгарады Менску. Хаця, якія прыгарады? Прывакзальная плошча, што заўсёды неяк раптам зьяўляецца пасьля дваццаці хвілінаў невядомага прызначэньня абшараў, абцягнутых калючым дротам і пабеленых цагляных ці то складоў, ці то чыгуначных дэпо, найбольш нагадвае ня надта ўдала і недарэчы пабудаваныя дэкарацыі да спэктаклю пра імпэрыю індзейцаў-майя. Але дэкарацыі аказваюцца даволі вялікія. Сярод іх цяпер жывуць больш за два мільёны беларусаў.

Аднак кожны раз едзеш у сталіцу з унутраным адчуваньнем чагосьці незвычайнага, асабліва, калі канчатковая мэта тваёй паездкі — архіў або бібліятэка. У працы гісторыка шмат што мяжуе з наканаванасьцю, бо ніколі ня ведаеш, што чакае цябе ў новым стосе папак з пажаўцелымі паперкамі. Часам знаходзіш такі прыклад велічы і магутнасьці чалавечага духу, што, здаецца, вырастаюць крылы, а часам даведваесься такое, пасьля чаго тыднямі не дакранаесься да сшыткаў з архіўнымі нататкамі. Адным словам — гісторыя. Так ці іначай, але ад некалькіх дзён, праведзеных у архіве, застаецца як правіла адно моцнае, захапляльнае, ня важна, станоўчае ці адмоўнае, уражаньне.

Тым разам гэтае ўражаньне злавіла мяне ў апошні дзень працы ў акадэмічнай бібліятэцы. Думкамі ўжо знаходзячыся ў цягніку, які вязе мяне назад ў Горадню, я гультаявата, хутчэй дзеля самазаспакаеньня, што нешта раблю, гартаў вопіс справаў аднаго дакумэнтальнага збору. Раптам позірк упаў на справу, назва якой мяне, не спэцыяліста ў нашаніўскай пары, ніколі не зацікавіла б, калі б не знаёмае прозьвішча: «Паштоўка ксяндза Яна Тшаско ў рэдакцыю «Нашай Нівы».

Думкі пра вяртаньне ў Горадню адразу некуды зьнікլі, і я, хуценька папрасіўшы прынесьці гэтую справу, пачаў нэрвова гушкацца на крэсьле ў прадчуваньні невялічкага адкрыцьця.

Справа аказалася дзіўная. Зялёнага колеру папка, у якую была ўкладзеная адна невялічкая паштовачка. Паштоўка звычайная, і тэксту няшмат. Ліпень 1912 году, ксёндз Ян Тшаско просіць у рэдакцыі прабачэньня, што своечасова не плаціў за падпіску, і паведамляе газэце свой новы ад-



СА ЗБОРУ У.СОДАЛЯ

рас у Аўстрыі. Закапанае. У пачатку XX стагодзьдзя гэты горны курорт называлі не інакш як сталіцай сухотнікаў. Там скончылі свой жыцьцёвы шлях Іван Луцкевіч і Казімер Сваяк. Чаму ехаў туды Ян Тшаско, таксама зразумела. Сухотнік у той час мог пражыць даволі доўга, але хіба гэта было жыцьцё, там, высока ў горах, сярод такіх самых, як і ты, людзей-ценяў. Аднак самае цікавае было на другім баку паштоўкі — ранейшы, беларускі, адрас ксяндза: Сувалкаўская губэрня, Аўгустоўскі павет, пошта Сапоцкін, Тэалін.

Цяпер усё стала на свае месцы. Усёй сваёй існасьцю адчуваючы, што трапіў акурат на той сюжэт, на якім варта скончыць гэты візыт у Менск, я вярнуў справу супрацоўніцы бібліятэкі і пакрочыў да выхаду.

Сапоцкін, для кагосьці проста кропка на мапе Беларусі, для кагосьці вёска ў ваколіцах Аўгустоўскага каналу, для кагосьці (добра абазнанага ў гісторыі) самае «польскае» мястэчка ў нашай краіне. У 1795 годзе ваколіцы Сапоцкіна трапілі ў склад Прускай дзяржавы, у 1807-м — у Герцагства Варшаўскае, у 1815-м — у Царства Польскае. Пасьля яшчэ сто гадоў асобнага ад усёй астатняй Беларусі жыцьця. Даволі актыўная палянізацыя, супраціў мясцовых жыхароў прымусоваму пераводу з Уніі ў праваслаўе прывялі да таго, што ўжо ў пачатку XX ст. большасьць сапоцкінцаў лічыла сябе палякамі і лічыць сябе такімі да сёньняшняга дня. Аднак беларушчына ніколі не памірала і тут.

Прозьвішча ксяндза Тшаска я ведаў ужо за год да гэтай знаходкі. Ведаў яго зь ліста аднаго таямнічага беларуса з падгарадзенскай вёскі Адамавічы, які падпісаўся псэўданімам Упорысты. У надрукаваным летам 1920 г. у віленскай «Крыніцы» лісьце Ўпорысты пісаў, што жыхары ваколіцаў Сапоцкіна пакрыху схіляюцца да беларушчыны, яшчэ ў 1918 г. у Аўгустове адкрылі беларускую школу (яе настаўніка, як я даведаўся пазьней, звалі Станіслаў Ляховіч), але, на жаль, не хапае дапамогі і ўвагі ад беларусаў з мэтраполіі, зь Віленшчыны або зь Меншчыны. У канцы Ўпорысты са скрухай зазначыў, што вельмі патрэбныя і маладыя ксяндзы, якія не баяліся б чытаць казані па-беларуску, бо «ксяндзоў беларусаў у блізкіх ваколіцах няма, бо кс.праф.-Бэта ў Ломжы, а кс.Тшаско ў Закапаным лечыцца». Ксёндз Генрык Бэта сучасным дасьледчыкам крыху вядомы, найперш сваёй беларускамоўнай кніжачкай пра карыснасьць разьвядзеньня пчолаў... Нарэшце высьветлілася і з ксяндзом Тшаском. Што стала з гэтым, напэўна, вікарым касьцёлу ў Сапоцкіне, пакуль ня ведаю, мабыць, няшмат пражыў ён пасьля 1920 г., ужо тады мінімум восем гадоў змагаўся ён з сухотамі ў Закапаным. І цэлых восем гадоў, праз полымя дзьвюх войнаў, некалькі акупацыяў, голад і невымерныя пакуты помнілі яго і ягоную «Нашу Ніву» мясцовыя сяляне...

Зімою цямнее рана, і цягнік на Горадню адыходзіць ужо ў прыцемках. Іншым разам пяць гадзінаў маруднага падарожжа праз Маладэчна, Ліду і Скідзель падаюцца вечнасьцю, але ня гэтым разам. Думак пра забытых апосталаў беларушчыны Станіслава Ляховіча, ксяндзоў Бэту і Тшаско, таямнічага Ўпорыстага хопіць да таго самага моманту, калі праз адчынены тамбур у вагон не ўварвецца цёплы вецер роднага гораду.

Так, і нават у Сапоцкіне не абышлося бяз «Нашай Нівы», — падумаў я, выразна ўяўляючы, як хітравата ўсьміхнецца, пачуўшы гэтую навіну, адзін мой сябрук зь недалёкай ад Сапоцкіна вёскі, і, надаўшы свайму твару камічна-змоўніцкі выгляд, выцягне з заплечніка вялікую жаўтаватую капэрту з надпісам «НАША НІВА».

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Катэхізіс: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст.** / Адапт. тэкст, пер. з старажытнабел. мовы Н.Кабелка; Укл. С.Акіньчыца. — Менск: Юніпак, 2005. — 312 с.

Сучаснае менскае выданьне стала трэцім для Катэхізісу Сымона Буднага. Першае зьявілася ў Нясьвіжы ў 1562 г., а другое — у Стакгольме ў 1628 г. Ідэя новай публікацыі гэтага рэлігійнага помніка паўстала ў 2002 г. падчас сьвяткаваньня 450-годзьдзя Рэфармацыі ў Беларусі — менавіта тады была заплянаваная падрыхтоўка адаптаванага сучаснымі літарамі старабеларускага арыгіналу ды перакладу яго на сучасную беларускую літаратурную мову. Вось гэтыя два тэксты і складаюць зьмест кнігі. Праўда, у выходных зьвестках не пазначаны аўтар Катэхізісу XVI ст. Пра Сымона Буднага ды ягоных выдавецкіх кампаньёнаў Мацьвея Кавячынскага і Лаўрэнція Крышкоўскага распавядаецца толькі ў прадмове.

У 1578 г. Сымон Будны напісаў «Кароткія нататкі пра хрышчэньне дзяцей», дзе, у прыватнасьці, распавёў пра спробы ўціску пратэстантаў у Вільні, Клецку, Нясьвіжы… Нечаканыя паралелі з пачаткам XXI ст. нараджаюцца тут: «Як відаць, усе верныя служыцелі або былі зь Літвы выгнаныя, або з добрай волі ехалі, як паведамлялася, у Польшчу і на Валынь. Таму і Царква была невялікая, і да Сьвятога Хросту толькі цяпер, у Лоску, 18 траўня 1578 году, дайшло».

**Саксонскае Люстра: помнік прававой думкі Германіі XIII ст.** / Пер. са старажытнаням. і лац. моў, прадм. і камэнт. Вольгі Келер. — Менск: Медысонт, 2005. — 174 с., [24] арк. іл.

Упершыню па-беларуску выдадзены помнік сярэднявечнага нямецкага права, вядомы пад назвай «Саксонскае Люстра». Чаму люстра? Бо гэта было нібыта тэкставым адлюстраваньнем звычаёвага права. «Саксонскае Люстра» мае досыць важнае значэньне для беларускай гісторыі — менавіта на гэтым зборы законаў у значнай ступені заснавана Магдэбурскае гарадзкое права, а горад Магдэбург першапачаткова стаў цэнтрам пашырэньня «Саксонскага Люстра».

«Ніхто ня можа адмовіцца ад права ні праз каханьне, ні праз гора, ні праз пагрозу, ні праз падарунак. Сам Бог — гэта права. Таму для яго права такое дарагое. І таму ўсе, каму Богам дадзена зьдзяйсьняць суд, павінны імкнуцца судзіць такім чынам, каб Божы гнеў і Суд былі б да вас добразычлівымі» (з пралёгу да «Саксонскага Люстра» Айке фон Рэпкава, Нямеччына, XIII ст.).

**Архіварыюс: Зборнік навуковых паведамленьняў і артыкулаў. Выпуск 3.** — Менск: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, 2005. — 200 с.

**Мікуліч, Аляксей. Беларусы ў генэтычнай прасторы: Антрапалёгія этнасу.** — Менск: Тэхналёгія, 2005. — 138 с., іл.

**Мовы Вялікага Княства Літоўскага.** Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канфэрэнцыі (Берасьце, 18—19.05.2004). — Берасьце: Акадэмія, 2005. — 255 с.

**Рыльке, Райнэр Марыя. Кніга гадзін** / Пер. В.Сёмухі. — Менск: З.Колас, 2005. — 160 с.

**Чантурия, Ю.В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI — первой половины XIX вв.: Средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм.** — Минск: Белорусская наука, 2005. — 375 с.

**Алег Дзярновіч**

# Невядомая місія «Горбіка»

Кур'ер падпольля як мага шыфруецца, а галоўны правадыр выступае пад сваім імем? **Яўген Усошын** ставіць пад сумнеў факты з публікацыі «Львоўская місія «Язафата» (№34).

Захапленьне кансьпіралёгіяй, падпольлем, тэорыяй змоваў часам заводзіць дасьледчыкаў у такія сьляпыя вулачкі, зь якіх цяжкавата выбрацца назад, на шырокі прастор неабвержных фактаў. Зрэдку здараецца такое і са сталымі навукоўцамі. Асабліва калі тэма панадная й багатая на спрэчныя зьвесткі. І, паводле лёгікі жанру, выходзіць, што, напрыклад, «НН» — гэта орган сусьветнае закансьпіраванае лібэральнае сеткі; або прабабуляй вядомага літаратара Пятра Васючэнкі, выяўляецца, была Кура-Шчабятура (нездарма ён яе так часта згадвае ў сваіх казках)! І ці мала яшчэ што! На жаль, менавіта сьляпой вулачкай дасьледаваньня можна назваць артыкул «Львоўская місія «Язафата», надрукаваны ў «НН» за подпісам шаноўнага і шанаванага мною Сяргея Ярша і таямнічага Сержука Горбіка.

Уся, як той казаў, *доказная база* грунтуецца ў вышэйпамянёным артыкуле на таямнічым дакумэнце, знойдзеным у архіве *неназванага* беларускага эмігранта. Узьнікае пытаньне: калі аўтары пералічваюць усіх, у каго на руках пабываў дакумэнт, чаму не згадаць і апошняга ўладальніка? Гэта неабходная цаглінка ў вызначэньні аўтэнтычнасьці дакумэнту. Пазбаўленьне ананімнасьці яшчэ больш важнае, бо дакумэнт той — рукапісная копія! *Хто* яе зрабіў? *Хто* знайшоў дакумэнт — на жаль, не паведамляецца.

Зазначым: аўтарам гэтага дакумэнту ёсьць таямнічы *агент «Язафат»*, але ў артыкуле не пазначаны адрасат, да каго скіраваны ліст. Дакладней, пазначаны: В.Гадлеўскі, і нават дата ёсьць. Але гэта, прабачце, падобна да жарту пра Штырліца, які ідзе Бэрлінам у будзёнаўцы і з парашутам за плячыма. Выходзіць: кур'ер падпольля шыфруецца, а галоўны правадыр выступае пад сваім імем?

Трошкі пра Язафата і дакумэнт. З найпрасьцейшага тэкстуальнага аналізу артыкулу вынікае: словы Язафата — словы, узятыя ў дзьвюхкосьсе. Вядомая усім з маленства простая мова. Цяпер разгледзім перадапошні абзац артыкулу. У ім ідзецца пра захады, якія зрабілі гітлераўцы, калі даведаліся пра быццам бы падрыўны характар візыту а.А.Неманцэвіча ў Львоў: «у менскае гестапа і СД з райхкамісарыяту «Ўкраіна» паступіла інфармацыя, што падчас працы Львоўскага сабору экзархаў…», далей: «Тады з Бэрліна прыйшла санкцыя на допыт, а калі спатрэбіцца — і арышт Неманцэвіча». Калі ўсе гэтыя зьвесткі знаходзяцца ў дакумэнце, дык выходзіць, што: або дакумэнт мае двух аўтараў (бо не прыпішаш жа *агенту Язафату*, фактычна кур'еру, такое дакладнае веданьне ўнутранай дакумэнтацыі гітлерцаў), або гэта зусім не *рэляцыя Язафата* зь ягонай паездкі ў Львоў (як можна зразумець з кантэксту). Пытаньне да аўтараў артыкулу: *чым* ёсьць дакумэнт? Бо калі гэты дакумэнт — рэляцыя *агента Язафата*, дык адкуль інфармацыя пра ўнутраную гітлераўскую карэспандэнцыю? Зь якой крыніцы? Чаму яна не пазначаная? І навошта выдаваць рэляцыю Язафата за нешта сэнсацыйнае, што пралівае сьвятло на прычыну арышту Неманцэвіча, калі ёсьць нейкія іншыя вядомыя аўтарам дакумэнты, якія гавораць пра тое самае?

Трэба нагадаць аўтарам сэнсацыйнай знаходкі яшчэ некалькі рэчаў: навесну 1942 г. С.Бандэра ўжо паўгоду сядзеў у канцлягеры, а не ачольваў АУН. Рэальнасьць таемнае паездкі ці то вячэрняй, ці то начной са Львова досыць сумнеўная, бо ў Львове, дзе змагаюцца два вельмі моцныя і актыўныя падпольлі — украінскае і польскае, — кантроль нямецкіх сіл бясьпекі за кожным перасоўваньнем быў стакроць мацнейшы.

Унутраныя супярэчнасьці артыкулу часам гучаць як кпіна з уважлівага чытача. У артыкуле падаецца, што паводле інфармацыі з райхскамісарыяту «Ўкраіна» да менскага «СД і гестапа» «паведамлялася, што Неманцэвіч пагадзіўся выконваць ролю сувязнога паміж групай Гадлеўскага і АУН…». Цяпер скажэце мне: навошта гітлераўцам «сачыць у Альбярціне» за а.А.Неманцэвічам і арыштоўваць, каб атрымаць зьвесткі пра Гадлеўскага, якога, паводле артыкулу, «ён ня выдаў», калі гітлераўцам і так вядома, хто такі В.Гадлеўскі? Выходзіць: Неманцэвіч (арыштаваны ў жніўні 1942 г.), які ўсяго толькі пасярэднік у перамовах, арыштаваны нашмат раней за лідэра падпольля В.Гадлеўскага (дата арышту — 24.12.1942), які хадзіць яшчэ паўгоду на волі. І немцам ужо вядома, што ён лідэр падпольля!

Але і гэта ня самае слабае месца ў артыкуле. Усю карціну пад маляўнічай назвай «Айцец Антоні Неманцэвіч (не забывайма і пра невядомага *Язафата*) — агент беларускага падпольля» псуе пэйзаж, то бок гістарычная праўда. Цытата з калектыўнага артыкулу: «Экзарх Антон Неманцэвіч ня выдаў ані Гадлеўскага, ані сябра Рады Экзархату і адначасова сябра БНП па мянушцы «Язафат» (які, паводле аўтараў артыкулу, *езьдзіў у Львоў з а.Неманцэвічам*)». Згаджуся, ня выдаў. Але толькі таму, што выдаваць нікога *не было патрэбы. Немцы выдатна ведалі, хто езьдзіў з а.Антоніем у Львоў.* Дамо слова паплечніку а.Неманцэвіча, сябру Рады Экзархату а.Ляву Гарошку: «Экзарх… (прапушчана мною. — **Я.У.**) хацеў пабачыцца зь мітр.Шэптыцкім і парабіў усе магчымыя захады перад нямецкімі ўладамі, каб атрымаць пропуск на падарожжа цягніком у Львоў. Слонімскі аддзел Самапомачы падтрымаў захады экзарха. Нямецкая ўлада, відаць, пастанавіла выкарыстаць гэтае падарожжа для сваіх скрытых мэтаў і, замест пропуску на чыгунку, даюць экзарху дазвол на падарожжа ў Львоў і быццам выяў свае «прыхільнасьці», аўто зь нямецкім шофэрам… Экзарх прыняў прапанову падарожжа аўтам і адбыў яго ў ліпені 1942 году» (Гарошка Л. Айцец Антон Неманцэвіч // Божым шляхам. 1964. № 8; перадрук у: Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ ст. Жыцьцяп-


Львоўская місія «Язафата»

**Яўген Усошын** скончыў гістфак БДУ, абараніў магістарскую працу «Жыцьцё і дзейнасьць айца Антонія Неманцэвіча (1893—1943)».

ісы, мартыралёгі, успаміны. — Менск—Мюнхэн, 1999). Выходзіць, ня трэба нікога арыштоўваць, дапытваць, катаваць — усё проста: калі вышэйпамянёны *Язафат* быў бы разам з а.Неманцэвічам ў Львове, яны б сядзелі ў суседніх камэрах.

На гэтым можна было б і скончыць. Усё ясна. Калі нейкі дакумэнт знойдзены, то ён мае малую гістарычную вартасьць. Мусім усё-ткі верыць паплечніку і супрацоўніку экзарха, а не *рукапіснай копіі невядомага аўтарства, недзе кімсьці* знойдзенай. Можна і не прыгадваць спадарам С.Горбіку і С.Яршу, што сьвятары любое канфэсіі падчас нямецкае акупацыі без дазволу мясцовае ўлады не маглі выехаць за межы ваколіц свае парафіі, таму вылічыць *Язафата*, які, паводле легенды дакумэнту (артыкулу?), быў у Львове шэсьць дзён, нескладана, і не было ніякае патрэбы арыштоўваць пасярэдніка а.Антонія, калі сам *агент* трапіўся б вельмі хутка.

Карціць толькі запытаць у аўтараў: з чаго можна меркаваць, што айцец Вацлаў Аношка схаваўся пад мянушкай Язафат? Ці ёсьць факты, зачэпкі? Бо вынікае з артыкулу толькі адно: адбылася мэтамарфоза зь людзьмі. Вацлаў Аношка, бескарысьлівы душпастыр, сапраўдны духоўны бацька для вернікаў, стаўся палітычным змоўнікам, хоць і як быццам *сваім, нашым*. Мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі, які выдаў багата пастырскіх адозваў з асуджэньнем гвалту, учыненага ў палітычных мэтах (яны былі прысьвечаныя менавіта *дзейнасьці* АУН), стаў мэдыятарам у падрыхтоўцы хаўрусу падпольшчыкаў. Ён, мудры пастыр, які ўсё жыцьцё клапаціўся перадусім пра Царкву, і ведаючы, што ў Беларусі немцы легалізавалі заснаваны ім самім грэка-каталіцкі экзархат (Ён *адзіны* з чатырох, створаных мітрапалітам А.Шаптыцкім, быў легалізаваны нямецкай уладай. Астатнія экзархі кіравалі сваімі экзархатамі падпольна зь Львова, бо не маглі нават знаходзіцца на тэрыторыях, за якія адказвалі), стаўся, як вынікае з артыкулу, зусім неадказным рызыкантам. Ён, невядома зь якой рацыі, здольны кінуць жменьку сьвятароў-беларусаў, якія абслугоўвалі на той час экзархат, і вернікаў грэка-каталікоў у пекла *палітычнага* перасьледу. Канец канцоў, экзарх Неманцэвіч, які ўсё жыцьцё імкнуўся не мяшацца ў палітыку, якога абыходзіла перадусім ідэя еднасьці Царквы і еднасьці свайго народу ў гэтай Царкве, зрабіўся, паводле С.Горбіка і С.Ярша, *палітычнай* ахвярай.

І апошняе. Дужа карціць пабачыць хаця б копію з копіі дакумэнту, на які спасылаюцца аўтары артыкулу!

# Уніяты спрыялі антынацысцкаму супраціву

На нядаўняй прэзэнтацыі ў Маладэчне кнігі «Галасы разбуджаных птушак» краязнаўца Міхась Казлоўскі сказаў: «Цэлыя пласты нашай гісторыі адсутнічаюць у архівах. Даводзіцца зьвяртацца да людзей — жывых сьведкаў. Але людзкая памяць недасканалая. Таму я па некалькі разоў прыяжджаў і распытваў… І толькі калі звесткі сыходзіліся, запісваў для кнігі».

У выпадку зь місіяй «Язафата» зьвесткі таксама сышліся. Пішучы артыкул, мы, зразумела, грунтаваліся ня толькі на рукапіснай копіі дакумэнту. Мы ўжо згадвалі пра аповед гераманаха-студыта а.Гедыёна. Таксама атрымалі шэраг сьведчаньняў удзельнікаў беларускага супраціву часу вайны, былога супрацоўніка Баранавіцкага СД.

Спадар Я.Усошын патрабуе прозьвішчаў і яўкі — нібы не разумее, як ставіцца сёньняшняя ўлада да беларусаў, што ваявалі супраць бальшавізму ў 1940—50-я. Людзі жывуць на Захадзе, маюць іншыя прозьвішчы, ім ужо па 85—90 гадоў, ні пра якую легалізацыю гаворкі пакуль ісьці ня можа.

Мусім канстатаваць, што сп.Усошын, прачытаўшы артыкул, не разабраўся, дзе тэкст аўтараў, а дзе цытуецца дакумэнт. Зразумела, у справаздачы «Язафата» няма прозьвішча Гадлеўскага. Адрасат, а таксама падрабязнасьці сустрэчаў В.Гадлеўскага, А.Неманцэвіча і «Язафата» сталі вядомыя нам ад удзельніка беларускага супраціву, прозьвішча якога назваць пакуль ня можам (па вайне ён быў камандзірам беларускага партызанскага атраду ў Белавескай пушчы, цяпер жыве ў Заходняй Нямеччыне).

Мусім адказаць яшчэ на некалькі закідаў сп.Усошына. Знаходжаньне С.Бандэры ў нямецкім канцлягеры не замінала актыўнай дзейнасьці АУН. Калі мы пішам пра «бандэраўскую АУН», дык падкрэсьліваем, з кім менавіта ў той час шукалі кантакту беларусы (бо была яшчэ мельнікаўская АУН). Вывезьці некалькі сьвятароў зь Львову за 40 км у мястэчка Уніў для мітрапаліта А.Шаптыцкага не было праблемай. Ён туды перапраўляў з гораду па 5—10 габрэяў! Няпраўда, што Шаптыцкі ня браў удзелу ў палітычным жыцьці і не спрыяў дзейнасьці АУН-УПА — за апошняе дзесяцігодзьдзе ва Ўкраіне пра гэта напісана шмат.

Калі беларускі супраціў быў зацікаўлены ў львоўскай місіі ўніяцкіх сьвятароў, дык праз сваіх людзей у адміністрацыі і паліцыйных органах мог здабыць дазвол для паездкі. Мы не сьцьвярджалі, што а.Неманцэвіч і «Язафат» ехалі ў Львоў разам. Калі мы адзначылі, што а.Неманцэвіч ня выдаў «Язафата», дык мелі наўвеце, што ня выдаў сутнасьці яго місіі, бо факт яго паездкі ў Львоў, сапраўды, ня быў таямніцаю. Дакумэнты баранавіцкага СД, якія ўтрымліваюць згадку пра атрыманьне апэратыўнай інфармацыі аб палітычных перамовах айца А.Неманцэвіча з прадстаўнікамі АУН(б) пры пасярэдніцтве мітрапаліта А.Шаптыцкага, захаваліся і цяпер перахоўваюцца ў адным зь нямецкіх архіваў.

Львоўскае выдавецтва «Летапіс УПА» таксама мае дакумэнты пра перамовы лета 1942-га паміж АУН(б) і прадстаўнікамі беларускага супраціву. Спадзяемся, што бліжэйшым часам гэтыя і іншыя дакумэнты будуць надрукаваныя.

Мы пісалі: «Можна меркаваць, што пад мянушкай «Язафат» схаваўся айцец Вацлаў Аношка». Не сьцьвярджаем, а выказваем меркаваньне, бо ня маем 100% доказаў, пакуль ня знойдзены арыгінал справаздачы «Язафата». Нагадаем, у склад Рады Экзархату ўваходзілі тры сьвятары: Іван Гермацюк (паводле Гарошкі, памёр вясной 1942 г.), Вацлаў Аношка і Леў Гарошка. Жывучы на эміграцыі, а.Гарошка ніколі ня згадваў, што ўдзельнічаў у Львоўскім саборы чэрвеня 1942 г. А вось айцец В.Аношка па вайне жыў у Польшчы пад наглядам спэцслужбаў. У яго памяшканьні неаднойчы чынілі ператрусы. Успаміны пісаць ён ня мог. Дарэчы, як нам нядаўна стала вядома, выехаў а.Аношка ў Польшчу не ў 1944 г., а не пазьней за вясну 1943-га, пры дапамозе сябра ЦК БНП Барыса Рагулі. Адзін з былых рагулёўцаў сьцьвярджае, што а.Аношка ратаваўся ад магчымага арышту (а.Гарошка жыў і працаваў у Баранавічах да лета 1944-га).

І апошняе. Зьдзіўляе, што сп.Усошын называе а.Аношку «палітычным змоўнікам». Што кепскага, што ён браў удзел у беларускім супраціве, а экзарх А.Неманцэвіч спрыяў яго місіі? Хіба ўдзел ці спрыяньне антынацысцкай барацьбе — нешта ганебнае ці сарамлівае? Лёгіка аўтара допісу ў «НН» нам не зразумелая.

**Сяргей Ёрш, Сяржук Горбік**

# Апошнія 9000 уніятаў

«Беларусь адыходзіла пад Расею чатырма наваротамі: у 1772, у 1793, у 1795 і ў 1807—33», — пісаў сто гадоў таму зачынальнік нацыянальнае школы гісторыі Вацлаў Ластоўскі. Першыя тры даты ведамыя кожнаму абазнанаму ў гісторыі чалавеку. У гэтых гадах адбываліся падзелы Рэчы Паспалітай, пасля якіх амаль уся тэрыторыя Беларусі апынулася ў Расеі. Але самыя заходнія землі Вялікага княства Літоўскага зь беларускім насельніцтвам — Сапоцкінскі край — у 1795 г. былі забраныя Прусіяй. Мяжа паміж Прусіяй і Расіяй ішла з поўначы па рацэ Нёман да сутоку з ракой Ласоснай (або Ласасянкай). Далей паварочвала на паўднёвы захад і клалася па Ласосьне — так Гарадзенскі павет колішняга Троцкага ваяводзтва ВКЛ быў падзелены дзяржавамі-агрэсарамі. Толькі ў 1807 г., паводле Тыльзіцкага трактату, Прусія перадала расейскаму імпэратару Аляксандру I так званую Беластоцкую вобласьць.



**Паміж Ласоснай і Чорнай Ганчай: Гісторыя каталіцкіх парафій у паўднёва-ўсходняй частцы Аўгустоўскай пушчы** / Андрэй Вашкевіч, Дзяніс Нарэль. — Менск: Зьміцер Колас, 2006

Сапоцкінскі край, паўночна-заходняя частка Гарадзенскага раёну — унікальны субрэгіён Беларусі. Акраец старажытнай Перстунскай (пазьней Аўгустоўскай) пушчы актыўна засяляўся ўсходнеславянскім насельніцтвам, якое асымілявала тутэйшых балтаў. Да 1875 г. уладамі Расейскай імпэрыі тут дапускалася існаваньне і грэка-каталіцкага веравызнаньня, скасаванага на астатняй частцы Беларусі яшчэ ў 1839 г. 9000 грэка-каталікоў Сапоцкіншчыны былі апошнімі этнічнымі беларусамі-ўніятамі. Гісторыі гэтага народу і краю прысьвечаная кніга маладых гарадзенскіх гісторыкаў Андрэя Вашкевіча і Дзяніса Нарэля.

Працаў з гісторыі міжканфэсійных адносінаў у Беларусі вобмаль, а тых, што тычацца гісторыі царквы найноўшага часу, увогуле адзінкі. У манаграфіі распавядаецца гісторыя каталіцкіх і праваслаўных парафіяў у ваколіцах мястэчка Сапоцкін на сучасным беларуска-польска-літоўскім памежжы. Аўтары спасылаюцца на малавядомыя крыніцы на расейскай, польскай, літоўскай мовах. Вось, напрыклад, што пісалі «Литовские епархиальные ведомости» ў 1875 пра наварот беларусаў грэка-каталікоў Сапоцкіншчыны: «Уния была задумана с целью похитить у России и русской церкви их чад: теперь они почти все уже возвратились. Судя по виденному, они уже вполне русские: слово «Царь» так же могущественно действует на них, как и на жителей Московской или Тульской губерний». Ня менш выразныя цытаты падабраныя аўтарамі й з польскіх крыніцаў, у якіх гэты наш край цалкам шчыра лічыўся «польскім».




**Сапоцкіншчына ў 1795-1915 г.**

Уніяцкія прыходы.
Рыма–каталіцкія парафіі.
Уніяты.
Рыма–каталікі.
Мяшанае насельніцтва

Вартасьць для гісторыкаў архітэктуры й культуролягаў мае абноўленая інфармацыя пра храмавае будаўніцтва. Дзякуючы кнізе, факты, выкладзеныя ў ранейшых публікацыях (напрыклад, у кнізе сп.Кулагіна «Каталіцкія храмы на Беларусі», «Зборы помнікаў…» і г.д.), падлягаюць грунтоўнай рэвізыі.

Адраджэньне рэлігійнага жыцьця ў Беларусі часам вяртае старыя міжканфэсійныя прэтэнзіі й забабоны. І аўтары дасьледаваньня былі максымальна тактоўнымі. Гісторыя Сапоцкіншчыны апошніх 600 гадоў, ад русінскага праваслаўя праз Унію да рымскага каталіцызму й польскай нацыянальнай сьвядомасьці, рэканструяваная Вашкевічам і Нарэлем, будзе надзвычай патрэбнаю. Аўтары распавядаюць пра сапраўдны стан справаў, грунтуючыся не на канфэсійных мітах ці нацыяналістычных штампах, а на гістарычных фактах і жывых сьведчаньнях.

Фармат тэмы не дазволіў спыніцца на іншых субэтнічных і канфэсійных супольнасьцях. А шкада: гэтае памежжа багатае старажытнымі традыцыямі юдаізму, ісламу, лютэранства й староверства. Тут было шмат татарскіх пасяленьняў, пераважна хутароў на адну-дзьве сям'і. На Ласосьне, і было першае ў нашым краі селішча мусульманаў-татараў, ажно з XIV ст. Татары жылі ў басэйне ракі Ласасянкі й яе прытокаў — Прорвы, Падліпкі, Каменкі, Круцішкі і Татаркі з Нуркай, або Папіліяй. Найстарэйшымі іх пасяленьнямі на тэрыторыі сёньняшняга Гарадзенскага раёну былі вёскі Чортак і Кадыш на рацэ Чорная Ганча, Малое Дзіміткава ля Ласасянкі, Сьвяцак (Сапоцкінскага сельсавету). У Ласосьне быў і найстарэйшы мячэт ў Рэчы Паспалітай, ведамы ад XV ст. У часы Прусіі з татараў Сапоцкіншчны быў утвораны асобны ўланскі эскадрон у складзе прускага войска. У найноўшы час частка татараў пераехала ў Горадню на Баніфратэрскую вуліцу, перайменаваную ў Татарскую, пасьля ў Сьвярдлова. Гэта асобная вялікая тэма, роўна як жыдоўскае жыцьцё на Сапоцкіншчыне да Галакосту... Чакаем ад маладых гарадзенскіх навукоўцаў чарговых кнігаў.

**Сяргей Харэўскі**

# Сьв. памяці Алены Юрэвіч (22.10.1928 – 02.12.2006)



З днём нараджэньня спадарыню Алену мы заўсёды віншавалі пры канцы кастрычніка. І тут, у Беларусі, і там — у далёкім Нью-Ёрку. Адны — цёплым, сардэчным лістом, другія — сьвяточнай паштоўкай ці тэлеграмай, іншыя — тэлефанічна. Віншавалі яе калегі-навукоўцы, выкладчыкі, часьцей — былыя студэнты. Зь Беларусі, Расеі, Прыбалтыкі, Польшчы, Амэрыкі... Віншавалі і ў гэтую восень. А яшчэ дамаўляліся на спатканьні, тэлефоны і чарговыя лісты, якія цяпер ужо ніколі не напішуцца...

Доктар Алена Юрэвіч нарадзілася 22 кастрычніка 1928 г. у Менску. Сярэднюю адукацыю атрымала ў адной зь менскіх школ на Старажоўцы. Зь дзяцінства спазнала «клопат пра маладое пакаленьне» савецкіх уладаў, якія пры канцы 1930-х гадоў арыштавалі яе бацьку, Казімера Фабіянавіча, і пакінулі на доўгія пятнаццаць гадоў сям'ю на волю лёсу. Потым былі цяжкія і галодныя гады вайны, а яшчэ агеньчык надзеі, што ўсё ліхое аднойчы закончыцца.

У 1954 г. Алена Юрэвіч скончыла філялягічны факультэт БДУ. Паступіла ў асьпірантуру пры Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук, дзе абараніла доктарскую дысэртацыю ў галіне мовазнаўства. Там, у Інстытуце мовазнаўства, на пачатку 1960-х яна прымала актыўны удзел у падрыхтоўцы фундамэнтальнага дасьледаваньня «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы». Яна — адзін з суаўтараў другога тому гэтага дасьледаваньня. У гэтай працы, нягледзячы на неспрыяльныя палітычныя ўмовы і цэнзуру, доктар Алена Юрэвіч увяла ва ўжытак шмат новага матэрыялу, у тым ліку зьвязанага з нацдэмамі і працамі Камісіі па рэформе беларускага правапісу 1926 г. Яна была адной зь нямногіх, хто ў падсавецкай Беларусі меў мужнасьць і грамадзянскую адвагу захоўваць у навуцы навуковасьць, аб'ектыўнасьць і беларускасьць. Не згіналася й не крывіла душой. Ні ў жыцьці, ні ў працы.

З 1968 г. доктар Алена Юрэвіч працавала на катэдры беларускай мовы Менскага пэдагагічнага інстытуту.

Чалавек энцыкляпэдычных ведаў, яна карысталася калясальным аўтарытэтам. Лёгіка мысьленьня, пэдантычнасьць і дакладнасьць доктара Алены Юрэвіч не аднойчы ўражвалі яе калегнавукоўцаў і студэнтаў. Пры ўсім гэтым яна заставалася сьціплым чалавекам.

Так, яе паважалі і любілі выкладчыкі, а яшчэ больш – студэнты.

Доктар Алена Юрэвіч была вельмі адказным чалавекам. І ў працы, і ў жыцьці, і ў сяброўстве. Як згадвае др. Эвеліна Блінава, яе блізкая сяброўка зь Менску, сп-ня Алена і ў сяброўстве была адданая да апошніх сваіх дзён. Нягледзячы на адлегласьці, ніколі не забывалася павіншаваць з днём нараджэньня ці прыслаць прынагодную сьвяточную паштоўку.

Выключная жонка, адданая маці, клапатлівая бабуля, яна была стрыжнем для ўсёй сваёй сям'і — і на Бацькаўшчыне і ў далёкай Амэрыцы.

У лютым 1993 г. Алена Юрэвіч разам з мужам і сынамі настала выехала ў ЗША. Але і за акіянам, у Нью-Ёрку, яна не парывала сувязяў зь беларушчынай, брала ўдзел у навуковай дзейнасьці Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў Нью Ёрку.

Яна не адышла, яна па-ранейшаму з намі.

Бо чалавек не памірае, пакуль жыве ў памяці іншых і ў тым, што пакінуў пасьля сябе.

**Выпускнікі філялягічнага факультэту Менскага пэдінстытуту (1984 г.)**

Рэдакцыя «Нашай Нівы» выказвае самыя шчырыя спачуваньні Лявону Юрэвічу і ягонай сям'і.

# Давід Бранштэйн

У Менску памёр Давід Ёнавіч Бранштэйн, геній клясычных шахмат, чый лёс быў зьнітаваны зь Беларусьсю. Было яму 82 гады. Апошнім часам ён хварэў і закінуў шахматны сьвет, які ўзбагаціў і цудоўнымі камбінацыямі, і дасьціпнымі ідэямі, і літаратурнымі творамі. Для яго шахматы, насупор сучасным тэндэнцыям, былі перадусім часткай культуры.

Цягам 90-х Бранштэйн разьязджаў па сьвеце і даволі пасьпяхова выпрабоўваў сілу кампутарных праграм. Каб Уладзімер Крамнік браў у яго кансультацыі — наўрад ці прайграў бы матч «Фрыцу-10». Аднак стары Давід схаваўся ў менскай кватэры разам з жонкай Тацянай Баляслаўскай, сьцярогся кантактаў з калегамі і рэпартэрамі.



BYCHESS.INFO

Аднойчы мне пашчасьціла сустрэцца з чалавекамлегендай. Было гэта год таму ў шахматным клюбе «Вясьнянка», куды Бранштэйн зрэдчас завітваў. Ён моўчкі хадзіў між столікамі, аб нечым разважаў. Сваю кнігу «Міжнародны турнір гросмайстраў» (1956) падпісаць адмовіўся: «Ат, сярэдненькая кніга...» Тым ня менш, яна была і засталася ясным падручнікам для пакаленьняў.

Давід Бранштэйн быў пахаваны на Чыжоўскіх могілках 7 сьнежня, побач са сваім старэйшым сябрам, менскім гросмайстрам Ісакам Баляслаўскім. Вечная памяць!

**Вольф**

# Вянец змагаркі, вянок пакутніцы

У працяг тэмы, узьнятай у артыкуле Андрэя Павача «Ў пошуках нашай славы, або Гісторыя для беларусаў» («НН», №37).

Гістарычныя міты выдатна функцыянуюць, калі апарат дзяржавы падтрымлівае іх праз сетку адукацыйных установаў, сродкі масавай інфармацыі, грамадзкія арганізацыі, установы культуры. Гэта ў выпадку, калі нацыянальныя палітычныя эліты падзяляюць адныя і тыя ж каштоўнасьці, закладзеныя ў нацыянальных мітах, з астатнімі элітамі (інтэлектуальнымі) і грамадзянамі. Калі гэтая ўмова не выконваецца, то нацыянальны гістарычны міт і яго інтэрпрэтацыя становяцца прадметам ідэйнай барацьбы. Так адбываецца і ў Беларусі цяпер. Нацыянальны міт на сёньня функцыянуе ў рамках інтэлектуальнай супольнасьці, што бярэцца размаўляць з уладай ад імя нацыі з прычыны таго, што першая страціла легітымнасьць гэта рабіць праз свае злоўжываньні, неапраўданую рэпрэсіўную палітыку, ігнараваньне каштоўнасьцяў нацыянальнай ідэалёгіі. Каб аднавіць межы супольнасьці, гэтыя інтэлектуалы займаюцца самавыдавецтвам, распаўсюдам літаратуры, якая ставіць пад сумнеў афіцыйныя дактрыны, карыстаюцца любой магчымасьцю абвясьціць кожнае ўмяшаньне афіцыёзу ў ідэйную сфэру як недарэчнае і кур’ёзнае.

Рабіць гэта няцяжка, бо сёньняшні культ Вялікай айчыннай вайны, заснаваны на татальным ігнараваньні ўсяго, што ня ўпісваецца ў афіцыйны канон, — гэта свайго роду «гісторыя нацыянальнага забываньня», якая на нашых вачах урэшце лягічна дэвальвуецца да таго, што знаходзіць карані беларускай нацыі ў 90-х гадах XX стагодзьдзя, беручы пад ногі ўсё, што было раней.

Трэба адзначыць, што нягледзячы на прамываньне мазгоў, беларусы цікавяцца гісторыяй сваёй краіны. Полацкае княства і Вялікае Княства Літоўскае трывала ўвайшлі ў масавую сьвядомасьць. У даволі значным сэгмэнце беларускага грамадзтва існуе адчуваньне нелігітымнасьці таго, што робяць улады ў розных сфэрах, у т.л. і ідэалягічнай, у носьбітаў альтэрнатыўнага погляду ёсьць прастора для манэўру. Гісторыкам самая пара «перакапаць» у чарговы раз гістарычную канцэпцыю разьвіцьця беларускай нацыі.

Гэта датычыць і фармаваньня гістарычнага «канону і іканастасу» — герархіі лёсавызначальных момантаў разьвіцьці нацыі, гістарычных постацяў, што могуць служыць прыкладамі для сёньняшняга дня, поўніць гонарам нашы сэрцы.

Андрэй Павач справядліва вылучае ў якасьці такога міт змаганьня Заходняй Беларусі як вопыт усьвядомленай нацыянальна-вызвольнай барацьбы. Туляньні беларусаў, дэпартаваных у Расею ў часе Першай сусьветнай вайны, і халодны прыём, аказаны вяртанцам польскімі ўладамі, безумоўна спрыяў іх радыкалізацыі. Але беларускі рух у Заходняй Беларусі набыў масавыя формы ня толькі дзякуючы гэтаму. Нацыянальная інтэлігенцыя займалася актыўнай стваральнай працай. Яна адчувала інтарэсы масы беларусаў і самастойна тварыла нацыянальныя структуры — не такія, што паўставалі з волі таталітарнай улады, а сапраўды самастойныя, накшталт Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. Беларускія сяляне галасавалі за беларускую мову падчас школьных плебісцытаў. Яны адчувалі, што беларускасьць робіць іх паўнавартаснымі людзьмі. Гэта апраўдвалася на ўзроўні штодзённага досьведу. Вось чаму беларуская моладзь бачыла сэнс свайго жыцьця ў ахвяраваньні ім дзеля сваіх суайчыньнікаў. Нацыянальнай супольнасьці, каб адбыцца і быць трывалай, патрэбны вопыт змаганьня і ахвярнасьці. Змаганьне гэтае праяўлялася і ў сілавой, і ў культурнай сфэрах.


камэнтары
Наша Ніва [36] 6 кастрычніка 2006
У пошуках нашай славы, або Гісторыя для беларусаў
Гісторыя змаганьня беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у 1910–1930-я павінна заняць цэнтральнае месца ў патрыятычным выхаваньні моладзі. Піша Андрэй Павач.

Славуты канфармізм, нібыта нацыянальная рыса беларусаў, ва ўмовах Заходняй Беларусі ня быў дамінуючым настроем. Досьвед як хрысьціянскіх дэмакратаў зь Беларускага народнага аб’яднаньня, так і беларусаў-камуністаў з КПЗБ, для якіх нацыянальнае не было чужым, мусіць быць пакладзены ў фундамэнт разьвіцьця грамадзянскае супольнасьці сёньня.

У савецкі пэрыяд рабілася ўсё, каб альтэрнатыўны погляд на гісторыю ня стаў масавым. Асабліва гэта было небясьпечна, калі былі яшчэ жывыя людзі, якія памяталі праўду аб падзеях. Адсюль і палітыка пасьляваеннага перасяленьня ў заходнія вобласьці Беларусі насельніцтва з Расеі. Спрыяньне выезду ці высылкі мясцовай моладзі ў іншыя раёны СССР таксама мусіла паспрыяць разрыву пакаленьняў. Бальшыню старых капэзэбоўцаў, што не загінулі ў 1937—1939 гадах, ня бралі на працу ў дзяржаўныя і партыйныя структуры, баючыся іхняй неляяльнасьці (гэта давеў у сваіх працах гарадзенскі гісторык Сяргей Токць).

Аднак апраўданая гераізацыя барацьбітоў Заходняй Беларусі не павінна памяншаць ролю Ўсходняй Беларусі ў нацыянальным разьвіцьці. Зьнішчэньне беларускага сялянства калектывізацыяй, масавыя забойствы падчас рэпрэсіяў абяскровілі яе ня меней, чым савецкая мабілізацыя часу Другой сусьветнай вайны. Сувязь пакаленьняў была цалкам перарваная ва Ўсходняй Беларусі. Людзі, якія памяталі беларусізацыю, фізычна зьніклі.

Заходняя Беларусь у нашай нацыянальнай міталёгіі заслугоўвае на вянец змагаркі, Усходняя — на вянок пакутніцы.

У будучай Беларусі вуліцы будуць называць у гонар Браніслава Тарашкевіча, Адама Станкевіча і Антона Луцкевіча, а не людзей, для якіх Беларусь ня мела ніякага значэньня.

**Рышард Падарожны, Варшава**

# Дзе і як сустрэць Новы год

Каляды праз два тыдні, а ні сьнегу, ні марозу няма. І не чакаецца, згодна з прагнозамі сыноптыкаў, амаль да канца сьнежня. Таму аматарам лыжаў і санак няма мажлівасьці павесяліцца на вольным паветры. Тых, хто мае грошы на эўрапейскія гарналыжныя курорты, таксама чакаюць няясныя пэрспэктывы. Усходнеэўрапейскія лыжныя трасы дагэтуль не схаваныя пад сьнегам, і невядома, ці запрацуюць яны да Калядаў.

### Афіцыйны Дзед Мароз

Беларускі Дзед Мароз цяпер прымае ня толькі ў Белавескай рэзыдэнцыі, але і ў Менску. У сталіцы ён распачне сустрэчы з бацькамі і дзецьмі 21 сьнежня. Для гадаванцаў дзіцячых дамоў наведваньне рэзыдэнцыі добрага Дзядулі бясплатнае. Навагоднія сустрэчы зь Дзедам Марозам працягнуцца да 31 сьнежня.

Дарэчы, Рэзыдэнцыя беларускага Дзеда Мароза ў Белавескай пушчы дзейнічае круглы год без выходных. Працуе адначасова з Музэем прыроды парку – ад 9-й да 18-й. Кошт дзіцячага і дарослага квітка складае 6,5 і 15 тысячаў рублёў адпаведна. Наведваньне рэзыдэнцыі можна сумясьціць з экскурсіяй непасрэдна па Нацыянальным парку. Прымаюцца групы колькасьцю ня менш за 10 чалавек.

### Калядныя канцэрты

**25 сьнежня** (панядзелак) у Менску «Старыя Ольса». Падрабязная інфармацыя на Тузіне Гітоў – http://music.fromby.net/events/.

### Дзе можна набыць лясную прыгажуню

У перадсьвяточныя дзянькі елачныя кірмашы будуць працаваць па ўсім Менску. У Заводзкім раёне – па адрасе пр.Партызанскі, 99; Кастрычніцкім – вул.Ландэра,4; вул. Казінца, 6а; Ленінскім – пр. Ракасоўскага, 2; Маскоўскім – пр. газэты «Звязда», 40, Партызанскім – бульвар Трактарабудаўнікоў; Першамайскім – вул.Шугаева, 3/1; Фрунзэнскім – вул.Прытыцкага, 42 і Кальварыйская, 24; Цэнтральным – вул.Няміга, 8.

Між іншым, наступаючы 2007-ы год паводле ўсходняга календара будзе годам Чырвонай Агнявой Сьвіньні. Згодна з паданьнем, Сьвіньня апошняй прыйшла на сьвяткаваньне Новага году, таму яна й замыкае 12-гадовы цыкл усходняга календару. Кітайцы кажуць: няможна ставіць на стол стравы са сьвініны. Але як той аматар сьвежыны казаў, «што нам, кабанам»?

**Сямён Печанко**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Калядныя ялінкі па-беларуску

**26 сьнежня** сайт «Нашы дзеткі» запрашае ўсіх у Менск у кавярню «Жар-птушка» (што ў Цэнтральным дзіцячым парку). Тут з 11-й да 14-й гадзіны пройдзе **Беларуская ялінка** для маленькіх і вялікіх дзетак з удзелам актораў Тэатру юнага гледача, выступам калядоўшчыкаў, конкурсамі, сюрпрызамі і салодкім сталом.

Колькасьць квіткоў абмежаваная. Зьвяртацца да **20 сьнежня** праз маб.: 784-63-13, 911-78-87 (Наста); 403-15-35 (Натальля).

Калі вы жадаеце запрасіць Сьвятога Мікалая (Дзеда Мароза, Санту Клаўса, Зюзю) у сьвяточныя дні дахаты – пішыце на адрас n.dzietki@yahoo.com.

Можа, Вы хочаце далучыцца да калядоўшчыкаў, альбо ня супраць запрасіць іх у сваю сям'ю (арганізацыю)? Пішыце dzietki@gmail.com, ці тэлефануйце на маб. 331-71-80 (Юля).

Таксама прапануем вам паўдзельнічаць у конкурсах Сцэнароў навагодняга сьвята і Найлепшых калядных фатаздымкаў.

Прапановы і пытаньні адрасуйце на n.dzietki@yahoo.com ці на маб. 632-27-43 (Крысьціна).

Варта адзначыць, што беларускамоўныя калядныя сьвяты для дзяцей традыцыйна ладзяць і каталіцкія ды ўніяцкія парафіі сталіцы.

### Беларуская ялінка ў Горадні

**26 сьнежня а 17.30** адбудзецца **Беларуская ялінка ў Горадні** (Палац тэкстыльшчыкаў). Ахвотныя мусяць скантактавацца з Ігарам Кузьмінічам: маб. 629-92-13, ikuzminich@yahoo.com

## Зюзя ці Дзед Мароз?

Недалёка ад вёсачкі Пруднікі на Пастаўшчыне другую зіму дзейнічае лясная сядзіба старажытнабеларускага бога холаду і марозу Зюзі. Да Зюзі сёлета маюць далучыцца іншыя паганскія бостваы – Завея, Напасьця, Ледавік і Агнявік. Гасьцей Зюзі чакае экскурсія па сядзібе, тэатралізаванае прадстаўленьне, ласункі. Летась Зюзю наведала 1600 чалавек.

Зюзя ўяўляўся беларусам наступным чынам: ён, кажуць, стары зь белымі, як сьнег, валасамі, і такой жа даўжэзнай барадой, нізенькага росту, тоўсты; увесь у белай цёплай вопратцы; ногі ў яго босыя і галава нічым не пакрытая. У руцэ носіць жалезную булаву. Зюзя ўзнімаў завіруху, мяцеліцу, выклікаў сьцюжу, маразы. Прыкладна ў такім выглядзе Зюзя і будзе сустракаць гасьцей у сваёй рэзыдэнцыі.

**Зьміцер Панкавец**

# Зацірка

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**

Гэта адна з самых знакавых беларускіх страў, хаця знакавасьць тая дзіўнага кшталту. Яна праяўляецца ня ў тым, што зацірку часта гатуюць, — хай адгукнуцца тыя, хто памятае, калі еў зацірку апошні раз. Затое на зацірку часта спасылаюцца як на нейкі сакральны нацыянальны міт. У беларускіх савецкіх кулінарных кнігах яна запаўняе вакансію нацыянальнага супу, а ў апошнія гады на яе сталі сьпісваць віну за няўдачу адраджэнскага праекту XX ст. Прыкладам, філёзаф В.Акудовіч часта прыводзіць «Пяць лыжак заціркі» Зьмітрака Бядулі ў адным шэрагу з «каўтуном», «занядбанымі хаткамі» і «балотам» і пры гэтым чамусьці вінаваціць у стварэньні такога вобразнага шэрагу Ф.Багушэвіча.

Хацелася б рэабілітаваць Мацея Бурачка, сумленнага віленскага адваката і таленавітага журналіста, «левізна» якога ніколі не выходзіла за межы памяркоўнай сацыял-дэмакратыі, а росквіт таленту прыпаў на гады глябальнага аграрнага крызісу. Тады ў Беларусі абрынулася больш чым трохсотгадовая монакультура збожжа, да чаго гаспадарка і селяніна, і шляхціча прыстасавалася не адразу. Гэты трагічны перапом мяжы 1880—1890-х у сьвядомасьці былога паўстанца 1863 г. адбіўся балюча і выліўся на паперу ня толькі беларускімі вершамі і апавяданьнямі, але і цалкам «пазытывісцкімі» допісамі ў пецярбурскі «Край»; нізкія цэны на збожжа і маруднасьць сярэдняй заможнасьці гаспадара ў адаптацыі да новых рынкавых умоваў непакоілі яго значна болей, чым захаваньне для нашчадкаў традыцыйнага паганскага сьветапогляду прыгоннага селяніна — падмена каштоўнасьцяў, пра якую кажа В.Акудовіч, адбылася пазьней, ужо не за Сымонам Рэўкам.

Але і ў абарону заціркі хацелася б сказаць некалькі слоў. Так, ёсьць у беларускай мове і прыказка: *лахман не адзежа, зацірка ня ежа*. А паэт Уладзімер Жылка, успамінаючы галоднае пачасту дзяцінства, дэкляраваў:



> Зацірка мне была прысмакам,
> І смачны быў разовы хлеб…

Так што асацыяцыя заціркі зь беднасьцю і нястачай узьнікла сапраўды не ў XXI ст. Але што такое насамрэч зацірка? Напрыклад, сучасныя расейскія кулінарныя лексыконы вызначаюць гэтую страву як *похлёбку из муки, разведённой водой, в основном у украинцев и белорусов*. Сапраўды выглядае досыць мізэрна. Вясной, калі мукі заставалася ўжо вельмі мала, каб пячы хлеб, яе пачыналі ашчаджаць, і, каб падмануць галодныя страўнікі, варылі вельмі простую страву. Пра галадуху гаварылі: «Ядуць пустую зацірку» (зацірку, не прыпраўленую ні малаком, ні салам). Такую зацірку называлі яшчэ «баўтуха» або «калатуха». Што ж, праўда, усё гэта было, і менавіта такі вобраз заціркі штампам адбіты ў сьвядомасьці сучасных беларусаў, асабліва тых, хто ані гэтай стравы ня есьць, ані больш сур'ёзнай кулінарнай літаратуры не чытае. Але ці ўся гэта праўда пра зацірку?

Бо калі зацірка — гэта проста боўтанка з мукі і вады, хай сабе калі-нікалі і забеленая малаком, дык адкуль тады такая назва? Нешта ж тут заціралі? Талерку зь нішчымнай заціркай заціралі лыжкай да дзірак? Двойка, адраджэнец-аматар з постмадэрнісцкага мэгаполісу!

Першасная зацірка — гэта маленечкія клёцкі з мукі, яек і вады, якія доўга *заціралі*, перш чым адварваць у вадзе. Па-польску такія клёцкі называюцца ў множным ліку — *zacierki*, і служаць яны кампанэнтам многіх страваў, і ня толькі вадкіх. Яшчэ кулінарныя запісы фальклярыстаў Нікіфароўскага і Шэйна, акурат напярэдадні вялікага сусьветнага аграрнага крызісу, які так паўплываў на творчасьць Мацея Бурачка, фіксуюць менавіта такую зацірку-клёцкі: «Зацірка гатуецца з прэснага пшанічнага, грэцкага і ячнага цеста, якое праціраецца праз рэшата або паміж рук, адкуль падае невялікімі драбінкамі на падасланае палатно. Калі драбінкі падвянуць і крыху зацьвярдзеюць, іх вараць, хаця і нядоўга, як суп, — з маслам, салам і зрэдку зь мясам... Гэтыя нарыхтоўкі часта робяцца загадзя і захоўваюцца ў мяшочках на пячы і побач зь ёю, каб даўжэй зьберагчы ад псаваньня».

Істотнае ўдакладненьне! Калі адзін полюс «плянэты Зацірка» можна сынанімічна назваць «калатуша» (а гэтым словам па-беларуску называюцца і рэдкая зацірка-боўтанка з вады і мукі, і гразкі бруд), дык другі, роднасны шляхецкім клёцкам, пачуваецца зусім ня кепска. «Адны плачуць, што зацірка рэдкая, а другія — што пэрліны задробныя», — кажа яшчэ адна беларуская прыказка. Але, як выяўляецца, і сама зацірка (як, зрэшты, і пэрліны) — гэта цэлы дыяпазон дабрабытаў, дасканаласьцяў гаспадыні, адчуваньняў гармоніі з навакольным сьветам. Калі ўжо зацірку нарыхтоўвалі ў запас, укладаючы ў гэта крыху больш працы, дык ці карэктна лічыць яе эталённым знакам бяды, прынамсі, не разабраўшыся ва ўсіх сэнсавых адценьнях слова?

Зацірка як страва магла ўзьнікнуць адначасова ў многіх народаў. І не палякі, як выглядае, яе вынаходнікі. Нідзе, прынамсі сярод блізкіх ад нас народаў, гэтая страва ня мае такой вялікай папулярнасьці, як у вугорцаў. Вугорская зацірка называецца *тархоня* — дастаткова зірнуць у любую кнігу, якая хоць павярхоўна апісвае вугорскую кухню, каб пераканацца, што тархоня — візытоўка Вугоршчыны амаль у той самай ступені, як дранікі — Беларусі. І прытым яе ніхто не саромеецца! Вугорцы ўважаюць, што гэтая страва мае турэцкае паходжаньне. Цалкам магчыма. Тым больш што ёсьць падобныя стравы і ў іншых цюркскіх народаў, як, напрыклад, у башкіраў *бауырљаc* — дробныя камячкі зь цеста, замешаныя на яйках, вараныя ў алеі. Але паколькі падобныя стравы вядомыя і ў харватаў, і ў італьянцаў, можна аспрэчваць і цюркскае аўтарства... у гісторыі кулінарыі ёсьць яшчэ безьліч недасьледаваных старонак. Напрыклад, ня так ужо моцна адрозьніваецца ад заціркі і тархоні і *кускус* Паўночнай Афрыкі, якія, праўда, гатуецца з сумесі мукі і маннай крупы. А простая зацірка-ка-

латуша вядомая і ў расейскіх карэлаў пад назвай *загуста*. Так ці інакш, за некалькі стагодзьдзяў тархоня ператварылася ў нацыянальную вугорскую страву, якая ў пэўнай ступені замяняе рыс у розных ягоных ужытках, у тым ліку як гарнір да мяса.

Хатняя тархоня гатавалася прыкладна так: з 1 кг мукі і 4 яек замешвалася крутое цеста і праціралася праз рэшата. Атрыманыя камячкі цеста сушыліся на палатнянай посьцілцы на сонцы, а потым захоўваліся ў палатняных мяшэчках... знайдзеце хоць адно адрозьненьне ад запісаў Шэйна і Нікіфароўскага зь Віцебскай і Магілёўскай губэрняў! Ці не ад вугорскай тархоні польскія зацеркі і беларуская зацірка?

А чаму я пішу пра хатнюю тархоню ў мінулым часе? Таму што ніхто сёньня ня робіць гэтай рутыннай працы ўручную, тархоня ў сучаснай Вугоршчыне вырабляецца фабрычна і прадаецца ў любой краме ўжо фасаванай. (Цікава, ці малююць яны на пачках вугорскага мужыка-гаротніка?) Можа, беларусы, якім даводзілася бываць у Вугоршчыне, ня раз і бачылі гэтую тархоню, адно што наўрад ці ім прыходзіла ў галаву, што гэта тая самая загадкавая ды няўлоўная зацірка. Цікава, што паваенныя даведнікі ў беларускай савецкай кулінарыі сарамліва называюць клясычную зацірку-клёцкі «крупа домашняя», відаць, каб ня збэсьціць гарманічны вобраз заціркі — сакральнай ежы Гаруна, Бядулі і Журбы.

Для прыгатаваньня клясычнай тархоні (не паўфабрыкату, але гатовай стравы) трэба ўзяць лыжку шмальца, заправіць молатай папрыкай і сольлю, растапіць на патэльні, пакласьці тархоню і падпражыць яе, але не да цёмна-карычневага колеру. Потым уліць крыху вады і варыць да мяккасьці. Калі вады будзе зашмат, тархоня ператворыцца ў пюрэ, а яна мусіць захаваць кансыстэнцыю. Падаваць яе трэба неадкладна, інакш яна згубіць свой непаўторны смак. Тархоня можа быць як гарнірам, так і самастойнай стравай, закрашанай смажаным вэнджаным салам або скваркамі. Да тархоні пасуе таксама таматны соўс. З салам, як ведаем, нярэдка гатавалі зацірку і беларусы — асабліва часта такая зацірка сустракаецца ў творах Элізы Ажэшкі.

«Аўдоцьця павесялела і залапатала:

— Ну вось, зараз табе будзе і агонь, і вячэра, і ў хаце пацяплее. А сала ў цябе ёсьць? Хіба зацірку з салам зварыць? Бо як бульбу пачну абіраць, дык ты да паўночы галодны будзеш. А з заціркай работа кароткая!» («Хам»).

Зацеркі-крупа ў польскай кухні маюць больш шырокі ўжытак, чым у зафіксаваным беларускім каноне. Напрыклад, вядомая польская каша-гарбузянка з дадаткам зацерак... але я асабіста ня маю пэўнасьці, што мяжа распаўсюджаньня такога рэцэпту заўжды супадала хоць зь дзяржаўнай (узораў 1921, 1939 або 1944 г.), хоць з этнічнай мяжой Беларусі. Тут пытаньні хутчэй да складальнікаў Беларускага Канону, і наўрад ці першым у шэрагу адказьнікаў мусіць стаяць абылганы Мацей Бурачок... Зрэшты, даруем па-хрысьціянску і ім, і той шчыра-хітрамудрай суседцы Сьцёпчысе, якая роблена-наіўна аб'ела Агату і яе дзетак на *5 лыжак зацірκі*. Але будзем ужо мудрэйшымі, калі сутыкнемся з гэтымі *шчырымі* хітрыкамі наступным разам. Не дамо болей сябе ашукаць.



### Зацірка на малацэ кананічная

*1,5 шклянкі мукі,*
*1—2 яйкі,*
*40 г сьметанковага масла,*
*6—7 шклянак малака,*
*(цукар — 1 ст. лыжка як опцыя),*
*соль.*

Прасеяную пшанічную муку падсмажыць на патэльні бяз масла да сьветла-карычневага колеру, дадаць трошкі вады, яйка, масла, соль, старанна перацерці. Атрыманыя камячкі цеста засыпаць у рондаль з кіпячым малаком. Варыць 5—7 хвілін на невялікім агні, памешваючы. Калі трэба, дадаць соль на свой густ.

(Гэты рэцэпт вы знойдзеце ў любой беларускай кулінарнай кнізе; падазрона, аднак, што ў ягонай расейскамоўнай вэрсіі дзіўным чынам кудысьці зьнікае згадка пра само *заціраньне*, застаецца толькі «размешать муку с водой и яйцами, влить в кипящее молоко и варить 10—15 минут при непрерывном помешивании».

Няўжо нехта пільна сочыць за тым, каб беларуская зацірка ўспрымалася выключна як гамагенная боўтанка з мукі і вады, але ні ў якім разе як клёцкі? Можа быць, на такі лёс асуджана і беларуская культура ў цэлым?)

### Зацірка грэцкая па-віленску

*1 шклянка грэцкай мукі,*
*0,5 шклянкі пшанічнай мукі,*
*соль,*
*6—7 шклянак малака.*

Старанна зьмяшаць абедзьве мукі, дадаючы соль, потым уліць крыху кіпеню — столькі, каб паглынула цеста, і старанна пераціраць драўлянай лыжкай, так доўга, каб паказаліся бурбалкі. Пакінуць цеста «адпачыць» у прахалодным месцы. Пацерці на грубай тарцы на камячкі, варыць у малацэ як у папярэднім рэцэпце.

### Сяржук Вітушка. Зацірка

Аднаго разу зайшоў на кухню й бачу, як бацька варыць зацірку. Гэта было дзіва. Я прывык бацьку бачыць, калі ён кіруе машынай, ці косіць касою, ці сякерай працуе. А тут у дужых бацькавых руках лыжка, і ён спрытна-спрытна заціpае тыя клёцачкі для заціркі.

«Ня дай Бог усё рабіць, але дай Бог усё ўмець», — пажартаваў бацька й навучыў нас рабіць зацірку.

Цяпер мне гэтая прыказка надта прыдалася. Я моцна захварэў, мушу трымаць дыету, і ня тое што адзін дзень ці два, а з дня ў дзень, усё жыцьцё. І сам сабе гатую цяпер ежу. Стаю каля пліты й згадваю бацькаву прыказку: «Ня дай Бог усё рабіць, але ўсё ўмець». Прыяжджайце да мяне ў госьці, і вас пачастую сваёй заціркай.

## ДЖЭЦІ



ВЕРА БУРЛАК, 5 ГОД

**1**

**— Бу-бу-бу! — машына едзе,**
**— Бу-бу-бу! — па белым сьвеце,**
**— Бу-бу-бу! Бу-бу-бу!**
**Я ўсё сьмецьце заграбу!**

**2**

**Нешта едзе і сьпявае:**
**«Па-лі-ва-ю, па-лі-ва-ю!»**
**Вай! Вай! Вай! Вай!**
**Ты ж мяне не палівай!**

**3**

**Граюць рэйкі: та-ра-рай!**
**Едзе новенькі трамвай.**
**«Гру-гру-гру», — грукочуць рэйкі:**
**Гэта йдзе трамвай старэнькі.**



ГАННА ПАМАНАВА, 5 ГОД

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Вайна пасьля партызанкі

**Вецер, які гайдае верас** (The Wind That Shakes the Barley).

Ірляндыя—Вялікабрытанія—Францыя, 2006, каляровы, 124 хв.

**Рэжысэр**: Кен Лоўч.

**Ролі выконваюць:** Кіліян Мэрфі, Лаям Канінгем, Пэдрэйк Дэлані.

**Жанр:** партызанская драма.

**Адзнака:** 7,5 (з 10).

Акупанты забіваюць хлопца за гаворку на роднай мове, зьдзекуюцца з жанчынаў, рабуюць. Мужчыны бяруць у рукі зброю і сыходзяць у партызаны.

Гэта Ірляндыя, лёс якой шматкроць параўноўвалі зь лёсам Беларусі. 20-я гады мінулага ст. Нацыянальна-вызвольная барацьба.

Герой карціны Дэміен (Кіліян Мэрфі) зьбіраўся зрабіць кар'еру лекара ў Ангельшчыне, але далучыўся да свайго брата-паўстанца. Лёгіка вайны прымушае глядзець скрозь прыцэл — і неўзабаве брат страляцьме ў брата.

Карціна насычаная ірляндзкім нацыянальным колерам — зялёным, кадры патанаюць у тумане, але рэжысэр стужкі далёкі да сымбалізму й містыкі.

«Пралетар» Яе Вялікасьці Кен Лоўч падрабязна паказвае сацыяльныя чыньнікі вызваленчага змаганьня: беднасьць і абразы, барацьбу розных кірункаў за новае прышлае і клясавую расстаноўку сілаў. Ён не шкадуе фарбаў, каб паказаць ангельскіх акупантаў зьвярамі, якія вырываюць у ірляндцаў пазногці (хаця рэжысэр і не вучыўся па партызанскіх беларускіх карцінах).

Але для рэжысэра важны чыньнік гуманнасьці. Калі зацятая барацьба пераходзіць у зьмярцьвеласьць сэрца, калі перакрочваецца мяжа? Герой Кіліяна Мэрфі перакрочвае гэтую мяжу, калі забівае свайго сябра, амаль дзіця, які заблытаўся і выдаў сваіх таварышаў.

Ангелец Лоўч не хавае сымпатыяў да ірляндзкіх паўстанцаў, але называе й кошт і ніколі не забывае, што па той бок барыкадаў — брат. Для партызанскага беларускага кіно гэтая ідэя гучыць усё яшчэ не банальна.

Карціна ўзнагароджаная ў Канах, хаця збольшага гэта ацэнка творчасьці Кена Лоўча наагул; нядаўна фільм прывячалі й на «Лістападзе».

Сэансы ў Менску: «Дом кіно» 12—17 сьнежня а 19.00.

# Мамонаў і Філарэт

**Выспа** (Остров).

Расея, 2006, каляровы, 112 хв.

**Рэжысэр:** Павал Лунгін.

**Ролі выконваюць:** Пётар Мамонаў, Віктар Сухарукаў, Дзьмітры Дзюжаў, Ніна Усатава.

**Жанр:** драма.

**Адзнака:** 7 (з 10).

Герой карціны (Пётар Мамонаў) падчас вайны, каб выратаваць жыцьцё, забівае сябра. І вось ужо трыццаць гадоў у манастыры ён каецца Богу за свой грэх.

Павал Лунгін зрабіў фільм, дзе галоўная тэма — сьвятасьць, а героі стужкі — праваслаўныя манахі. У кожнага з герояў — свой шлях да Бога. Анатоль — у геніяльным выкананьні Пятра Мамонава — гэта юродзівы з каскадам атракцыёнаў і пакутлівым болем у вачох.

Віктар Сухарукаў (Філарэт) — ціхмяная й цёплая сьвятасьць, якая ўсё прабачае й усё даруе (выбітны кантраст з папярэднімі ролямі актора). Герой Дзьмітрыя Дзюжава, хаця ня мае надзвычайных дароў, — гаспадарнік і адміністратар.

У манастыр цягнуцца й цягнуцца людзі са сваім болем й праблемамі. Кожны візыт пераўтвараецца ў цуд і ненавязьлівае павучаньне з усімі адценьнямі народнага хрысьціянства.

Як паказаць на экране малітву? Сьвятасьць? Прысутнасьць Бога?

На пальцах адной рукі можна пералічыць карціны, дзе гэта напоўніцу атрымалася.

Павал Лунгін — далёка не Таркоўскі і не Брэсон. Ён карыстаецца галівудзкімі мэтадамі, робіць акцэнт на драматургіі й вонкавай відовішчнасьці. Ягоныя карціны (пачынаючы з «Таксі-блюзу», калі ўпершыню склаўся дуэт Лунгіна і Мамонава) — гэта сэнсацыйныя маральныя праблемы — і тлустае іх падкрэсьліваньне.

Духоўныя асобы мо папракнуць Лунгіна недакладнасьцю ў асобных дэталях. Кінаэстэты накінуцца на рэжысэра з кулакамі за тандэтнасьць і сьлёзавыцізкальнасьць.

Але ці не зашмат патрабаваньняў да лемантара, дзе яскравымі фарбамі выведзеныя толькі першыя літары?

Грэх, пакаяньне, дараваньне...

Ідзеце й пaглядзеце.

Сэансы ў Менску: «Мір» 12—13 сьнежня а 18.30 і 20.40, 14—17 сьнежня а 18.30.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 16 сьнежня

**«Лад», 09.25**

«Пра Чырвоны Каптурок».

Беларусь, 1979, рэж. Леанід Нячаеў.

Музычная казка, 1-я сэрыя.

Клясычная казка «Беларусьфільму», на якой узгадавалася не адно пакаленьне дзетак. І ўзгадуецца яшчэ.

**БТ, 19.15**

«Гісторыя каханьня».

Францыя—Вялікабрытанія, 2002, рэж. Даніэль Томпсан.

Рамантычная камэдыя.

Бізнэсовец Фэлікс сьпяшаецца да любай жанчыны. Роза ўцякае ад нялюбага мужчыны. У аэрапорце яны сустрэліся і мусяць быць разам, пакуль ня скончыцца страйк. Чым завершыцца вымушанае сяброўства?

Палюбоўны дуэт склалі Жан Рэно і Жульет Бінош.

**СТВ 20.10**

«Я, робат».

ЗША, 2004, рэж. Алекс Прояс.

Фантастычны дэтэктыў паводле Айзэка Азімава.

Фантаст Азімаў прыдумаў тры законы робататэхнікі. Першы закон – машына ня мусіць рабіць чалавеку шкоды. Але дэтэктыў Джон (Ўіл Сьміт) расьсьледуе справу робата Сані, якога падазраюць у забойстве. Паводле законаў гэтага быць ня мусіць. Няўжо чалавецтва пад пагрозаю?

### Нядзеля, 17 сьнежня

**«Лад»**

«Фантамас супраць Скотлэнд-Ярду».

Францыя—Італія, 1966, рэж. Андрэ Юнэбэль.

Прыгоды.

Фантамас вырашыў абкласьці данінай усіх багацеяў... Хаця імпэт аслабеў — маскі ўсё тыя ж.

**АНТ, 21.35**

«Майкл».

ЗША, 1996, рэж. Нора Эфран.

Фантастычная мэлядрама.

Два журналісты атрымліваюць ліст з правінцыі, дзе гаворыцца, што ў мясцовым гатэлі паўгоду жыве анёл з крыламі.

Героі выяжджаюць на месца. У гатэлі сапраўды жыве арханёл Міхаіл (у выкананьні Джона Траволты)...

**Андрэй Расінскі**

## КАНЦЭРТ

### Мельнікаў сьпявае ў сталіцы

**17 сьнежня а 15-й гадзіне** — Андрэй Мельнікаў у «Доме Ваньковічаў» (Інтэрнацыянальная, 33а). Уваход па музэйных квітках.

## ЛЕКЦЫЯ

### Лекцыя «Беларускі клясычны правапіс»

**14 сьнежня а 19:00** у сядзібе Партыі БНФ (Варвашэні, 8) адбудзецца лекцыя Зьмітра Саўкі «Беларускі клясычны правапіс: сучасная нармалізацыя. Чаму так, а ня йнакш: абгрунтаваньне кадыфікацыйных рашэньняў».

Запрашаюцца ўсе ахвотныя!

## Дыскатэка з «Старым Ольсам»

**25 сьнежня** ў клюбе «Арэна» (Талбухіна,4) пройдзе сярэднявечная дыскатэка з гуртом Стары Ольса. **Пачатак 19:00.** Квіткі ад 10 000 да 15 000.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ТЭАТРЫ

**опэра**

*на сцэне Цэнтральнага Дому афіцэраў*

**22 (пт)** — «Трубадур».

*малая заля імя Р. Шырмы Белдзяржфілярмоніі*

**21 (чц)** — Вечар старадаўняй музыкі.

*на сцэне Палацу Рэспублікі*

**19 (аўт)** — Вялікі Калядны канцэрт беларускай опэры.

**Купалаўскі тэатар**

**16 (сб), 17 (ндз)** — «Макбэт».

**18 (пн)** — «Маэстра».

**20 (ср)** — «Вечар».

**21 (чц)** — «Сымон-музыка».

**22 (пт)** — «Чычыкаў».

**23 (сб), 24 (ндз)** — «Чорная панна Нясьвіжу».

*малая сцэна*

**20 (ср)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**21 (чц)** — «Варшаўская мэлёдыя».

**Тэатар беларускай драматургіі**

*на сцэне РГД Прафсаюзаў*

**15 (пт)** — «Адэль».

**19 (аўт)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».

**20 (ср)** — «Містэр Розыгрыш».

*на сцэне РТБД*

**23 (сб)** — «Адвечная песьня».

**24 (ндз)** — «Адэль».

**Тэатар юнага гледача**

**15 (пт)** — «Марныя намаганьні каханьня».

**16 (сб)** — «Жураўліныя пёры».

## НАШЫ ШАШКІ

# «А прыз купі сам!»

Пераможцу першай лігі па шашках-100, 28-гадоваму таваразнаўцу Андрэю Маісееву на закрыцьці турніру сказалі словы, вынесеныя ў загаловак. У сучасных умовах гэта амаль афарызм. Малады майстар абышоў мноства старэйшых калегаў — і атрымаў ад Беларускай фэдэрацыі шашак дыплём, сьпехам раздрукаваны на друкарцы Палацу шахмат і шашак. Зрэшты, сп.Маісееў мудра прызнаўся нам, што для яго шашкі — гэта хобі, а не крыніца заробку.

Сярод жанчын першае месца прадказальна заняла Вольга Федаровіч. Яе сястра Дар'я — 7-я ў мужчынскім турніры, што ёсьць безумоўным посьпехам: яна апярэдзіла, сярод іншых, чэмпіёнку Беларусі Ірыну Пашкевіч і цяпер мае шанец увесну пазмагацца ў найвышэйшым дывізіёне. А прагрэсуюць 14-гадовыя блізьніцы хутка, як мала хто. На іх спадзяваньні аматараў шашак пасьля эміграцыі экс-чэмпіёнак сьвету Алены Альтшуль, Зоі Голубевай і Людмілы Сахненкі...

Аднак нехта едзе і да нас. Слынны гросмайстар Габрыэлян, які мусіў эміграваць з Азэрбайджану, знайшоў сябе ў Беларусі і трактуе вышэйпададзены афарызм ня так, як БФШ. У лістападзе ён зладзіў у Мар'інай Горцы, дзе мае бізнэс, камандны турнір па шашках-64 для падлеткаў. Пераможцам дасталіся CD-плэеры, дзяўчатам — касмэтыка, а ўсіх удзельнікаў спонсар карміў у рэстарацыі. Першае месца ў гэткіх «цяплічных» умовах заняла каманда Харкаву — моцныя кандыдаты ў майстры. Другое, трэцяе — у Ваўкавыску і Вільні, менчукі толькі пятыя з васьмі. Яны штодзень вярталіся дахаты, дык давялося рана ўставаць, каб пасьпець на электрычку да Пухавічаў — як сьлед не высыпаліся.

**ВР**

### Ваш ход

А.Маісееў—І.Пашкевіч. Менск, 2006. Чорныя згулялі 1...8—12...



**Адказ:** знайшлася прасьценькая (на думку калегаў А.Маісеева) камбінацыя 2. 27—22 18:27 3. 32:21 23:41 4. 21—17, і як бы чорныя ні пабілі, пасьля 5. 42—37 белыя прарываюцца ў дамкі, выйграюць. Чаму шматвопытная гросмайстарка ня ўбачыла ўдару? Мо таму, што была стомленая грамадзкімі справамі: спн.Пашкевіч — старшынька фэдэрацыі шашак.




Нашаніўскі каляндар з фатаздымкамі Андрэя Лянкевіча і Юліі Дарашкевіч
Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў і на www.knihi.net

## ЧЫТАНЬНІ

### Хадановіч і Радзівонаў

**16 сьнежня ў18.00** у Пушкінскай бібліятэцы (вул.Гікала, 4) — імпрэза з цыклю вечароў беларускай і расейскай паэзіі «Насустрач». Чытаньні ладзяць Андрэй Хадановіч і расейскі паэт Андрэй Радзівонаў. Уваход — 2000 рублёў.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

### Новы «Паміж»

**19 сьнежня** ў бары «ЁЁ» на Чкалава, 12 адбудзецца прэзэнтацыя часопіса «Паміж» № 5. Бяруць удзел: Алесь Анціпенка, Валянцін Акудовіч, Марыйка Мартысевіч, Серж Мінскевіч, Аксана Спрынчан і Віка Трэнас. **Пачатак у 18.00.**

**У сьвежым нумары «Паміжу»** спрэс перакладная літаратура. Тэкставую частку адкрывае пераклад лекцыі Жака Дэрыды «Difference». У паэтычнай частцы — пераклады з Галчынскага, польскіх паэтаў 1980—90-х, Джыма Морысана, расейскай клясыкі — Ахматавай, Пастэрнака, Северяніна. Празаічную частку адкрывае пераклад навэлі славенскага пісьменьніка Міха Мацыні «Тутэйшасьць». Яго твор упершыню друкуецца кірыліцай дбаньнем работніка «НН» Андрэя Кузьнечыка. Таксама ў нумары: «Сьвінцовы век» канадыйкі Маргарэт Этвуд, уладальніцы Букераўскай прэміі, пераклады з амэрыканскіх пісьменьнікаў Эндру Шона Грыера і Аляксандра Хемана, украінца Тараса Прахаські і інш.

Часопіс навучэнцаў і выкладчыкаў Беларускага калегіюму робіць заяўку на месца беларускага адпаведніка «Иностранной литературы». Але, каб гэтага дасягнуць, пэрыядычнасьці адзін нумар на год замала. Наклад часопісу ўсяго 299 экз., варта дбаць пра яго набыцьцё ўжо зараз.

**ЗП**

## КРЫЖАВАНКА




**Па гарызанталі: 2.** Расейскі журналіст, які ўручаў нашаніўцам прэмію імя Завадзкага. **7.** Гарадок пад Менскам. **9.** Дынастыя інтэлектуалаў з Ракава. **10.** … Глёбус. **12.** Кармавая культура. **15.** Расьліна, апетая А.С. Пушкіным. **18.** … Барадулін. **19.** Фантаст … Кларк. **20.** Папярэдні малюнак, не эскіз. **21.** Старадаўняя таксоўка. **22.** Ізраільскі клясык, набэліст 1966.

**Па вэртыкалі: 1.** Прадстаўнік качавога народу ў Арменіі (гл. рэпартаж А.Лянкевіча ў «НН» № 27'05). **2.** Прывабнасьць. **3.** Літаратар, аўтар «Абыпраштосек». **4.** Смачная марская рыбка. **5.** Аблічча, выгляд. **6.** Тоўсты брус. **10.** Сьпешная работа. **11.** Музычны інструмэнт з мноствам трубак. **13.** Арганічнае рэчыва, вядомае ўсім бэнзынавым гандлярам. **14.** Мітычная птушка і псэўданім пісьменьніка У. Набокава. **15.** Францускі драматург і паэт, аўтар «Лукрэцыі» (1792). **16.** Італьянская пяюха зь сёлетняга «Славянскага базару». **17.** Выканаўчы орган БНР.

**Склаў Вольф**

**АДКАЗЫ. Па гарызанталі: 2.** Шарамет. **7.** Узда. **9.** Рагойшы. **10.** Адам. **12.** Рапс. **15.** Анчар. **18.** Рыгор. **19.** Артур. **20.** Накід. **21.** Ландо. **22.** Агнон. **Па вэртыкалі: 1.** Езыд. **2.** Шарм. **3.** Рагін. **4.** Мойва. **5.** Твар. **6.** Слуп. **10.** Аўрал. **11.** Арган. **13.** Актан. **14.** Сірын. **15.** Арно. **16.** Чыкс. **17.** Рада.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перапказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 48 000 рублёў, зможа чытаць «НН» паўгоду.

# Дзякуй

Дзякуй Зьмітру Д., які цяпер у Маскве.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

### На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».




**...Цэнтравыбаркам апэратыўна рэагаваў на яго вэрсіі вынікаў апошніх выбараў...**

1. 21.03.06 — адпаведна са зьвесткамі ЦВК за яго 83%.

2. 18.09.06 — адпаведна са зьвесткамі ЦВК за яго 95%.

3. 23.11.06 — адпаведна словам на прэс-канфэрэнцыі, атрыманыя за яго 93% прыйшлося сфальшаваць да 86%.

4. 23.11.06 — адпаведна словам на прэс-канфэрэнцыі, мы (ён і ЦВК) ня ведалі, што рабіць з тымі бюлетэнямі.

**...рэалізавалася ідэя Кучынскага вазіць моладзь у калёніі, дзе ўтрымліваюцца алькаголікі й наркаманы, каб адбіць у маладых людзей ахвоту спажываць алькаголь і наркотыкі.**

— Не разумею, нашто нас рэгулярна цягаюць па калёніях. Тыя самыя пысы я бачу штодня каля нашага гастраному.





**...Буш адрэагаваў на заклік Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь не падпісваць Акту пра дэмакратыю ў Беларусі, тым самым прадэманстраваўшы, што ў адміністрацыі ЗША «узяў верх здаровы падыход».**

— Хворы дасюль лічыць сябе Напалеонам. Здаецца, адзіны шанец, каб у яго ўзяў верх здаровы падыход, папрасіць Папова. Трэба, каб МЗС зьвярнуўся да хворага са спэцыяльнай заявай.




## ГІСТОРЫЯ Ў «НН»

**Беларусь безь Беларусі.** Новая дзяржаўная ідэалёгія. Тэлепраекты БТ і АНТ аналізуе Алесь Кудрыцкі. **Старонка 8.**

**Сталін проста павысіў квоту. «Калі па ўсёй Беларусі найперш згадваюць вайну, то на Мазыршчыне — голад».** Гутарка з Ірынай Раманавай. **Старонка 28.**

**Сьвет Караткевіча.** Рэцэнзія Сяргея Харэўскага. **Старонка 30.**

**Дзьмітры Касмовіч. За вольную і сувэрэнную Беларусь. Старонка 31.**

**Аўгустоўскі павет. Пошта Сапоцкін, Тэалін.** Андрэй Вашкевіч пра невядомыя старонкі гісторыі «Нашай Нівы». **Старонка 32.**

Палеміка: **Невядомая місія «Горбіка». Уніяты спрыялі антынацыскаму супрацiву. Старонка 32.**

**Апошнія 9000 уніятаў. Паміж Ласоснай і Чорнай Ганчай. Старонка 36.**

**Вянец змагаркі, вянок пакутніцы. Старонка38.**

## Гісторыі іншых сабак

Адзін Сабака разносіў па дамох незалежную прэсу. Граждан хадзіў за ім сьледам з рупарам і гукаў у паштовыя скрынкі: «Не завіце мяне на ўсякія прэзянтацыі, я ўжо іскупіў сваю віну перад радзімай!»

* * *

Адзін Сабака наладзіў турнір па турэцкіх шашках. А Граждан навучыў зязюлю з гадзіньніка, што вісеў у турнірнай залі, вымаўляць патурэцку: «Каравул устал! Усе пайшлі на фронт!»

**W+R**

Адзін Сабака карміў на плошчы галубоў. Калі Граждан прыйшоў на плошчу інаўгуравацца, галубы спужаліся і нагадзілі яму на галаву.

**МШ**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

«Свабода сумленьня». У лютым месяцы гэтага року да каталіцкага пробашча ў мястэчку Лужках прыйшлі Віктар Касьнікоўскі, праваслаўны, зь дзеўкаю Стэфкай Палынскаю, просячы, каб ім даць у касьцелі шлюб, бо яны маюць права карыстаць з маніфэсту 17 акцябра, у каторым аб'яўлена народу поўная свабода сумленьня. Па гэтай прычыне пробашч, прачытаўшы запаведзі, павянчаў іх. Поп даведаўся аб гэтым, і праз благачыннага пацягнуў пробашча на суд акружны за тое, што ня меў права вянчаць праваслаўнага. Чулі мы, што суд будзе ў Дзісьне 4 грудня; а пакуль што пробашча паліцыя ўзяла пад «асобы надзор». Дык вот якая «свабода сумленьня»!

**«НН». 1906. № 4.**

# А ты падпішыся!




**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

Дэталі — **старонка 46.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БАТЛЕЙКА

**Батлейныя шпэктаклі** з музычным укшталтаваньнем у протарэнэсансу. Т.:017-247-13-40 (skirwill@yahoo.com). Пан Скіргайла

### ВІТАНЬНІ

**Тусічак,** золатка, з Днём народзінаў цябе! Ты — наша шчасьце, наш цуд, наша сьвята! Муж і Мусік

**Віншуем Вольгу Караткевіч і Алега Дзярновіча** з узяцьцем шлюбу. Жывіце доўга і ў шчасьці!

### ЗНАЁМСТВЫ

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Т.: 706-70-84, 017-259-97-80

### КАНТАКТЫ

**Артур Фінькевіч!** Вер, маліся й змагайся: сьцяг Хрыста — гэта сьцяг перамогі! Мацьвея 16:24! Брат,

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў сяброўскае падарожжа 17 сьнежня (нядзеля): Менск—Крывічы—Будслаў—Княгінін—Касьцяневічы—Куранец—Вязынь—Краснае—Менск. 23 — 24 сьнежня: Вільня—Коўна—Рушышкі. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 110-19-28, 509-12-16, 573-88-17

### ІМПРЭЗА

**У суботу, 16 сьнежня,** а 11:00 на Кальварыйскіх могілках адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё надмагільнага помніку Вацлаву Іваноўскаму. Збор ля касьцёлу.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам A2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2621. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.12.2006.

Замова № 6948.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.